БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА, ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. У ВІЛЬНІ, АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. ЯК ШТОМЕСЯЧНІК. З 1 САКАВІКА 1996 Г. ВЫХОДЗІЦЬ У МЕНСКУ. ВЫДАВЕЦ БГФ «НАША НІВА»

ПАГОНЯ

Музыка М.Шчаглова-Куліковіча
Словы М.Багдановіча

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах,
Успомню Вострую браму сьвятую
І ваякаў на грозных канях.

У белай пене праносяцца коні,
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць,
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць.

У бязьмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі гады.
Вы за кім у Пагоню сьпяшыце,
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясьліся
За тваімі дзяцьмі ўздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон.

Біце ў сэрцы іх, біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць.
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць.

Маці родная, маці краіна,
Не ўсьцішыцца гэтакі боль.
Ты прабач, ты прыйміся свайго сына,
За цябе яму ўмерці дазволь.

Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай зброяй далёка грымяць.
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць.



БЕЛАРУСКІ ПАТРЫЯТЫЧНЫ СЬПЕЎНІК

«Наша Ніва» супольна з камэрным мужчынскім хорам «Унія» працягвае новы праект — стварэньне сучаснага Беларускага патрыятычнага сьпеўніка. Апрацаваныя намі тэксты і ноты песень будуць друкавацца на старонках газэты, а вынікам праекту стане кніга «Беларускі патрыятычны сьпеўнік» і аднайменная аўдыёкасэта або CD у выкананьні хору «Унія». Выкананьне гэтага праекту мы прымяркоўваем да 80-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі (25 сакавіка 1998 г.).

Распачалі сьпеўнік мы зь беларускага нацыянальнага гімну «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Пасьля друкаваліся «Бітва пад Воршай», «У гушчарах» і маршоўка «Сьцяг». Сёньня — славуты гімн «Пагоня».

№ 32 (93) 3 ЛІСТАПАДА 1997 Г.

Голас камбедаўскае гардыні
Эсэ на старонцы 3.

Змаганьне за генэрала Вітушку
Артыкул Сяргея Ярша на старонцы 11.

Карчма
Аднаўленьне рубрыкі «Гісторыя штодзённасьці» на старонцы 6.

Аўстрыйскі славіст — пра лёс беларускай мовы
Гутарка з Германам Бідарам на старонцы 5.

Марыя і правакатар
Божая Маці і вобраз Леніна — на старонцы 12.

Пара жаўрукоў
Навэла Луіджы Пірандэла на старонцы 15.

Пагарэў сусед

Ну, не забудзь прывезьці з-за мяжы жвачкі, — жартам праводзіў мяне прыяцель у горад Бельск-Падляскі на фэстываль «Бардаўская восень». Куды я ехаў толькі з адною мэтаю — адаспацца. Нідзе так добра ня сьпіцца, як у польскай правінцыі. Цёплы гатэль зь мінімумам раскошы й убостваа: шырокі ложак, вялікія падушкі, хрумсткая бялізна і поўная цішыня за вокнамі — вось пра што я марыў. Ад дурнога начнога пераезду савецкае мяжы, нават ад самой яе наяўнасьці тут, пад бокам, сон становіцца толькі саладзейшым. Недзе за ёю ёсьць Беларусь, штодзённая трывога, дурныя весткі й нерэальныя надзеі. А тут трэба спаць. Тым больш, за вокнамі пайшоў першы беларускі сьнег гэтага году.

Я праспаў гадзінаў, пэўна, з дванаццаць. Абудзіўшыся ад песьні ў суседнім нумары. Сьпявалі «Пагарэў сусед, пагарэў». Я выйшаў у даўно знаёмы мне горад, у якім, здаецца, нічога не зьмянілася за тры восені й ня зьменіцца за трыццаць. Усё там жа, за лесам, будзе праходзіць галоўная мяжа кантынэнту, а значыць у некалі беларускім горадзе будзе панаваць усё той жа сонны спакой, які не парушыць ніякі чарговы фэст беларускай песьні, усё больш экзатычнай у краі нашых культурных прэтэнзіяў.

Зьнешне на фэсьце сёлета таксама амаль нічога не зьмянілася (для мяне дык — пэўна). Гасьцямі, як заўжды, былі Алесь Камоцкі, Кася Камоцкая і «Новае неба». Канкурсантамі — Вольга Акуліч, Валеры Жамойцін, сымпатычнае дзявочае трыо «Фіеста», парачка мясцовых ды я. Вынікі такія: Акуліч далі першую прэмію памерам у 600 злотых, хтосьці паедзе ў Беласток на запіс альбому, а хтосьці атрымаў грамату. Жвачкі хапіла на ўсіх, акрамя мяне. Але зьмена была. Галоўным героем сёлетняга фэсту стаў чалавек, якога з намі не было й каго тут так доўга чакалі. Ягоныя песьні сьпяваліся са сцэны, за банкетным сталом і ў гатэльных нумарах. Ягоная «Пагарэў сусед, пагарэў» стала амаль што гімнам сёлетняга фэстывалю. Чалавек адсутнічаў, а ягоныя словы й акорды нібы замяшчалі адсутнага. Што можа быць для барда большаю ўзнагародаю? Усё гэта настолькі кантраставала з маўчаньнем радзімы, што я засаромеўся свайго няведаньня «Суседа» і немагчымасьці падпець. Але спаць мне ўжо не хацелася.

Менш за ўсё хочацца плявузгаць пра «глупства» Андрэя Мельнікава й Андрэя Мізулы, якія «самі сябе падставілі». Нават з тае інфармацыі, якая дайшла, можна зразумець, што гэтай справаю сьледзтва амаль не займаецца, альбо займаецца занадта тонка. Хутка пройдзе тры месяцы, як барды сядзяць у гарадзенскіх казэматах. За ўвесь гэты час у Мельнікава было толькі два допыты. Можна ўявіць стан сядзельца-пачаткоўца, якога дома чакае жонка й паўтарагадовы сын. Я не зьдзіўлюся, калі фінал гэтага падарожжа будзе самы сумны. Занадта, відаць, цяжкае для нашае судовае ўлады злачынства па сёньняшніх часах. І ўсе акаляючыя абставіны супраць: і на мове БНФ размаўлялі, і на Захад ішлі, і, што самае незразумелае, на савецкую радзіму вярталіся.

Між тым, факт застаецца фактам: два найшчырэйшыя беларусы й таленавітыя барды йшлі сваім лесам у сваю Вільню й сваім жа лесам вярталіся. Ніякага тавару ня мелі, акрамя адвечнага беларускага жаданьня — дыхнуць вольнага віленскага паветра. І за гэта хутка ўжо чацьверты месяц дыхаюць зусім іншым паветрам. Пры поўным маўчаньні бэтонных сьценаў і газэтных палосаў. Быццам не даходзіць, што гэты працэс мае дачыненьне да усіх, для каго Беларусь не абмяжоўваецца контурам на яе незаконным гербе. І што хто б заўтра ні пагарэў, судзіць будуць па іншых артыкулах. Якіх няма ў кодэксах.

Таму я з радасьцю вяртаюся па наш бок савецкае мяжы. Нават жанчына-памежніца ў форме ўзору 1946 году падаецца мне вельмі дарэчнаю. Спаць тут ня прыйдзецца, пакуль нам ёсьць што сьпяваць. Пакуль, вядома, ёсьць тыя, хто чуе.

Зьмицер Бартосік

Славамір Адамовіч

КАЛІ ТЫ ВЕРНЕСЬСЯ ГЕРОЕМ...

беларускім юнакам-патрыётам, якія знаходзяцца за кратамі рэжыму

Калі ты вернесься Героем
і на багатую Куцьцю
вакол цябе зьбярэцца роем
натоўп у строях ад куцюр,

і крышталёвы ў тонкіх пальцах
падыме келіх дама пік,
ты ўспомніш пра самотных мальцаў,
турэмны шмон, правёж і крык,

успомніш карцэр, краты, рэшку,
этап, канвой, сыры прадол,
і келіх выпіты, як пешку,
паставіш на раскошны стол.

А на дварэ старое дрэва
страсе каляны чорны ліст
пад сьцены зьнішчанага Крэва,
пад ветру дыхавічны сьвіст.

Калі ты вернесься Героем
у белы сьнег, пад Новы Год,
уборы вольнага пакрою
табе зладуе наш народ.

1 лістапада 1997 году

Лабковічу дазволілі чытаць

Два месяцы знаходзіцца ў засьценках рэжыму непаўналетні Вадзім Лабковіч і крыху старэйшы за яго, васямнаццацігадовы Алесь Шыдлоўскі. Днямі Вадзіму нарэшце далі магчымасьць сустрэцца з матуляю. Аднак наглядчыкі папярэдзілі спадарыню Ядзьвігу, каб яна не паведамляла сыну нічога, што датычыць сьледзтва. Вадзім вельмі абурыўся, калі даведаўся, што пры вобшуку забралі ягоныя сьцягі.

Акрамя спатканьня, Вадзіму Лабковічу дазволілі мець пры сабе падручнікі. Аб'ектыўнай інфармацыі зь незалежнай прэсы ён па-ранейшаму пазбаўлены. Другога лістапада ягоныя аднакляснікі разышліся на канікулы. Заканчваецца першая чвэрць школьнага году.

Тэрор на транспарце

28 кастрычніка ў 11 гадзінаў 40 хвілінаў дня быў зроблены напад на тралейбус №27, які ішоў па маршруце «Вакзал —мікрараён «Кунцаўшчына». Здарэньне адбылося на адным з прыпынкаў на вуліцы Казінца, насупраць мясакамбінату. Асобы мужчынскага і жаночага полу з жэтонамі кантралёраў літаральна ўварваліся ў салён, захапілі некалькіх пасажыраў і зьмясьцілі іх у міліцэйскі аўтобус, які стаяў перад тралейбусам. Ахвярамі сталі пераважна жанчыны. Дасьведчаныя грамадзяне кажуць, што такія кантралёрскія напады на пасажыраў у сталіцы Беларусі практыкуюцца ня першы дзень. Праўда, цікавае вось што: маршрут 27-га тралейбуса пралягае праз раён, дзе знаходзяцца інтэрнаты вытворчага аб'яднаньня «Інтэграл». А як вядома, 27 кастрычніка на адным з прадпрыемстваў гэтага аб'яднаньня (завод «Электроніка», дзе таксама працуюць пераважна жанчыны) рабочыя аб'явілі забастоўку.

У правінцыі ідзе вайна. Хлебная

Безь перабольшаньня грамадзянскае супрацьстаяньне разгарнулася паміж старшынём Будслаўскага сельсавету і жыхарамі мястэчка Будслаў і навакольных вёсак. А каменем сутыкненьня стаў... хлеб. Рэч у тым, што вяскоўцы не жадаюць купляць дрэнны хлебапрадукт, які вырабляюць у Мядзеле і развозяць па крамах раёну, а набываюць нармальны ядкі хлеб у аўталаўцы, якая прыходзіць з Докшыцаў. Хлебная інтэрвэнцыя з суседняга раёну Віцебскай вобласьці выгадная людзям, але падрывае і без таго слабую эканамічную базу Мядзельшчыны.

У гэтай сытуацыі, якая, зрэшты, і адпавядае мэтам «рынкавага сацыялізму», старшыня сельсавету, нехта Мельнікаў, а таксама раённыя «вэртыкальшчыкі» ня могуць прыдумаць нічога лепшага, як угаворваць людзей не купляць добры, але «чужы» хлеб, таму што, бачыце, выручаныя грошы ідуць у бюджэт іншага раёну. З мэтаю правядзеньня сярод насельніцтва «растлумачальнай» работы ў Будслаў прыяжджалі «таварышы зь Мядзела». Аднак вяскоўцы далі «таварышам» аргумэнтаваны адлуп. Адна жанчына для параўнаньня прадэманстравала прысутнаму начальству два боханы хлеба: докшыцкі і мядзельскі. І аказалася, што докшыцкі бохан акрамя таго, што каштуе таньней і выразна лепшай якасьці, дык яшчэ й важыць на траціну больш. Пра гэты выпадак напісала нават «народная» газэта «Народная воля». Тым ня менш, вадзіцель докшыцкай аўталаўкі застаецца ворагам №1 як для мядзельскіх партачоў хлеба, так і для старшыні Мельнікава. Гандаль на «чужой» тэрыторыі працягваецца. Начальству, каб вырашыць праблему, застаецца хіба што даць «заказ» кілеру. Альбо сьлёзна маліць «вэртыкаль», каб арганізавала новы ўказ. Напрыклад, такі: «О недопущении употребления доброкачественных хлебов, ибо оное споспешествует умственному развитию электората, чему и должны быть поставлены всяческие преграды».

Раман Гарт

Ад карэйцаў да апачаў

Чарговая канфэрэнцыя, арганізаваная Міжнароднай Акадэміяй вывучэньня нацыянальных меншасьцяў (АНМ), адбылася 7 кастрычніка ў Менску і была прысьвечаная праблеме вызначэньня паняцьця і канкрэтным прыкладам дэпартацыі. Ініцыятарам у канцы 1996 г. выступіла Асацыяцыя беларускіх карэйцаў, якая рыхтавалася ўшанаваць памяць дэпартаваных 60 гадоў таму выхадцаў з Карэі, што жылі на Далёкім Усходзе СССР.

Найбольшую мэтадалягічную вагу мсў уступны даклад прэзыдэнта АНМ праф. С.Яцкевіча, які стварыў уражаньне прэцэдэнту: прысутныя не змаглі прыгадаць іншых грунтоўных разглядаў праблемы за апошні час у навуковых асяродках як блізкага, так і далёкага замежжа.

У праграму выступленьняў былі ўключаныя прадстаўнікі Палестыны, Польшчы, Якуціі, Казахстану, Украіны, Рассі і шасьці гарадоў Беларусі (Берасьце, Гомель, Горадня, Магілёў, Мазыр і Менск). Прыкладна палова дакладаў асьвятляла гісторыю дэпартацыі насельніцтва зь Беларусі, другая частка тычылася пэўных народаў: палякаў, немцаў, татараў, украінцаў, карэйцаў, палестынцаў, індзейцаў апачаў, якія станавіліся ахвярамі дэпартацыі.

Матэрыялы гэтай важнай міжнароднай навуковай канфэрэнцыі прадстаўленыя ў выданьнях: «Дэпартацыя як сацыяльная праблема: Тэматычны зборнік навуковых працаў» (Берасьце, 1997) і «Весьці АНМ. Штоквартальны інфармацыйна-навуковы часопіс «Нацыянальныя меншасьці на Беларусі і ў сьвеце» (1997, №3, с.24-44).

Алесь Сімакоў,
выканаўчы сакратар Беларуска-індзейскага таварыства

«БАЦЬКОЎСКІ» КОМПЛЕКС БЕЛАРУСКАГА КІНО

Алена Лукашэвіч

Знаёмы кінакрытык, які сустрэў мяне на прэсавай канфэрэнцыі з нагоды адкрыцьця ў Берасьці першага нацыянальнага фэстывалю беларускага кіно, падзяліўся сваёй перасьцярогай. Існуе верагоднасьць, сказаў ён, што пераможцамі нашага фэстывалю стануць амэрыканцы, у лепшым выпадку — расейцы. Пытаньне — чым расейцы лепшыя за амэрыканцаў, засталося без адказу. Безумоўна, зьяўленьне ў конкурснай праграме нацыянальнага, а не міжнароднага фэстывалю фільмаў замежных рэжысэраў — нонсэнс. Але ж баяцца канкурэнцыі з боку амэрыканца Мэнахэма Голяна ня варта было ня толькі з-за нізкага мастацкага ўзроўню ягоных фільмаў (чаго нельга сказаць пра фільм расейскага рэжысэра Дзьмітрыя Астрахана «Зь пекла ў пекла»). Думаецца, зьяўленьне ягонага імя ў конкурснай праграме НФБК — усяго толькі лёгкі рэвэранс на адрас сталага замежнага заказчыка кінастудыі «Беларусьфільм». Хутчэй за ўсё, з гэтае ж прычыны ў праграму трапіў і фільм Астрахана, здымкі якога фінансаваў ранейшы партнэр Голяна нямецкі прадзюсэр Артур Браўн. Але растлумачыць, як трапілі ў праграму некаторыя фільмы беларускіх рэжысэраў, здольных сваім нізкім узроўнем дыскрэдытаваць ідэю якога заўгодна фэстывалю, зразумець цяжка. Галоўны аргумэнт майго суразмоўцы — беларускія фільмы атрымліваюць прызы на міжнародных фэстывалях — выклікаў сумнеў. Падобна, да гэткай катэгорыі належыць фэстываль «Залаты Віцязь», на якім некаторыя беларускія кінематаграфісты выконваюць ролю «славянских братьев», і толькі ў другую чаргу — прафэсіяналаў.

Падазраваць у нейкай заангажаванасьці чальцоў адборачнай камісіі беларускага кінафэстывалю ня хочацца. Але слабых фільмаў у праграме было зашмат і таму склалася ўражаньне, быццам арганізатары наогул забыліся на існаваньне прафэсійных крытэрыяў. Прынамсі, быў забыты найгалоўны зь іх — фэстываль павінен адлюстроўваць працэсы, якія адбываюцца, у дадзеным выпадку, у беларускім кіно. Відаць, чальцы адборачнай камсіі кіраваліся адным: паказаць гледачу кінафільмаў як мага болей. І стварэньне, так бы мовіць, глядацкага асяродку, было пакладзенае ў падмурак фэстывалю. Якія там творчыя працэсы. Пра іх, вераемна, ня ўспомнілі нават сябры журы. Толькі адзін зь іх — аніматар у кіно і максымаліст у жыцьці Ігар Воўчак адмовіўся падпісваць пратакол, бо рашэньне журы палічыў некампэтэнтным. Сацыяльна-патрыятычны патас (саюз дзьвюх славянскіх дзяржаваў) і «чалавечы фактар « (нікога не пакрыўдзіць) — вось, напэўна, тыя крытэрыі, паводле якіх вызначаліся пераможцы ў так званым мастацкім жанры. Верагодна, таму лепшым ігравым фільмам прызначылі расейска-беларускі кінапраект — рэжысэрскі дэбют Мікалая Яроменкі-малодшага «Сын за бацьку». Фільм-дыягназ нашага часу, у якім, насуперак жорсткім рэаліям пераходнага, постсавецкага пэрыяду, перамагае мужчынская дружба бацькі-вэтэрана й сына-рыначніка, не прынес ягоным стваральнікам сусьветнай славы. Хіба што Ўладзімер Гасьцюхін, які з бляскам выканаў эпізадычную ролю ў гэтым фільме, мог прэтэндаваць на прэстыжны ў сусьветным кінематографе прыз за лепшую ролю другога пляну. Тым ня менш, патасная павучальнасьць выканаўцы галоўнай ролі Яроменкі-старэйшага і рэжысэрская бездапаможнасьць малодшага не перашкодзілі журы прысудзіць «Сыну за бацьку» прыз у намінацыі «лепшы ігравы фільм».

Пошта

Літоўская правінцыя

Доўга думаў, ці варта сёньня падымаць гэтае пытаньне. Цяпер, калі беларушчына і нацыянальная ідэя знаходзяцца ў глыбока эшалянаванай абароне, стрымліваючы націск ваяўнічага русіцызму. Але падумалася, што прыйдзе час, а ён напэўна прыйдзе, калі пачнецца контранаступ, і тады на вызваленых тэрыторыях трэба будзе пачынаць адбудову, закладаць новыя будынкі і вуліцы нашай нацыянальнай ідэі, таму праекты трэба рабіць ужо цяпер, каб зноў не паўтарыць старыя памылкі канца 80-х гадоў.

Адной з такіх, можа, не памылак, а нечаканасьцяў, зьявілася ідэя Беларусі-Літвы, якую з пачаткам незалежнасьці пачалі прапагандаваць гісторыкі і часткова ўлады. Герб «Пагоня» павінен быў быць, з аднаго боку, растлумачаны народу як беларускі сымбаль, які быў калісьці сымбалем ВКЛ. Як кажуць: «Вось сымбаль твой, забыты краю родны». Адначасова ў падручніках гісторыі зьявілася тэза: Беларусь сёньня —гэта Літва ўчора, а Літва сёньня — гэта Жмудзь учора. Значыць, усё, што літоўскае ў падручніку гісторыі, гэта наша, а ўсё літоўскае, скажам, у газэце «Звязда», ня нашае. Даволі складаная тэза, зразумець якую маглі толькі гісторыкі і аматары гісторыі, але ня простыя людзі. Бо вядома, што гісторыя будуецца і ўспрымаецца на ўзроўні асобных мітаў. Прычым гэтыя міты павінны быць зьвязаныя зь сёньняшняй рэчаіснасьцю. Напрыклад, тыя ж Жмудзіны, узяўшы гістарычны тапонім «Літва», як кажуць, раскруцілі яго. І іх нават не хвалюе, што сёньняшняй літоўскасьцю ў тагачаснай Літве нават і ня пахла. Што мова дзяржавы была старабеларуская, а вялікі князь Вітаўт іхных суплямень нікаў спачатку прадаў крыжакам, а пасьля і ўвогуле вырубаў у пень падчас службы ў тых жа крыжакоў. Іх хвалявала іншае — як зьвязаць тапонім «Літва» з гісторыяй гістарычнай Літвы, а зрабіць гэта было ня цяжка, бо ў іх быў мост зь мінулага ў сучаснасьць, у іх была адна Літва.

Як быць нам, беларусам? Як нам перакінуць мост зь мінулага ў сучаснасьць? Адмовіцца ад тэрміну «Беларусь» і замяніць яго «Літвою», як прапануюць некаторыя радыкалы? Гэта фантастыка. А можа, не кранаючы «Беларусі», увесьці гістарычную тапаніміку «Літва». Як кажуць, забіць двух зайцоў. Дзяржава Беларусь, якая падзеленая адміністрацыйна на вобласьці ці правінцыі, адна зь якіх мае назоў Літоўская. Цэнтар гэтай вобласьці павінен быць у Баранавічах альбо Навагрудку — цэнтры гістарычнай Літвы. Граніца вобласьці павінна праходзіць па дзяржаўнай мяжы Беларусі і Літвы. Мы павінны вярнуць сабе тапонім «Літва», не кранаючы «Беларусі», накшталт Македоніі ў Грэцыі. І ня трэба баяцца канфліктаў зь Летувою, яны й так шмат забралі з нашай гісторыі, мы вяртаем сваё. І тады ня трэба будзе тлумачыць дзецям, чаму літоўскі князь збудаваў замкі ў Навагрудку і Лідзе, а Пагоня — гэта сымбаль Вялікай Літвы.

Аляксандар Моргун,
Баранавічы

Голас камбедаўскае гардыні

У афіцыёзных менскіх газэтах, дзе цэлыя разваротыы забітыя рынкавай рэклямай мэталапракату, кампрэсараў і аўтапагрузчыкаў, побач, на рэдакцыйных старонках, кідаецца ў вочы заўзятае ганьбаваньне капіталізму. Вядома, ілюзія спажывецкага рынку шчодра аплочваецца рэклямадаўцамі, якія ня могуць не даваць у прэзыдэнцкую газэту. У сваю чаргу, публіка атрымлівае менавіта тое, што яна хоча чытаць. Вайна з ілюзіяй рынку аплочаная падпісчыкамі. Загалоўкі артыкулаў накшталт «Заложники мафиозного капитализма» ствараюць ілюзію адзінства газэты і пакрыўджанага гэтым самым капіталізмам чытача.

Між тым, у Беларусі няма ані каліва ніякага капіталізму. Тут панує мадэль лібэральнага антыкапіталізму, г.зн. стрымана ўвасабляюцца ў жыццё камбедаўскія ўяўленьні і стэрэатыпы. Затое ў афіцыёзным друку, у дзяржаўнай ідэалёгіі гэтая стрыманасьць зьнікае і пакрыўджаная камбедаўская душа разгортваецца на ўсю шырыню.

Нагадаю, што камбеды — гэта камітэты беднаты, якія пасьля рэвалюцыі 17-га году ўвасаблялі трыюмф поўнай і безумоўнай фізычнай перамогі пралетарыяту над усімі астатнімі.

***

Капіталізм — гэта павага да капіталу, зароблена цяжкай працай і талентам. Камбедаўшчына — гэта высьмейваньне капіталу, а разам і ўскоснае гыгыканьне з таго, хто гарбаціцца, укалвае, працуе. Вось пасаж са старонак прэзыдэнцкай газэты:

«Хоць і спрытныя хлопцы — перагоншчыкі замежных аўтамабіляў, але і яны нярэдка трапляюць у пастку. Калі ўдалося адкупіцца ці ўцячы ад рэкеціраў на дарогах Польшчы, то тут, на мытні, можна адным махам пазбавіцца нажытага».

У падобных цытатах мяне найперш цікавіць інтанацыя. Аўтар іранізуе зь перагоншчыкаў і праз гэта салідарызуецца хутчэй з польскімі рэкецірамі або з мытнікамі, якія гатовыя нахрапам адабраць нажытае майно. Што да перагоншчыкаў, якія трапілі ў бяду, то зь пяра журналіста ледзь не зрываецца лягічнае: так ім і трэба!

Я ані разу не сустракаў у газэтах хоць бы самага малога спачуваньня гэтым самым перагоншчыкам, якія бясконца рызыкуюць, начамі прастойваюць на мытнях і даходы якіх не назавеш звышдаходамі. Так мазольна нажываецца капітал, у прынцыпе, капітал Беларусі, бо грошы мусяць укладацца дома. Зь іншага боку большым, разнастайным і якасьнейшым робіцца аўтамабільны парк краіны. Але пра гэта камбедаўцы ня думаюць. Яны чытаюць пра польскі рэкет і прыгаворваюць: ага, а чаго лезьлі, сядзелі б, як я, дома і чакалі палёгкі ад прэзыдэнта.

Літаральна такім духам прасякнутыя радкі з адкрытага ліста Лукашэнку, які прэзыдэнцкая газэта зьмясьціла на першай старонцы пад назвай «Пусть все знают, кто по-настоящему помогает людям!» Зьвярніце ўвагу на пасыл: «Пусть все знают», так ім і трэба. Але вось сам ліст. Дэпутат жодзінскага гарсавету піша:

«Паважаны Аляксандар Рыгоравіч!

Зьвяртаецца да Вас старшыня ЖБК-19 горада Жодзіна. Дзякуючы Вашаму актыўнаму ўдзелу ў Жодзіне пабудаваны шматкватэрны дом, які быў запляНаваны яшчэ пры Шушкевічы, але тады далей словаў справа ня зрушылася. Куды толькі мы не зьвярталіся, ніхто нам не дапамог. Я добра памятаю нашу сустрэчу з Вамі, Аляксандар Рыгоравіч, калі Вы прыяжджалі да нас у Жодзіна як кандыдат у прэзыдэнты. І ў асабістай гутарцы адзін на адзін, і пры звароце да Вас у зале ДК БелАЗу мы, члены ЖБК, адразу зразумелі, што Вы абяцаньні на вецер ня кідаеце».

У чым менавіта выразілася дапамога прэзыдэнта жыльлёва-будаўнічаму каапэратыву з Жодзіна — не гаворыцца. Можа быць, ЖБК быў вызвалены ад падаткаў? Ці можа атрымаў ільготны крэдыт? Не, пра такія рэчы размовы няма. Бо тады б не было часу пісаць чыста палітычныя падзякі, трэба было б зарабляць, каб разьлічыцца з крэдыторам. Але ў сфэры камандавай эканомікі прэзыдэнцкая дапамога паступае праз тэлефон. Аказваецца ім, жэбэкоўцам, супрацьдзеіў нейкі кіраўнік горада. Вось што піша старшыня ЖБК. Зьвярніце ўвагу на антытэзу:

«Нягледзячы на актыўнае процідзеяньне з боку тагачаснага кіраўніка горада, я цьвёрда сказаў Вам, што Вы будзеце прэзыдэнтам».

Сам эканамічны мэханізм, як і за савецкім часам, схаваны за шырмай намэнклятурных гульняў. Камбедаўцы грэбліва пазьбягаюць згадваньня грошай і фінансава-крэдытных дачыненьняў. Новыя дамы паўстаюць або не паўстаюць з тэлефоннага званка прэзыдэнта, ва ўсім прысутнічае дух чараўніцтва, казка ператвараецца або не ператвараецца ў рэчаіснасьць.

Народ не адчувае патрэбы ў рэформах, у шырэйшых магчымасьцях гаспадараваньня, у скідках і крэдытах, у неўмяшальніцтве дзяржавы. Наадварот, у краіне мусіць быць начальства зь неабмежаванымі, фантастычнымі магчымасьцямі. Народ прыйдзе, заб'е чалом, а добры джын-прэзыдэнт здыме слухаўку і скажа ў тэлефон: крыбле-крабле-бумс. Грошы — рублі, маркі, даляры — сапраўды выглядаюць як абраза для такіх дачыненьняў.

Гэта пацьвярджае і аўтар сучаснага беларускага ладу — камбедаўшчыны. На нядаўняй віленскай прэсканфэрэнцыі назаўтра пасьля ліквідацыі Беларускага Фонду Сораса Лукашэнку спыталі: «Як Вы думаеце, ці зможа фонд Сораса калі-небудзь працягнуць дзейнасьць у Вашай краіне?» Адказ быў такі:

«Знаеце, мы яго не закрывалі. Пусьць заплаціт у казну 3 млн. долараў, каторыя должан, і работает. Часта паўтараюць, што фонд аказаў гуманітарную помашч Беларусіі на 30 млн. долараў. Магу севоднія афіцыальна заявіць: не нужны нам большэ міліоны долараў, не нужны, спасіба за благатварыцельнасьць».

Так гучыць голас чыстае камбедаўскае гардыні. «Нам не нужны вашы грошы». Згадваецца іншае Лукашэнкава выказваньне: «беларускі народ будзет жыць плоха, но не долга».

Джордж Сорас даваў грошы на мэдыцыну, экалёгію і культуру, якія ня можа забясьпечыць дзяржава. За гэта дзяржава яшчэ й абклала Сораса падаткамі. Сорас зачыніўся, разам зь ім скончыліся і многія культурныя ініцыятывы. Прычым скончыцца ім зноў жа дапамагае дзяржава. Менавіта за Лукашэнкам непамерныя падаткі леглі на плечы ўсіх нацыянальных культурных выданьняў і інстытуцыяў, паводле прыроды сваёй датацыйных і несамаакупных.

Як гэта яшчэ можна назваць, як не самаедзтвам у дзяржаўным маштабе? Але камбедаўшчына ніколі не сябравала з культурай. Яе, культуру, так скаЗаць, на хлеб не намажаш. І тут я прывяду яшчэ адну цытату са згаданае прэсканфэрэнцыі менскага прэзыдэнта. Пытаньне: «Саюз пісьменьнікаў Беларусі паведаміў літоўскім калегам, што ў яго зьбіраюцца адняць дом літаратараў для патрэбаў дзяржавы. Ці так гэта?» Адказ:

«Мы нікагда нічыво ні у каво не аднімалі. В том чысьле і у беларускіх пісацелей. Хацелась бы знаць, аткуда вы палучылі такую інфармацыю. Відзіма кто-та заінцерэсован в ее распространеніі».

***

Між іншым, камбедаўшчына мае ня толькі сацыяльнае і палітычнае, але і псыхалягічнае вытлумачэньне. Гэта стан апрыёрнай пакрыўджанасьці, дарэчы, шырока распаўсюджаны сярод беларусаў. Вас яшчэ ніхто не пакрыўдзіў, але штосьці такое ўжо ўявілася, нейкі намёк і вы прымаеце ня тое што неадэкватныя, але максымальныя меры ў адказ. Такое часта бывае ў дзяцей. Хлопчыку робяць вельмі тактоўную заўвагу, а ён рэзка адварочваецца, надзімае губы і кажа: вось памру, будзеце тады плакаць.

Згаданы вышэй прэзыдэнт электарату міжволі агучвае і праводзіць у жыццё тое, што глыбока схавана ў народнай душы — самаадмаўленьне, якое складаецца з адмаўленьня любой маёмасьці — ці то грошай, ці то роднай мовы. Прычым гэта датычыць ня толькі афіцыёзнае прэсы і прэзыдэнта. Апазыцыйныя палітыкі і газэты, якія дбаюць пра рэйтынг і тыражы, таксама прасякаюцца згаданым нацыянальным самаедзтвам. У загалоўках і інтанацыях незалежнай прэсы мы ня знойдзем ані пашаны перад тым, хто цяжкай працай зарабляе свой капітал, ані вымоўных прыкладаў — як гэты капітал можаш зарабіць ты, чытач. Затое і на гэтых старонках побач з ганьбаваньнем прэзыдэнта колькі заўгодна той самай усепаглынальнай пакрыўджанасьці, вельмі часта, паўтаруся, апрыёрнай і беспрычыннай. Пакрыўджанасьці, якая апярэджвае саму крыўду.

Увогуле беларус — чалавек вельмі тонкай душэўнай арганізацыі. Ён даўно і глыбока пакрыўджаны на капіталізм, або, скажам, на NATO. Сёньня ён разьвівае ў сабе глыбокую ўнутраную пакрыўджанасьць на расейцаў.

Камбедаўшчына — гэта ўвогуле расейская вынаходка. Як і сацыялістычны інтэрнацыяналізм. Але найлепш яны прыжыліся менавіта на нашай нацыянальнай глебе і менавіта з-за нашай унутранай схільнасьці да самазьяданьня і самапрыніжэньня. Бо і камбеды, і інтэрнацыянал — гэта ні што іншае, як сацыяльнае і нацыянальнае самаадмаўленьне.

Усё вышэйсказанае тлумачыць, чаму ў Беларусі так дрэнна засвойваюцца антыкамуністычныя, дэмакратычныя і рынкавыя ідэі і рэформы. Прычына, магчыма, ня ў цёмнасьці і забітасьці народа, а ў ягоных глыбінных псыхалягічных характарыстыках. Гэтыя дзіцячыя рысы сьведчаць пра нясталасьць таго, што Лукашэнка часта называе «менталіцетам».

У кантактах з вонкавым сьветам мы — і афіцыёз, і апазыцыя —часта адварочваемся сьпінаю і кажам да месца ці не да месца: вось памрэм, будзеце тады ведаць.

Што праўда, у псыхалёгіі такая пакрыўджанасьць ніколі не сканчаецца суіцыдам. Наадварот, у дзяцей яна выкліканая ні чым іншым, як эгацэнтрычнай любоўю да сябе і жаданьнем зьвярнуць на сябе ўвагу. Гэта ні што іншае як пашыраны ўзроставы інфантылізм. У нашым выпадку — нацыянальны. Рана ці позна ён перарастаецца і дзіця становіцца дарослым чалавекам.

Сяргей Плыловскі

Каралеўства Беларусь

Фэст новае беларускае культуры ў Падкове Лесьнэй «Каралеўства Беларусь», сьцірае сёньня многія стэрэатыпы пра Беларусь. Рэцэнзіі і рэпартажы з акцыі беларусаў зьявіліся ў розных польскіх СМІ. Выстава «Каралеўства Беларусь» цяпер працягваецца ў Варшаве, пасьля, верагодна, пераедзе ў Познань.

Асноваю фэсту стала мастацкая выстава. Асноваю выставы сталі творы мастакоў, чые імёны гучалі са старонак «НН». На ёй былі задэманстраваныя фотатворы Саўчанкі, Баразны, Раманюка і Алены Адамчык; жывапіс і інсталяцыі Пятрова-Хруцкага, Клінава, Дарашкевіча, Поклада, Бабарэкі, Вераб'ёва; графіка Басалыгі і Локіця. Але перад усім быў экспромт — пэрфоманс віленчука Валеры Самусёнка на матывы Шагала. Другая частка праграмы, якая распачалася ўжо ўначы, улучала ў сябе канцэрт хору «Унія», гурта «NRM», барда Бартосіка, дэклямацыі вершаў Глёбуса, Сапач, Анемпадыстава, Бабкова, матэрыялы да кінафільма «Кароткі слоўнік Беларусі 1996-97», і гэтак далей, далей, далей... Калі спусьцілася ўжо глыбокая ноч, на двары запалалі вогнішчы. Да раніцы кожны мог сабе абіраць відовішча на свой густ — выставу, канцэрт, скокі ля вогнішчаў, альбо бар...



Здымкі Алены Адамчык, Дзяніса Раманюка, Алега Дзярновіча.

... Зь неба, на якім дагарала апошняя зарніца і ўзыйшла першая зорка, зьявілася жаночая постаць у белым уборы нявесты на тле бялюткіх старых бярозаў. Нявеста кружляла над страхою, над белымі комінамі, спусьцілася з ганку на зямлю... Сьцішаныя людзі адзін за адным падыходзілі да постаці ў белым. Бліжэй, бліжэй і бліжэй. Але ніхто так і ня здолеў да яе дакрануцца.

Мы апынуліся ў прыцемненых пакоях, дзе няможна ў смузе пабачыць уласнае рукі, а на сьценах палалі вочы пачвараў, зьзялі нябачаныя краявіды. Гучэў глухі рытм. Лекар у белым халаце, у непамытых гумовых пальчатках, з чорнымі акулярамі, за якімі не відаць вачэй, упэўнена ладзіў свой незразумелы, а таму страшнаваты рыштунак. Пасьля звыклымі рухамі, да якіх ён прывык, як прывыкаем мы завязваць матузкі на абутку, альбо адкрываць навобмацак кран з вадою, ён пачаў рабіць тое, што абавязаны рабіць. Крэсьліць месца болю, расьсякаць яго. Пасьля пачаў заспакойваць, гаіць... Мы з табою ўратуемся? Уратуемся. Ён выратуе. Ён доктар? Так, ён мастак. Хруцкі-Пятроў.

А там што? Самотны расповед пра аднаго чалавека. Ён скульптар. Але тут няма ягоных скульптураў. Ён пачаў баяцца, што ніхто не заўважыць, што ён жыве. Ён пачаў баяцца, што забудзе сам, што ён жыў. Ён вырашыў штодня маляваць па чалавечку, каб не забываць. Даўжэзная йстужка з чалавечкаў тут не зьмясьцілася.

А гэты чалавек пра сябе й не хацеў гаварыць. Ён фатограф, але нічога не фатаграфаваў. Ён нахіліўся і ўбачыў сярод пазалеташняга лісьця чужы, незнаёмы твар. Ён пытаўся ва ўсіх, хто гэта... Ніхто не адказаў. Тады ён забраў гэты твар сабе. І гэты, і вунь той. Забраў іхныя гады, ўсьмешкі, рукі, гузікі і спадніцы, кветкі і зброю.

А гэта — графік. Але ягоных гравюраў тут няма. Ён сам тут ёсьць на здымках, на сваіх здымках. Ёсьць тыя, каго ён ведае, а табе можна й ня ведаць. Але ты цяпер будзеш ведаць ягоныя здымкі.

А гэта — доктарка, але яна нікога ня лечыць. Яна толькі сочыць, як гуляюцца дзеці. І фатаграфуе дзяцей.

Як ты пачуў, што згасла сьвятло?

На двары танчыць Арлекіна. Хто прыдумаў клоўна, які плача? Але гэты Арлекіна ня плача. Ён распавядае. Пра зямлю, якая з намі гуляецца. Яна нас накорміць, пацешыць, зацярушыць вочы, засыпле, суцешыць. І ўсё наноў. Пра чалавека, які гуляецца зь зямлёю. Ён яе лепіць, топча, рые, гладзіць, песьціць. Арлекіна больш няма. Ёсьць яна, зямля, і ён, чалавек...

У вялікай чорнай залі запаялі людзі ў чорных фраках. Яны пяюць пра нашу краіну. Іх сьпеў лунае над ціхай заляю, над ціхім мястэчкам, над ціхаю зямлёю. Яны моляць начныя нябёсы за Каралеўства. Яны свабодныя. Як ты. У чорную ціхую ноч...

Полымя паходняў накрэсьліла кола. Ён, спрытны як зьвер, з вострымі рогамі, увайшоў у кола агню. Ён прыручыў агонь, ён забіў дзікага зьвера, ён усклаў ахвяру. Вогнішча з трэскам узьляцела дагары, сыплючы чырвоныя зоркі ў неба.

Зорак становіцца болей і болей, цэлымі зіхоткімі карагодамі лятуць яны прэч ад зямлі. З рокатам і сьвістам. Уздоўж і ўпоперак яны рэжуць аксаміт нябёсаў.

А гэта — пяс мастак, але ён ня піша карціны, бо ён прагне сьпяваць. Сьпяваць разам зь сябрамі. Чуеш сьпеў? Яны сьпяваюць пра нас з табою: Пра нашу і нашых сяброў свабоду. Мы можам быць вольнымі ўжо сёньня, толькі трэба жыць незалежна ў сваёй краіне, у Каралеўстве Беларусь...

Сьвята нашага Каралеўства працягнулася і ў Познані. Але пад іншым годлам — «Рэзкае вяртаньне дэкадансу». Што такое дэкаданс сёньня? Гэта ўпэўненасьць у тым, што ўсё цячэ нармальна, а таму можна спакойна пад'есьці і паслухаць добры стары рок, які ўжо даўно не ў падпольлі. Беларусы ўмеюць гэта рабіць. Але тая культура, якую мы нясем у сьвет, далёкая ад самазаспакаеньня. Таму аголеныя нэрвы нашага стрыманага аптымізму прыцягваюць увагу эўрапейцаў. На гэтым тыдні выстава «Каралеўства Беларусь» у Варшаве. Пра гэта прасілі нашыя польскія сябры...

Варшава – Падкова Лесьна – Познань – Варшава

Сяргей Харэўскі

Ажылы дом

Аляксей Каўка сьпяшаўся на III Міжнародныя Купалаўскія чытаньні «Янка Купала — публіцыст», што меліся адбыцца 20 і 21 кастрычніка ў музэі паэта. Праходзячы праз Купалаўскі парк, навуковец быў зьбянтэжаны пытаньнем нейкай жанчыны, яўна не мясцовай:. «А кому этот памятник?». «Купалу», — адказаў маскоўскі госьць. На неўцямны погляд кабеты дадаў для пэўнасьці: «Некогда здесь жили белорусы, а это их писатель». «А что, разве они уже тут не живут?» — зацікавілася турыстка. «Теперь их почти нет. Здесь живет этно-лингвистическая сволочь со своим осчастливителем». «А-а-а!..» — працягнула цікаўная.

Я таксама апынуўся на той канфэрэнцыі. Другі раз у жыцьці наведаўшы музэй народнага паэта. Першы раз патрапіў сюды галоў дзесяць таму. Была ў мяне тады такая шкалярская звычка —наведваць у незнаёмых гарадах усе музэі. З тае пары, тут, здаецца, нічога не зьмянілася. Усё той жа паўзмрок і ўсё тая ж атмасфэра ўрачыстай-афіцыйнай жалобы. Цёмныя інтэр'еры, бронзавыя выявы таго, які безумоўна заслужыў такую жалобу. Толькі цяпер я даведаўся, што гэты мэмарыял пабудаваны якраз на тым самым месцы, дзе гаспадар ужо няіснага дому жыў, як ён сам пісаў, «пад аховаю законаў дыктатуры пралетарыяту». Натуральна, тут ня цягне гаварыць уголас. Таму гучныя вітаньні ды шчырыя ўсьмешкі немаладых і ня вельмі немаладых людзей несказана ажывілі атмасфэру гэтага дома, «у якім нас ізноў сабраў наш клясык». А сабраў, трэба адзначыць, кампанію паважную.

Здымак Данілы Жылінскага.

Дзясяткі тры навукоўцаў, шмат якіх я завочна ведаў.

Распачаў спатканьне Ніл Гілевіч. Прыгожы стары, да якога я нічога, акрамя павагі, ніколі не адчуваў. Нязломная прыцыповасьць у спалучэньні з абаяльнасьцю — рыса досыць рэдкая. Пракляўшы сёньняшніх абрусіцеляў, ён перайшоў да публіцыста Купалы. Да таго, хто расьпісаў быў у «нашаніўскім пэрыядзе» ўвесь беларускі шлях, а пасьля згадзіўся гаварыць не сваімі (?) словамі. Таму, на думку Ніла Сымонавіча, ня варта адносіць тэксты 30-х, падпісаныя Купалам, да ягонае спадчыны. Пасьля пайшлі даклады за дакладамі, зь якіх я даведаўся пра Купалаў сэнтымэнт да Сэрбіі, якая ў 1-ю сусьветную аддала кожнага трэцяга. Пра тое, што найбольш блізкаю нам літаратураю клясык лічыў украінскую. Найбольшае ажыўленьне выклікала тэма ягонага стаўленьня да Хрыста, як да роўнага ў шэрагу іншых, у тым ліку й паганскіх, багоў. Н.Гілевіч заўзята ўхваляў клясыка за «язычніцтва», астатнія не сьпяшаліся адкрыта падтрымаць Купалу

«Архіўнае

У Чэхіі вытрыманыя віны называюць архіўнымі. Калі я кажу «Архіўная літаратура» — я маю на ўвазе і гэта. Віно нядаўняй гісторыі — ягоны смак ня зблытаць ні з чым. Больш за ўсё я чытаю ўспаміны пра сталінскія часы, зараз гэта чамусьці жанчыны: Лідзія Гінзбург, Лідзія Чукоўская, Надзея Мандэльштам, Вольга Івінская, — гэта ўспаміны літаратараў. Я лаўлю сябе на тым, што адчуваю сябе ўтульна, чытаючы пра жыцьцё ў лягеры. Мне там псыхалягічна камфортна.

Чаму, думаю я — можа, я несвабодны чалавек, і мяне цягне ў лягер? Можа таму, што там усё проста, як у чорна-белым кіно: ёсьць канваіры, ёсьць зэка, і няма пакутаў свабоды выбару —выбралі за цябе? Многія змучаныя чаканьнем арышту ўспрымалі яго, як збавеньне ад няпэўнасьці. Аднак свабода выбару ёсьць паўсюль — у тым ліку ў лягеры, і зэка вельмі часта зьдзекваліся над сябрамі па няшчасьці паскудней за канваіраў, і ўсе праблемы — данасіць ці не, прыбіць слабога ці заступіцца, памры ты сёньня, а я заўтра? — са свабоды перакачавалі за калючы дрот. Я кажу — са свабоды, і памыляюся — якая там была свабода...

Я раптам разумею, чаму мне камфортна чытаць гэтыя ўспаміны —нягледзячы на ўсе жахі, гэта гісторыі з хэпі-эндам. Аўтары выжылі. Тыя, хто ня выжылі, успамінаў не напісалі.

Мэмуарная літаратура падобная на тэлевізар, самы моцны сродак камунікацыі, які чалавецтва прыдумала пасьля пісьменства. Там ёсьць эфэкт прысутнасьці, які стварае самы галоўны мастацкі эфэкт — эфэкт праўды. Пра гэта ведалі й раней, на такую ролю ў мінулым выкарыстоўвалі пэйзажы, партрэты, характары. У мэмуарнай літаратуры іх замяняе аўтар — удзельнік падзеяў. Гэта больш эканомна, і значыць — сучасна.

Аднак калі гісторыя сутыкаецца зь літаратурай, узьнікае небясьпека. Пасьля пэўнай вівісэкцыі факты перастаюць быць фактамі, узьнікае іншая ўяўная рэальнасьць — гэта азначае зьнішчэньне сапраўднай рэальнасьці, яе забойства. Уся наша афіцыйная гісторыя і літаратура — гэта форма зброі масавага зьнішчэньня. Зьнішчаецца самая загадкавая форма існаваньня матэрыі, яе чацьвертае вымярэньне — час. Гэтае зьнішчэньне мінулага часу — ззаду застаецца спаленая зямля,

Выстава на Во

22 кастрычніка ў Вільні, у галерэі «Арка», што каля Базыльянскіх муроў, адбылося адкрыцьцё выставы віленскіх мастакоў-беларусаў. Такія беларускія выставы адбываюцца ўжо амаль дзесяць гадоў запар. Раней гэта была чыста грамадзкая ініцыятыва, падтрыманая з боку літоўскае дзяржавы. Вяртаньне беларусаў на віленскі Парнас было сымбалічным. Калі адраджалася Беларусь, адрадзілася й віленская беларушчына.

Сёньня акцэнты пастаўленыя па-новаму. Традыцыю беларускіх выставаў падтрымлівае пасольства РБ у Літве. Што, прынамсі, да мастакоў, то для іх Беларусь як дзяржава адбылася. Беларускае пасольства купляе ў іх карціны, дапамагае афармляць дакумэнты, запрашае на імпрэзы. Але пры тым нешта вельмі йстотнае безнадзейна перамянілася... Адны мастакі прарваліся ў Эўропу і ўжо там шукаюць сабе славы, другія ўпарта ў холад і ў сьпёку стаяць на «панэлі» — імправізаваным кірмашыку ў Старым Месьце і зарабляюць наяўныя грошы. Ні тыя, ні другія не чакаюць запрашэньняў на афіцыйныя мерапрыемствы РБ. Але ёсьць і трэція, для якіх такія выставы ледзьве не адзінае пасьведчаньне, што яны мастакі, і застаюцца пры ўтульнай думцы, што дапамагаць мастаку — сьвяты абавязак дзяржавы. Разам з такім разьмежаваньнем зьнікла й славутая салідарнасьць мастакоў-беларусаў у Вільні.

Мэту правядзеньня імпрэзы красамоўна растлумачыў сп. Лявон Мурашка, старшыня згуртаваньня беларускіх арганізацыяў (якія не выяўляюць палітычнае пазыцыі. — Г.К.), адзін з ініцыцятараў правядзеньня выставы: «... Мы павінны заяўляць пра сваю прысутнасьць. Мы тут прэзэнтуем Беларусь». Па-першае, ЯКУЮ Беларусь? Па-другое КАМУ мастакі нешта павінны заяўляць?

Выстава дэманструе рэдкі ў наш час прынцып гуртаваньня мастакоў на этнічных падставах. Супольнасць эстэтычная і сьвятапоглядная тут адсутнічае... Прадстаўленыя творы мастакоў зусім розная ўзроўню: прафэсіяналаў, паўпрафэсіяналаў і аматараў. Можа ёсьць у гэтым і свая рацыя: прафэсіяналы ня маюць магчымасьці выстаўляцца ў галерэях паасобку, аматары ж атрымліваюць немалыя ўрокі майстэрства, а часьцяком і прарываюцца «ў рынак». Але ці гэта ня спосаб прыкрыць сваю бездапаможнасьць?

Што сёньня натхняе беларускіх мастакоў Вільні? Тое, што і сто, і дзьвесьце гадоў таму: жанчына, родныя краявіды, дары прыроды. Бадай, у колазвароце жаданьняў гэтых мастакоў нічога ня зьменіцца й праз стагодзьдзе: эратычныя мроі — туга па неспатоленым, садавіна-гародніна, як школьны дапаможнік, ды мэтры палёў, лясоў,

ў гэткім уніклівым стаўленьні да сёньняшняга бога. На нейкае імгненьне я «адключыўся» ад навуковых дэбатаў, засяродзіўшыся на галоўным герої гэтага дня. Дакладней, на ягонай бронзавай паставе, пад якой спрачаліся шаноўныя дасьледчыкі. Як дарэчы быў тут гэты помнік у натуральную велічыню з адсутным позіркам паверх галоваў. Безь яго не ставала б элемэнту містычнасьці, безь якога любы музэй мёртвы. Гледзячы на рэалістычнага, «поўнага дум аб народзе» Купалу, мне здалося пустым заняткам шукаць яму сёньня апраўданьні ці падшукваць апраўданьні, у якіх ён ня мае патрэбы. Ён ачысьціўся ўжо адной сваёю сьмерцю. Мне чамусьці ня хочацца верыць у забойства.

Між тым, слона ўзяў чаланек з тварам палкоўніка NATO Вітаўт Кіпель, які й падсумаваў вынікі першага дня па-вайсковаму коратка й зразумела. Галоўная, на ягоную думку, праблема сёньня: адлучанасьць вучнёўскае моладзі ад жывой і па сёньня публіцыстыкі Купалы, публіцыстыкі беларускага зьместу (а іншую, ці пазьнейшую, за акіянам ніколі не ўспрымалі й не вывучалі). Да чаго дагаварыліся ў той дзень купалазнаўцы, я не даведаўся. Іншыя справы прымусілі мяне пакінуць музэй. Але ў маім нататніку завёўся тэлефон па ўсім маскоўскага інтэлігента Аляксея Каўкі. Чым ня плённы вынік?

Калі я сыходзіў, то натрапіў на цікавую карцінку. Як групу дзяцей на чале з настаўнікам не пусьцілі ў музэй, дзе адбывалася мерапрыемства. Зусім не расчараваныя такім вынікам экскурсіі дзеці з гікам паразьбегліся па парку Купалы. Цікава, ці задумаюцца яны калі-небудзь, каму й за што стаіць такі вялікі помнік? Ці ўзьнікне ў іх калі-небудзь жаданьне пачытаць невершаваныя радкі паэта, якіх няма ў падручніках?..

Зьмицер Бартосік

ВІНО»

пустыня, над якой лунаюць міражы.

Дзёньнікі Барыса Мікуліча пару гадоў таму, дзёньнікі Танка зараз — што яшчэ? Чэзлыя кусьцікі жывога ў месяцавым ляндшафце без паветра, пад звышжорсткім выпраменьваньнем бяспамяцтва.

Старэйшыя літаратары — чаму яны жылі так, як жылі? Чаму мы ў такім дзярме? Ніхто не адчувае сваёй віны? І я думаю: а можа, ім няма ў чым каяцца? А можа, проста ім няма чаго ўспомніць? Можа — гэта не літаратары, бо яны не жылі? Можа, успаміны маглі напісаць толькі тыя, хто ня выжылі — не дажылі? Андрэй Мрый, Максім Гарэцкі, Ларыса Геніюш? Яны жылі, бачылі, разумелі, памяталі — таму іх баяліся і забілі.

Магчыма, на замену неіснуючай мэмуарнай беларускай літаратуры прыйдзе архіўная. Беларускую архіўную літаратуру павінны стварыць не гісторыкі, не дасьледчыкі пэўных пэрыядаў, не архівісты-публікатары — а літаратары. Магчыма, тады замест спаленай зямлі за намі паўстане зямля абяцаная — бязьлітасная, жорсткая, ірацыянальная, невядомая Беларусь. Сапраўдная, як канцэнтрацыйны лягер. Як жыцьцё і сьмерць.

Аляксандар Лукашук

СТРАБРАМСКАЙ

балотаў. Падсьведама: гэта тое, што можна прадаць...

Гэта чыстая праўда, што кожны беларус — паэт, ці прынамсі кандыдат у літаратары. Але калі беларус таленавіты — то ён таленавіты ва ўсім! Жывапісец Станіслаў Зялёнка, інжынэр па адукацыі, абураўся, што ў каталёгу няма згадкі пра тое, што ён напісаў дзьве кнігі вершаў. А мастак Алег Аблажэй, які скончыў два факультэты мастацкага інстытуту, не забываў нагадаць, што ў кнігарні за рогам прадаецца ягоная кніжка казак. Па-польску.

Вільня, між тым, засталася апірышчам беларускага мастацкага жыцьця. Мінаюць гады, паўстаюць межы, а яно, мастацтва, жыве і гоіць нашыя сэрцы.

У выставе ня бралі ўдзелу браты Сяргей і Алесь Поклады, іхныя працы экспануюцца сёньня ў Польшчы й Нямеччыне. Не запрашаюцца да ўдзелу ў беларускіх выставах і іншыя мастакі, якія таксама паходзяць зь Беларусі. Ня кожны зь іх б'е сябе ў грудзі, даводзячы сваё паходжаньне. Але ж і яны робяць сьвет цікавейшым.

Які вынік выставы? Усё ж на Вострабрамскай сустрэліся былыя сябры, змаглі паглядзець адзін аднаму ў вочы, пачуць роднае слова. Хіба мала?

Гары Куманецкі

АЎСТРЫЙСКІ СЛАВІСТ — ПРА ЛЁС МОВЫ

Знаны аўстрыйскі славіст, найбольш аўтарытэтны беларусіст на прасторах нямецкае мовы, прафэсар Зальцбурскага ўнівэрсытэту Герман Бідар быў адным зь нешматлікіх замежных удзельнікаў нядаўняй міжнароднай навуковай канфэрэнцыі «Беларуская мова ў другой палове XX стагодзьдзя», якая адбылася ў Менску. Выпускнік Венскага ўнівэрсытэту, Бідар, працуючы асыстэнтам інстытуту славістыкі ў Зальцбургу і займаючыся русістыкай і паляністыкай, заўважыў, што ніхто з аўстрыйскіх спэцыялістаў прафэсійна не цікавіцца беларусістыкай. Тады, на пачатку сямідзясятых, як сам прызнаецца, ён пастанавіў зьмяніць сытуацыю дыскрымінацыі беларушчыны ў славістычным сьвеце і саматугам авалодаў беларускаю мовай. Цяпер аўстрыйскі славіст працуе ў галіне ўнутрыславянскіх і нямецка-славянскіх моўных кантактаў, дасьледуе гісторыю славянскіх літаратурных моваў і соцыялінгвістычныя праблемы ўсходнеславянскіх моваў. У прыкметным выступе на менскай канфэрэнцыі Бідар прадставіў свае пагляды што да распрацоўкі канцэпцыі разьвіцьця лексычнай сыстэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы, даючы востра нэгатыўную ацэнку тэндэнцыям моўнага гвалту. У гутарцы зь Юрасём Бушляковым Герман Бідар матываў свае навуковыя падыходы.

— Ёсьць тры галоўныя спосабы папаўненьня лексычнага складу беларускай літаратурнай мовы: выкарыстаньне дыялектызмаў, словаўтварэньне (утварэньне нэалягізмаў) і тады запазычаньне. У новай гісторыі беларускай літаратурнай мовы чаргаваліся, як ведама, нацыянальна-моўныя тэндэнцыі з тэндэнцыямі моўнага гвалту, гэта значыць русіфікацыі. У нацыянальна-моўныя пэрыяды інтэграцыя дыялектызмаў, спрыяньне наватворам, талерантнасьць што да палянізмаў і адхіленьне русізмаў былі звычайнымі зьявамі. І наадварот, у часы русіфікацыі ў беларускую літаратурную мову актыўна ўкараняліся русізмы і рэзка абмяжоўвалася ўжываньне дыялектызмаў, нэалягізмаў і палянізмаў. У той час як у нацыянальна-моўныя пэрыяды выкарыстоўваліся ўсе магчымасьці пабагачэньня лексыкі, найперш інтэграцыя дыялектавых словаў, стварэньне нэалягізмаў і перайманьне запазычаньняў, у часы русіфікацыі беларуская лексыка пашыралася пераважна запазычаньнямі з расейскай мовы.

З 1930-ых да 1980-ых гадоў лексыка маладой беларускай літаратурнай мовы пабагацілася галоўным чынам запазычаньнямі з расейскай мовы, у нязначнай меры дыялектызмамі і словаўтваральнымі нэалягізмамі. У кансалідаваных мовах, як нямецкая ці расейская, згаданыя кампанэнты лексыкі маюць цалкам іншае разьмеркаваньне. Паводле зьвестак моваznаўцы Аляксандра Дулічэнкі, у 1960-ыя гады нэалягізмы расейскай мовы складаліся на 85% са словаўтваральных адзінак, на 7% з запазычаньняў і на 8% з сэмантычных нэалягізмаў. Дыялектызмы, відавочна, тады ўжо не адыгрывалі вялікай ролі пры пабагачэньні расейскай літаратурнай лексыкі. На маю думку, разьвіцьцё лексыкі і стылістыкі беларускай літаратурнай мовы, якой трэба пазьбягаць аднабаковых шляхоў свайго папаўненьня, павінна выходзіць з інтэграцыі ў першую чаргу характарыстычных дыялектызмаў, у другую чаргу аўтарскіх словаўтваральных нэалягізмаў і толькі ў трэцюю чаргу запазычаньняў зь іншых моваў.

— Працэс абнаўленьня лексычнай сыстэмы нашае мовы, які назначыўся ў другой палове васьмідзясятых, дагэтуль сутыкаецца з крытыкаю антырэфарматарскіх сілаў. Як вы ацэньваеце спробы паасобных прадстаўнікоў акадэмічнага беларускага мовазнаўства па-ранейшаму трымаць лексычнае разьвіцьцё мовы ў строга вызначаных рамках?

— Крытыка русіфікацыі адхіляецца антырэфарматарамі з дапамогаю больш палітычных, чым навуковых аргумэнтаў. Яны проста ўсё палітызуюць. Яны проста ня ведаюць практыкі іншых славянскіх рухаў нацыянальна-культурнага адраджэньня. Гэта адно. А па-другое, тут, у Беларусі, няма агульнаславістычнай традыцыі, тут існавалі толькі русістыка і беларусістыка, іншых субдысцыплінаў славістыкі — паляністыкі, багемістыкі, баўгарыстыкі і г.д. — за малым вынятkам, не было. Толькі за апошнія гады гэта зрабілі, паявіліся адпаведныя аддзяленьні ў БДУ стараннямі былога дэкана факультэту філялёгіі прафэсара Лойкі. Мне здаецца, антырэфарматарскія колы вельмі ізаляваныя, але зацята бароняць старыя пазыцыі. Я маю на думцы спадароў Жураўскага і Баханькова, яны актыўна працуюць супраць патрэбных рэформаў. І ўсё ж, гэты старэйшы лягер, мяркую, ужо прайграў, бо абапіраецца толькі на палітычныя моды.

— Якія практычныя захады, на Вашую думку, варта ўжыць для павышэньня жыцьцяздольнасьці беларускай літаратурнай мовы?

— Прафэсар Падлужны, кіраўнік Інстытуту мовазнаўства Акадэміі навук, на пачатку 1990-ых гаварыў пра блізкую рэвізію тлумачальнага слоўніка беларускай мовы. Я памятаю вялікую дыскусію вакол гэтага слоўніка ў васьмідзясятыя гады. Садоўскі, Бугаёў, Цыхун — усе крытыкавалі аўтараў-лексыкографаў. Мне здаецца, трэба абавязкова перапрацаваць усё ў духу самастойнага разьвіцьця беларускай мовы і стварыць яе новы лексычны фонд. Нельга паўтараць хібаў першага выданьня. Але для гэтага патрэбная карпатлівая лексыкаграфічная праца. Такі слоўнік ня хутка робіцца. Я ня ведаю, ці існуе яшчэ такая грамадзкая воля, грамадзкая думка, ці ёсьць імкненьне да другога выданьня. Ужо тут, пад час канфэрэнцыі, мне сказалі, што, праўдападобна, ня будзе перавыданьня... У кожным разе, задача лексыкографаў — будучых аўтараў новага тлумачальнага слоўніка беларускай мовы — гэта проста апісаньне моўнага узусу, безь ніякіх нарматыўных рэстрыкцыяў, бязь нейкай дыскрымінацыі беларускіх дыялектавых і рэгіянальных словаў, беларускіх словаўтваральных нэалягізмаў. Тут мае быць, я лічу, проста апісаньне стану мовы, а ня строгае нармаваньне, дыктаваньне нормы, як гэта было дагэтуль.

— Палітычная сытуацыя ў Беларусі прадвызначае характар працэсу моўнага ўпарадкаваньня. Мы ўспомнілі антырэфарматарскі лягер, людзей старой загартоўкі, старога часу. Яны адчуваюць вяртаньне тае атмасфэры, пры якой заўсёды ўпэўнена прадстаўлялі свае пазыцыі, будучы ісьцінай у апошняй інстанцыі. І цяпер напару яны нат не аргумэнтуюць, яны проста ўстанаўляюць: правільна так, а ня йначай...

— Я ўсё ж хачу сказаць, што частка беларускіх моваznаўцаў актыўна ангажуецца ў працэс удасканаленьня сучаснай мовы. Гэта патрыятычна настроеная частка, пераважна маладыя людзі. Тут я б назваў Сяргея Запрудзкага, Аляксандра Лукашанца, тут, у БДУ, сярод старэйшых прафэсар Плотнікаў і прафэсар Мячкоўская, маладзейшыя Лідзія Сямешка, Ірына Шкраба, у Акадэміі навук, мне здаецца, прафэсар Цыхун, магчыма, прафэсар Булыка... Але, ясна, ёсьць падзел, я б сказаў, паміж патрыётамі і антыпатрыётамі. А тым часам аўстрыйскія славісты скептычныя ў ацэнках будучыні беларускай мовы. Яны гавораць, што гэтая мова пад пагрозаю зьнікненьня. Гэта трагічна. З аднаго боку, ва ўсіх аўстрыйскіх, і не адно аўстрыйскіх — у многіх нямецкіх — унівэрсытэтах назіраецца даволі вялікая зацікаўленасьць беларусістыкай. А з другога боку, палітычнае кіраўніцтва Беларусі сыстэматычна абмяжоўвае беларускую, гэта значыць краёвую мову, мову карэннага жыхарства краіны. Таму аўстрыйская асацыяцыя славістаў пратэставала і будзе пратэставаць супраць такой сытуацыі.

Сёньня Бідар працягвае папулярызацыю беларускага матэрыялу ў нямецкамоўным сьвеце. Найбліжэйшым часам у Мюнхене мае выйсьці ў сьвет падручнік для нямецкамоўных славістаў «Уводзіны ў славянскія мовы». Герман Бідар падрыхтаваў для гэтага выданьня разьдзел «Беларуская мова». У Цюбінгене рыхтуецца да друку нямецка-беларуская манаграфія — падручнік гісторыі Беларусі. Аўстрыйскі славіст падрыхтаваў тут разьдзел «Разьвіцьцё беларускай літаратурнай мовы цягам XX стагодзьдзя». Раз на год Бідар абавязкова прыяжджае ў Беларусь. Ён разумее, што ягоны голас тут зусім ня лішні.

ПОШТА

Шаноўны спадар рэдактар,

прашу Вас пакласьці ў карабочак з тыповымі абмылкамі «НН», што месьціцца на стале ў першым пакойчыку Вашае рэдакцыі ў разьдзел «Адам Глёбус» наступную заўвагу: «НН», 20.10.1997, с.14, Адам Глёбус, «Замежнікі», правы слупок, 8-9 радок зьнізу: «Вось патрапілі машыны ў дарожны КОРАК...» Я дапускаю, што той корак мог быць «... велічынёю з гатэль «Рыц», але насамрэч Адам ня ведае (забыў!) беларускае слова «затор». «Вулічны, дарожны затор» — вось як трэба. Дарэчы, ТСБЛМ пад рэдакцыяй Судніка і Крыўко падае гэтае слова і ягонае значэньне. Праўда, там адсутнічае яшчэ адно значэньне слова «затор», а менавіта «адна заліўка брагі ў брагавар у народным самагонкагнаньні». Да прыкладу, «выгнаў два заторы самагонкі», г.зн. — двойчы паўтарыў працэс і атрымаў удвая больш самагонкі.

Заўважу, што згаданы слоўнік складзены без замілаваньня і любові да нашай мовы. Ня буду асуджаць аўтараў, можа, яны зрабілі, што маглі. Але штодня працуючы з моваю, я бачу кожнае слоўца, кожны характар і нораў, яны тоўпяцца вакол мяне, таўхаюцца, а то стаяць скептычна ўбаку, часам наравяцца. Божухна, які ж скарб мы маем! І як іх крыўдзяць на псэўдатэлебачаньні, на псэўдарадзіві; ну, то хай тыя, якім нашае слова ўпоперак глоткі захрасла, дык не ж, нават разумныя людзі са «Свабоды» — я маю на ўвазе радзіва, а то й «НН».

Вяртаючыся да расейскага слова «пробка», заўважу, што для новае генэрацыі гарадзкіх беларускіх пісьменьнікаў цяжка будзе падаць іншае значэньне — «растапляльны засьцерагальнік у электрычным ланцузе», а таксама «перашкода ў трубацязе» (скажам, паветраная).

Ёсьць слова «за́ткала». Да прыкладу — «зрабіць заткала з газэты для пляшкі». І выраз «быць заткалам у кожную бочку», г.зн. — усюды ўмяшацца, паўсюль тыкнуць свой нос. (Скажам, як вядомы Л.М. у Беларусі.)

Вось чаму трэба болей ствараць якасных тэкстаў з такімі інтэграцыйнымі задачкамі.

Мікола Бусел

Паважаная рэдакцыя!

Змарнаваўшы трохі свайго часу, я хачу давесьці да ведама Ганны Матусэвіч, што на багата якія словы зь яе «Маленькага слоўніка тубыльцаў» яна можа атрымаць дадатковую інфармацыю зь «Беларуска-рускага слоўніка» ў двух тамах (выдавецтва БелСЭ, 1988 г.), які мае больш за 110 тысячаў словаў. Вось гэтыя словы: адкасаць, апратаць, выдыгаць, вымерхацца, гізаваць, дадзець, завінуцца, задаўніцца, злосьнік, кіжлай, кіндзюк, лахудра, лопацень, лупіна, лядашта, мажджэр, надзюбацца, настаць, непадабенства, няспрытна, прыколка, прыстаць, раздура, сараматнік, спрытна, ступа, шэрхнуць.

Зь вялікай павагай да Вас

Эдуард Харанека, Бабруйск

КАРЧМА

Паводле актавых кніг Менскага й Слонімскага судоў канца XVI — пачатку XVII ст.

Шум, крык, гоман у карчме,
Кіпіць сельская дружына,
Піва, мёд, гарэлку п'е,
Ажно курыцца чупрына.
Гаспадары за сталом
Громка гутарку вядуць,
А ляндарка зь ляндаром
Мёд, гарэлку раздаюць
Хлопцы, дзеўкі, маладзіцы
Ля парога гаманяць,
А старыя чараўніцы
Цішком ля печы сядзяць.

Вінцук Дунін-Марцінкевіч

Калі я прыгадваю паданьне пра чараўніка Менеска, то чамусьці ўяўляю замест ягонага вялікага каменнага млына, адкуль, як вядома, па начох чуліся дзіўныя крыкі, галёканьне, песьні, музыка і скокі — іншую будыніну — карчму.

Ня ведаю, ці шмат людзей бачылі чароўную «хатку» Менеска, калі яна гойсала па-над зямлёй у пошуках прыгодаў, а вось раскіданыя паўсюль сапраўдныя корчмы бачыла і не абмінала багата «люду паспалітага».

Карчма — своечасовы прытулак. Карчма — злачынны кут. Карчмар абагрэе, накорміць і напоіць. Карчмар жа абрабуе і ашукае. І тым ня менш гэтае няпэўнае месца не заставалася без наведнікаў. Адных сюды прыбівала непагадзь, другіх — далёкі ад дому гандаль. Іншыя ж, сталыя, проста бавілі час, бо ногі самі вялі такіх у адваротны бок ад уласнае хаты.

Карчма была месцам спакусьлівым, бо мела нейкі падвойны статус. З аднаго боку гэта было месца, дзе часам чалавек губляў праз гарэлку чалавечы твар, дзе можна было пачуць моцныя словы, або адведаць пякучых кухталёў. Нават выраз «карчомная лаянка» ня трэба было тлумачыць, бо ён трывала ўвайшоў у тутэйшы абіход. З другога боку, наведаньне карчмы, застольле — стары звычай, нават завядзёнка такая... «пришол был в добрый обычай, хотечи собе казат дати меду або пива...», ці «... будучы на складу брацким пивном, который... зготовали были водлуг обычаев своих стародавних...»

Дзеля чаго зьбіраліся людзі ў карчме? Адпачыць, пазбыцца турботаў, павесяліцца. «Толькі і балю, што ў карчме». Піва, мёд, квас, гарэлка «аквавита» — традыцыйныя напоі беларускіх корчмаў дый шынкоў. Мёд згадваецца прэсны, кіслы, сычоны, стары з карэньнем. Піва — насеньня пшанічнага, ячнага, квас яблычны. У Статуце прыгадваюцца яшчэ і некаторыя гатункі вінаў: «мушкателя», «малмазея». У карчме можна было згуляць у карты, біркі, паслухаць музыкаў ды паскакаць. Сярод наведнікаў карчмы згадваецца скамарох Івашка з «трубой мосендзовой». Сярод музычных інструмэнтаў — кобза, дуда, скрыпка.

Будаваліся корчмы ля скрыжаваньняў дарог, пры ўездзе ў сяло, на кірмашовых пляцах, ля ракі, маста, поплава, возера, млына, на ростанях дарог, «на гостинцу великом», на рагу вуліцы... У сутоньні карчмар паліў ля будынка вогнішча, каб гэты своеасаблівы маяк не абміналі выпадковыя падарожнікі. Удзень жа карчма мала чым розьнілася ад звычайных сялянскіх хат. Звычайнае жытло з хаты і сеняў, часам з заездам для коняў, з калодзежам, з агароджай. Найбольш уражвала ўнутранае зьмесьціва карчмы. Вось ужо пэўна стаяў бы гармідар ад звону ды лязкату карчомнага начыньня, надумай апошняе, як той млын, узьняцца ўгару ды пакруціцца над хмызьнячкамі... Катлы медныя піўныя і гарэлачныя, ночвы, каўшы, вёдры, ушаты, кадкі, фляшкі, бочкі, кварты «з носаткою», кацялкі «мосяжовыя», місы драўляныя, талеры «цыновыя», куфлі, чаркі, «шкленіцы» вялікія і малыя, трыногі медныя, накіўкі, чарапкі, медніцы, лаханкі, кавдопы, ды, мусіць, безьліч яшчэ якога «посудка» былі пад рукой гаспадара карчмы і ягоных памочнікаў.

Карчміт звычайна трымаў карчму арэндай у заможнага пана (бо Статут сувора забараняў шляхце займацца гандлем, ці мець у доме шынок) і быў досыць заўважальнай постацяй сярод мясцовага люду. Яго ведалі гэтаксама, як і млынара, і каваля, а пэўна і болей, бо на старонках актавых кніг гэты тыпаж — адметны герой свайго часу. Рэдка калі карчмару даводзілася ціха рабіць сваю штодзённую працу. Часьцей быў біты, ці біў сам, краў, ці быў абрабаваны.

Як выглядаў карчмар? Вядома, па-рознаму. Але ж «поесременный з мошною», дый «на том же поясе нож, огниво» былі, мусіць, шмат у каго, бо як жа бяз гэтага?

Хто толькі не наведваў карчму! Казалі ж «Шынок пры дарозе цягне што ў возе». Шматлікі люд цясьніўся на грубачасаных лавах, туліўся да печкі, тупатаў на ганку, гаманіў... Найчасьцей то былі тутэйшыя людзі — «обыватели Великого Князства Литовского», збольшага знаёмыя адзін аднаму: баяры, мужыкі, «голота», «возницы», «курвы», «волочник з шнуром» (той, хто мераў валокі зямлі), а то й «чоловек народу простого, в сермязе и лаптях, бородою и усами заросльій...» Усе былі навідавоку. Варта было аднаму хлопцу трапіць пад падазрэньне ў крадзяжы грошай, як тут жа прыгадалі, што апошнім часам «... Пилип перед тым пенези некоторых не мевал, а тых прошлых часов... в корчмах мало не каждый день по двадцати грошей и больш на мёд пропивает... пироги куповал».

Асобна вылучаўся «люд подорожны, прыезджы», «гости» — купцы. Іхныя вазы з таварам стаялі ў двары, а самі яны часам спыняліся і на начлег. Прытулак у карчме мог скончыцца і стратай купецкага дабра не без дапамогі карчмара. Пра падобнае здарэньне апавядаў купец, які быў абрабаваны ў Міхнавіцкай стадоле жыда-арандатара Абрама. Ён вяртаўся зь Вільні, і ў выніку згубіў увесь свой набытак: «... товаров на одном возе было: селедцов бочок две, а на другом возе, на котором сам схал, было товару вшелякого крамного, так полотна, речей разных, што одно колвек, яко чоловеку купецкому немало належало серпов, кос. Того всего товару на том возе было коп за 80, а иншого и спомнети не могу»

Ад злога стадольніка пацярпеў таксама і радашкавіцкі ўраднік Ян Рагульскі, які з таварамі вяртаўся зь Менску дадому. Адно што здарэньне адбылося не ў самой карчме. «... толко выехали з Менска з улицы дорогою добровольною гостинцом великим... недоездчаючы дороги ростаней, которая идёт з Менска до Боровлян... нет ведома для которое прычыны, наполнившыся воли своее, а взявшы злый умысл перед себе стодолник... именя Видогощского... Сасин Куляжыч сам з двема браты молодшыми... догонившы... зо две годины до вечора, не маючы до них жадное потребы и ниякое розмовы... кийми и рознымі бронями побили, помордовали и окрутне, а шкодливе поранили».

У сапраўдную пастку да карчмара патрапіў зямянін Станіслаў Млажэўскі. Хоць напачатку ўсё выглядала нібыта законна і прыстойна. Зь нейкіх прычынаў зямянін вырашыў пакінуць арандатару стадолы ў Сімілавічах Яхіму і жонцы ягонай Гестры «до схованя» «скриню возовую зелезом окованую, замчыстую» за «замок их, ключы их». Але кажуць жа: «Карчмарова вока праз лахманы грыўны бачыць». Праз год зямянін «ездил, хотечы от них тую скриню свою одыскат... нижли тот Яхим... отдати и вернути ку великой шкоде не хочет...» Шкода была сапраўды вялікая, бо пералік зьмесьціва скрыні зямяніна ўражвае. «В которой скрыни был мешок полотна чырвоного, в котором было зложоно серебра ламаного от шабли з ложками серебраными поломаными в розных штуках гривень шесть, поес великий серебраный с чатками и занклями старосвецкими... гузов великих серебраных гладких шеснадцать. В той же скрине была шуфлядка флядровая... в которой было: ланхцужок золотый... перстенок золотый з дыяментом спичастым... другой перстенок з рубином... монета одна паньцерората... коралев великих двадцать, межы которыми было перел великих урынских десять... колпак оксамитный кормазыну чырвонага, кошуль музских коленских, тувални две коленских з лиштвами великими взоры... обрусов два... сервет коленских тузины два иншых речей дробных и справ розных немало было».

Яззп Баркоўскі. Беларуская карчма. 1863

Быў у карчмара, зразумела, і іншы клопат. Як найлепш зварыць піва, уцяпліць узімку будынак карчмы, набыць сьвяжэйшага мёду... А дзеля гэтага трэба было прыкладаць пэўныя намаганьні: дамаўляцца, вышукваць... Гэтак карчмар Марцін Пекар, даведаўшыся, што ў вёсцы Жыдкавічы пасьля леташняга мору апусьцелі тры «харомы», цішком перавёз іх да сваёй карчмы ў Вішава «... на дровы порубил, избы свои обогревал и пива уставниче варил гостям, людям переежджим огни роскладал...» Калі ж зямянін Матыс Хатылеўскі заўважыў зьнікненьне пустых «хором» сваіх падданых, то зьвярнуўся па справядлівасьць да суда і разам з возным пайшоў да карчмара. Той жа сустрэў іх варожа, бо чужое дабро ужо звыкся лічыць сваім. «... и выравши тычину с плота на Матыса набегал, хотечи его ударити... за груди торгал... и тычиною в груди и в бок торкал... шкаредными словами лаял: вы, злые люди, пошто тут, до дому моего приходите, хто вас вижами... на мене смеет дати, не здоровы тут от мене выйдете!»

Бывала, што карчмар не вытрымліваў цяжару свайсй працы і ўсё часьцей сядаў за сталы разам са сваімі наведнікамі. Урэшце гэта скончалася трагічна. Сьведкам і саўдзельнікам такога здарэньня быў возны, пра што і даў запісаць у судовую кнігу: «Был в стодоле, в корчме Переджырской... там нашол и зостал арендара тое стодолы Федора Грынковича зыншыми людьми обчыми горелку пьючы, где я, будучы, пил з ними горелку, то... тот арендар... опившыся горелки, почал умдлевать, и жона его Зейха, видечы... снегом, водою утирала и обливала, розумеючы, иж бы то ему помощно было, леч ничого оному не помогло, але мусял с того опильства з сего света смертю зойти, умерти».

Сама карчма часам была месцам бою, гвалту, нападу, сапраўднай «гарачай кропкай». Пэўна гарачай, бо часьцяком усё скончалася агнём. Гэтак падданыя Станіслава Паца «попившы в стодоле мёд, пиво и горелку...», спалілі карчму над ракою Ушою зямяніна Властоўскага «... огнистыми стрелами прыправными губку з серою — в нивеч обернули дощатку...» Падданыя ж князя Крыштапа Радзівіла зь вёскі Павялкова, зьбіўшы ў Петрыкаўскай карчме карчмара, ягоную жонку і служэбніцу, гразіліся «... мало на том, иж арендара, жону и служебницу его збили, але ещо постараемосе и з стодолою соломою обволокшы огнём запалате...» Пажар мог узьнікнуць у драўляным будынку таксама з-за сьвечкі, з-за печкі... «мещане Грицко, Пашко, Федор маючы з собою на возех товар, тоест соль белую, ехали до места Слонима, хотячи ее спродат... и заехали на ноч до стодолы... имения Лососинского. То пак дей оные мещане, яко люд подорожный, спрацованый в ноч были уснули... стодольница а господыня оное стодолы именем Соня Руска топила избу и в недоизренью её от того огня стодола запалила. Оные мещане, видячи таковый гвалт от огню, яко люд сонный, аж ледво в окны повтекали...»

П'яны карчомны кураж мог перарасьці ў шаленства і безразважнасьць. Для людзей, якія парушалі спакой, учынялі гвалт, нападалі на корчмы і іх гаспадароў, судовыя кнігі мелі пэўныя азначэньні: «зрушытели покою посполитого», «злочынцы,» гультаі, шкоднікі, «зуфальцы», «чоловек опилы»... Чыста карчомныя сытуацыі ўзьнікалі падчас гульні ў карты ці сумеснага расьпіцьця: «куфлем с пивом у видене вдарил... пивом очи залил...», «карту, што играют... змочивши за печ закинул... очи мёдом залил», «у голову горшком забил». Часам людзі, што знаходзіліся побач у карчме «бити не допускали» і выводзілі «злодзеяў» прэч. Ратавалі ад магчымага калецтва. Апавядаў і скардзіўся у судзе зямянін на зямяніна пра здарэньне на бяседзе: «почал мя шарпати и мачуку з рук моих рвати з слугою своим, а другому слузе своему казал мя с тылу кордом рубать, аж дей мя пасынок... ратовал и ззаду ранит не дал...» Сярод «зрушытелей спакою» трапляліся і кабеты, нават зямянкі. Гэтак пацярпеў ад слонімскай зямянкі Міхайлавай Рэзанавай «детина, который приглядает шинку в дому корчомном, жид Сролка». Разьюшаная кабета зьбіла яго і «шапку чорную куницами падшитую снела, и згинули грошы, которые люди напили».

Мэтай нападу на карчму быў перш за ўсё крадзеж грошай. Але ж рабаўнікі не абмяжоўваліся толькі гэтым. Часьцей за ўсё напіваліся тым, што было, а рэшту вылівалі проста на зямлю. Гэтак, у Белавіцкай карчме злачынцы «... защепки порубавши, мёд полубочок за семдесят грошей беручи пили, а иншое на землю розлили — горелки шест кварт, а воску два камени згинуло...» У Дзеравенскай карчме рабаўнік «впершися в стодолу и до светлицы замок сек и шкоды немалые починил... бочок три пива по пети ушатков... з бочок на землю вылил». Пасьля нападу сама карчма выглядала ня лепей за параненага карчмара. Дзявяткаўскі ўраднік пасьля агляду будынка пакінуў у судзе наступны аповед: «видел на воротех с приезду Слонимского знаков тятых... увошедши у светлицу, по правой стороне у стене з ручницы стрелено, другий раз окном стрелено з местечка... и третий раз противку окна у стене стрелено, на тот час шкод корчмту стало: медовых пенезей згинуло три копы, пивных пенезей — рубл грошей, горелочных две копы...» Злодзеі таксама секлі дзьверы, аканіцы, брамы, крышылі посуд, перакульвалі сталы і лавы.

Памяраючы, уладальнік карчмы, прыгадваючы ў тэстамэнце ўсю сваю маёмасьць, вызначаў таксама і яе лёс. Наступны фрагмэнт — словы апошняй волі слонімскага баярына Федара Валовіча, яшчэ маладога мужчыны: «... дом в месте Слонимском на улицы Великой, идучи з рынку по правой стороне лежачий и к тому корчма вольная, в том же дому мёд, пиво, горелка... Корчму... тут у месте Слонимском даную от его королевской милости небожчику отцу моему за млын... отписую жоне, детем моим на вечные часы...»

СЛОЎНІК СТАРАБЕЛАРУСКАЙ АКТАВАЙ МОВЫ

бирки — жэрабя
чатки — падвескі, упрыгожаньне
занкли — спражкі ці гузік
кармазын — сукно цёмна-чырвонага колеру
тувальня — шырокі ручнік, завезены з Італіі
возны — судовы выканаўца

Вольга Бабкова

ІНФАРМАТАР

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Вернікі вайсковай камісіі Слуцкай Рады БНФ віншуюць вернікаў-вайскоўцаў з Нараджэннем Хрыстовым

Вайсковая камісія Слуцкай Рады БНФ заклікае вайскоўцаў-патрыётаў адзначыць угодкі Слуцкага Збройнага Чыну

Прадам кнігу «Fundamental byelorussian» В.Пашкевіч, 2 тамы, выдадзеная ў Канадзе. Тэл.: 246-55-59

Запрашаем у беларускамоўнае асяродзьдзе, дзе вы спраўдзіце патрэбу ў духоўных дачыненьнях. Даведкі штосеравы зь 17.00 да 18.00 праз тэл.: 265-74-12

Вышлю: верш «Лука Мудзішчаў — прэзыдэнт», зборнікі «Беларускія патрыятычныя песьні і гімны», «Беларуская нацыянальная партызанка ў 2-ой сусьветнай вайне». 220107, Менск-107, а/с 191

Запрашаем ліцьвінаў манархічнага кірунку. 246012, Гомель, а/с 124

Вырабім круглыя значкі, распрацуем арыгінал-макеты. Тэл.: 249-08-88. Віталь

Прадаю кнігі «Менская вясна», «Аршанская шляхта», «Практыкаваньні»; паштоўкі, значкі і інш. 220085, Менск, а/с 5. Супрановіч Віталь. Тэл.: 231-04-08, 240-08-88

«Малады Фронт» запрашае моладзь, якая прагне дзеяньня і змаганьня за Беларусь шточацьвера ў 18.00. Варвашэні, 8

Віншую Валерыя Клапоцкага з надыходзячым днём нараджэньня жонкі

Сям'я здыме 1-пакаёвую кватэру з тэлефонам. Тэл.: 221-24-81

Увага! Беларускія запісы ў Менску можна набыць у краме Дзі Шоп (В.Харужай, 19), у штаб-кватэры БНФ (Варвашэні, 8). Тэл. у Менску: 231-04-08, у Маладэчне: 5-37-69 (Алесь), у Воршы: 4-71-07 (Ларыса), у Магілёве: 41-36-56 (Ала)

«Малады Фронт» арганізуе канцэрты беларускіх гуртоў, бардаў. Зацікаўленым асобам званіць: 233-50-12, 249-08-88. Віталь Супрановіч

Прапануем крамам на рэалізацыю разнастайную кніжную прадукцыю, запісы беларускіх гуртоў. 220085, Менск, а/с 5. Тэл.: 231-04-08. Віталь

Прадаю тэксты гурта «Камэлот» з акордамі. Кошт 10.000 руб. 220085, Менск, а/с 5. Тэл.: 249-08-88, 231-04-08. Віталь

Запрашаю спонсараў выдаць манаграфію «Гидрогеологические параметры: теория и методы определения». Тэл.: 263-66-06. Пётар Касьцюковіч

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі
Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220085, Менск, а/с 71

НАРОДНАЯ КНІГА

Васіль Быкаў. Сьцяна



Пасьля неаднаразовых прапановаў нашых чытачоў і з ласкавае згоды народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава выдавецтва «Наша Ніва» ажыцьцяўляе выданьне новае кнігі прозы В.Быкава «Сьцяна». Як вядома, гэтае выданьне рыхтавалася ў дзяржаўным выдавецтве, але сёньняшні палітычны рэжым спыніў выхад кнігі. Мы далёкія ад думкі, што беларускае слова можа ў прынцыпе існаваць толькі за дзяржаўныя датацыі, і мяркуем, што паміж творамі народнага пісьменьніка, як, зрэшты, і іншых таленавітых літаратараў, з аднаго боку, і чытачом — з другога, ня мусяць паўставаць непераадольныя бар'еры чынавенскае прыхамаці. Кнігі лепшых беларускіх літаратараў будуць выходзіць у такім аб'ёме і датуль, колькі і дакуль у гэтых кніг будзе чытачоў. Гэтак нарадзілася ідэя стварыць прэцэдэнт Народнае Кнігі. Мы ня ставім на мэце знайсьці спонсараў або зрабіць прыгожы жэст дабрачыннасьці. Мы імкнемся, насуперак цынічнаму да нашае мовы й культуры рэжыму, сьцьвердзіць, што беларускія кнігі мусяць выходзіць за грошы і дзеля патрэбаў беларускага грамадзтва. Разам з тым, мы спадзяемся на кансалідацыйны эфэкт Народнае Кнігі, якая мусіць умацаваць нашае грамадзтва і дадаць яму сілы духу.

Кніга «Сьцяна» складаецца з празаічных твораў Васіля Быкава апошніх гадоў.

Беларуская гісторыя XX стагодзьдзя стварыла нямала сытуацыяў, калі характары розных людзей па-рознаму выяўляліся на мяжы жыцьця і сьмерці. Слуцкае антыбальшавіцкае паўстаньне, Курапаты, другая сусьветная вайна, «хрушчоўская» адліга, перасьлед з боку КГБ у застойныя часы. Адпаведна рознымі былі і паводзіны міжвольных удзельнікаў гэтай гісторыі, ад якіх, па вялікім рахунку, не залежала нічога. Яны, фатальна абложаныя таталітарнай сыстэмай, маглі толькі захаваць або не захаваць сваю чалавечую годнасьць. Але ніякім чынам яны не маглі паўплываць на свой прадвызначаны статус — ахвяраў чырвонага або брунатнага малоха, які працяў кожнага зь іх наскрозь — іхны розум і іхную кроў.

Васіль Быкаў у новай кнізе прозы паказвае, наколькі немагчыма, але наколькі важна на самых фатальных этапах гісторыі захоўваць чалавечнасьць, прыстойнасьць, годнасьць. Псыхалягічныя сытуацыі ў крытычных абставінах становяцца напружанымі сюжэтамі, а дакладныя характарыстыкі самых розных чалавечых тыпаў змушаюць чытача ўвесь час адчуваць уласную прысутнасьць сярод быкаўскіх персанажаў і рабіць свой маральны выбар.

Кніга Васіля Быкава «Сьцяна» выйдзе ў сьвет сёлета. Выдавецтва «Наша Ніва» зьбірае папярэднія замовы на кнігу.

Нагадаем, што той, хто замаўляе кнігі «НН» да іх выхаду ў сьвет, аплочвае толькі сабекошт і кошт перасылкі, тады як гатовая кніга з гандлёвымі нацэнкамі будзе каштаваць значна даражэй.

Пра тое, як замовіць кнігу Васіля Быкава, чытайце на наступнай старонцы газэты.

6 лістапада ў экспазыцыйнай залі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **а 17 гадзіне** адкрыецца пэрсанальная выстава **Аляксандра КВЯТКОЎСКАГА**. Выстава мае назву **«ГУЛЬНІ З ВАДЗЯНЫМІ ФАРБАМІ»** і рэпрэзэнтуе акварэльныя працы, зробленыя ў 1996-1997 гадах.

Шаноўныя чытачы. З кожным месяцам няўхільна пашыраецца кола падпісчыкаў «НН». Прычым так адбывалася і сёлета ў летнія месяцы, калі газэты звычайна перажываюць зьмяншэньне колькасьці падпісчыкаў у «мёртвы сэзон», так адбываецца і цяпер. Але сёньня мы хочам зьвярнуць увагу тых, хто яшчэ ня выпісаў «НН», што гэта — вельмі практычная мера. У складанай сытуацыі, калі русіфікатарскі аўтарытарны рэжым гвалтам выгнятае зь Беларусі ўсё беларускае, можа стацца так, што мы здолеем дастаўляць Вам газэту ТОЛЬКІ ПРАЗ ПАДПІСКУ. Таму мы заклікаем усіх нашых прыхільнікаў стаць нашымі падпісчыкамі, а ўсім нашым падпісчыкам разам з падзякаю адрасуем наступную просьбы: дашліце, калі ласка, на адрас рэдкцыі Вашыя падпісныя квіткі і адрасы. Тады пры любых абставінах Вашая сувязь з «НН» не перапыніцца.

Рэдакцыя

Васіль Быкаў

Сьцяна

Каб замовіць новую кнігу прозы Васіля Быкава «Сьцяна», трэба 68.000 (кошт выданьня) + 20.000 (паштовыя выдаткі) пералічыць на рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

КНІГІ – ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Тэлефон для кантакту (8-017)-2-31-04-08 у працоўны час.

№	Аўтар і назва	кошт	кошт перасылкі
1	Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў.	58.000	16.000
2	А.Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.	28.000	12.000
3	А.Цьвікевіч. «Западноруссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў 19 і пачатку 20 в.	40.000	16.000
4	І.Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду.	10.000	10.000
5	Е.Ширяев. Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах.	40.000	12.000
6	М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія.	25.000	16.000
7	У.Ла Бар. Асабістасьць з псыхалягічнага пункту гледжаньня.	12.000	10.000
8	Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты. Уводзіны ў псыхалінгвістыку.	10.000	12.000
9	Што такое параўнальнае літаратуразнаўства.	25.000	12.000
10	Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.	10.000	12.000
11	Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.	20.000	12.000
12	Ж.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён.	15.000	16.000
13	Ф.Брэтон. Выбух камунікацыі.	20.000	12.000
14	Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне.	30.000	12.000
15	Ш.Дэбаш. Уводзіны ў палітыку.	30000	16.000
16	К.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё.	25.000	10.000
17	Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч1: Мікраэканоміка. Дапаможнік для студэнтаў.	45.000	20.000
18	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №1(96)	30.000	12.000
19	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №2(97)	40.000	20.000
20	Крыўя. №1, 1994	45.000	12.000
21	Крыўя. №1, 1996	55.000	12.000
22	В.Кіпель. Беларусы ў ЗША.	15.000	16.000
23	М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі.	20.000	10.000
24	Т.Сапач. Восень.	10.000	6.000
25	А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме.	30.000	16.000
26	А.Глёбус. Скрыжаваньне.	10.000	6.000
27	Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.	15.000	12.000
28	Беларускі вайсковы строй і зброя.	20.000	6.000
29	Беларускі рок-н-рол.	10.000	6.000
30	П.Бэрк. Рэнэсанс.	25.000	12.000
31	Ю.Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.	25.000	20.000
32	Е.Тэрборн. Эўропа сёньня і заўтра(1945-2000).	32.000	16.000
33	А.Дэні. Гісторыя эканамічнай думкі.	70.000	24.000
34	Я.Найдзюк. Беларусь учора і сёньня.	30.000	12.000
35	В.Гапоненка. Іван Яркоўскі. У пошуках гармоніі сусьвету.	10.000	6.000
36	А.Ятусевіч. Слоўнік зоапаразіталагічных тэрмінаў.	20.000	10.000
37	Ніл Гілевіч. Любоў прасьветлая.	35.000	12.000
38	С.Станкевіч. Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу.	10.000	6.000
39	Г.Сяржаніна. Беларуская навуковая тэрміналёгія. Біялёгія.	10.000	10.000
40	Ніл Гілевіч. Талісман.	15.000	10.000
41	Я.Станкевіч. Маленькі МАСКОЎСКА-БЕЛАРУСКІ слоўнік ак.	10.000	6.000
42	Л.Мірачыцкі. Сьветлым ценем Адама Міцкевіча.	10.000	6.000
43	Рэформа беларускага правапісу 1933 года.	6.000	6.000
44	Тэрміналягічны СЛОЎНІК па вышэйшай матэматыцы для ВНУ.	20.000	10.000
45	И.Хозеров. Белорусское и смоленское зодчество 10-13 вв.	30.000	12.000
46	Ул.Арлоў. Адкуль наш род.	85.000	15.000
47	Я.Запруднік. Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях.	55.000	16.000
48	Новы Запавет.	65.000	16.000
	ДЗІЦЯЧАЯ КНІГА		
1	Кася ў школцы.	9.000	14.000
2	Шарль Пэро. Чарадзейныя казкі.	20.000	26.000
3	Лагодны Цмок.	15.000	21.000
4	Гарасьо Кірога. Казкі трапічнага лесу.	15.000	21.000
5	Графіня дэ Сэгюр. Зачараваная хатка.	20.000	26.000
6	Марві Яла. Дзівосная Ноч.	15.000	21.000

ЛІТОЎСКАЯ МЭТРЫКА

Выйшла з друку чарговая кніга Мэтрыкі – том 11 (Кніга запісаў). Папярэдне выходзілі тамы 5, 6, 7, 8, 10. Просьба ахвотным дасылаць свае заяўкі пісьмова на адрас: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Калі Вы маеце тэлефон, пазначце яго.

Даведкі праз тэл.: 249-08-88 да 10 гадзінаў раніцы; 231-04-08 у працоўны час.

Новыя кнігі, дасланыя у рэдакцыю

Валошка М. Прыгоды лісьціка-карунчыка: Казкі: Для дашк. і мал. шк. веку. – Менск: Юнацтва, 1997. – 16 с., іл. – Наклад 6.000 ас. ISBN 985-05-0252-5

Валянцін Елізар'еў: Альбом / Складальнік і аўтар тэксту Т.Мушынская; на бел., рас., анг. мовах – Менск: Беларусь, 1997. – Наклад 5.000 ас. ISBN 985-01-0222-5

Вольскі В. Падарожжа па краіне беларусаў : Нарысы: Для сяр. і ст. шк. веку / Мастак У.Сачанка – Менск: Юнацтва, 1997. –238 с., іл. – (Школьная бібліятэка) – Наклад 8.500 ас. ISBN 985-05-0210-X

Дзеружынскі А. Азбукі: Для дзяцей дашк. і мал. шк. веку / Мастак А.Лось – Менск: Полымя, 1997. – 221 с., іл. – Наклад 8.000 ас. ISBN 985-07-0155-2

Крымінальнае права Беларусі (закон, злачынства, адказнасьць): Навучальны дапаможнік / А.Баркоў, І.Грунтоў, Т.Доўнар і інш.; Пад рэд. А.Баркова – Менск: Завігар, 1997 – 287 с. – Наклад 2.000 ас. ISBN 985-6187-06-0

Мдзівані Т., Сергіенка Р. Кампазытары Беларусі. – Менск: Беларусь, 1997 – 400 с., іл. – Наклад 5.000 ас. ISBN 5-338-00691-X

Судовая мэдыцына: Падручнік / В.Крукаў, Л.Бедрын, М.Пяткевіч і інш.; Пад рэд. В.Крукава – Менск: Універсытэцкае, 1997 – 496 с., іл. – Наклад 1.500 ас. ISBN 985-09-0025-3

Ткачоў П. Сустрэчы на лясных сьцяжынках: Казкі, апавяданьні, аповесьці: Для мал. шк. веку – Менск: Юнацтва, 1997 – 95 с., іл. – Наклад 3.000 ас. ISBN 985-05-0052-2

Форум: Інфармацыйна-культурны бюлетэнь. Нацыянальныя, этнічныя, культурныя, моўныя, рэлігійныя меншасьці ў Беларусі. – Менск: ЭўроФорум. – Лета 1997, №5. – Наклад 499 ас.

Волшебная криничка: Фольклор, стихи, рассказы: Для дошк. и мл. шк. возраста / Сост. П.Кошель; Пер. с бел. П.Кошеля, В.Артёмова; Худ. В.Волынец – Менск: Юнацтва, 1997 – 303 с., каляр.іл. – Наклад 7.000 ас. ISBN 5-7880-0533-7

Морозов В. Гомель классический. Эпоха. Меценаты. Архитектура. – Менск: Чатыры чвэрці, 1997 – 336 с., іл. – Наклад 5.000 ас. ISBN 985-6089-24-7

Русь – Литва – Беларусь. Проблемы национального самосознания в историографии и культурологии. По материалам международной научной конференции, посвященной 90-летию со дня рождения Н.Улащика (Москва, 31 января 1996). – Москва: Наследие, 1997. – 288 с. – Наклад 500 ас. ISBN 5-201-13278-2

Аляксандар Лукашук

«За кіпучай чэкісцкай работай»

Сцэны з жыцьця катаў

Новы кніжны праект «НН» – вынік шматгадовага архіўнага пошуку, на падставе дакумэнтаў дасьледуюцца ўнутранае жыцьцё НКВД і норавы чэкістаў-курапатчыкаў, мэханізмы цэнзуры і драма сучаснага маральнага выбару, адкрываюцца невядомыя старонкі нацыянальнай трагедыі.

Кніга «За кіпучай чэкісцкай работай» стане чарговым ілюстраваным выданьнем пад грыфам Архіву Найноўшае Гісторыі сьледам за ўжо вядомымі нашаму чытачу «Менскай вясной – 96», «Гартам» і «Філістовічам». Мяркуецца, што новая кніга ўбачыць сьвет у кастрычніку.

Папярэдняя замова (сабекошт + кошт перасылкі) складае 44.000 + 15.000 БРБ.

Каб замовіць кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Тэлефон для кантакту (8-017)-2-31-04-08 у працоўны час.

КАСЭТЫ – ПОШТАЙ

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 35.000 + 7.000 БРБ)

Ален. Нармалёк (1995)
Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
Вольга Акуліч.Трохкутнік
Вальжына Цярэшчанка (1991-1995)
Беларускія народныя казкі
Музычныя казкі (1996)
Бонда. Найлепшыя песьні
Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым
Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
Новае неба. Сон у трамваі (1994)
Новае неба. Go home (1995)
Новае неба. Мая краіна (1996)
Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
Крама. Камэндант (1995)
Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
Мроя. Найлепшыя песьні з праграмаў 1988-1990
NRM. LaLaLaLa (1995.)
NRM. Одзірыдзідзіна (1996)
Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5) т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990) т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993) т.3. Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузо-р'е. Зартипо (1986-1991) т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя (1992-1994) т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Тарнадо. Флэт (1992-1994)
Рок па вакацыях-96 (НРМ. Уліс. Флэт. Тарнада. Крама. Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
Будзьце аптымістамі, рабіце дзетак (Новае неба. Ляпис Трубецкой. НРМ. Палац, 1996)
Беларускі джаз т.1. Рэнэсанс т.2. Ігар Сафонаў т.3. Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
Беларуская гітарная музыка (1996)
Беларуская сымфанічная музыка (1996)
Яўген Паплаўскі. Творы (1996)
Лепшыя музычна-драматычныя творы радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры) т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазія па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха) т.3. Танец поўні (прагулка са Стынгам)
Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Салам Саўкам (1993)
Андрэй Мельнікаў. Песьні выгнаньня (1991-1993)
Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
Уліс. Чужаніца (1991)
Уліс. Танцы на даху (1993)
Уліс. Life-96
Уліс. Блуканьне (1996)
Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
Палац (1995)
Песьні беларускіх бардаў (1992)
Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба. Зіндам. Уліс. Мроя. Крама, 1994)
Маладзёжныя хрысьціянскія сьпевы. Прыйдзі і праслаўляй (1996)
Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
Уладзімер Клімовіч. Дзеці вятроў (1997)
Камэлот. У краіне талераў. (1995)
Эдуард Акулін. Мая Крывія. (1996)
Неруш (1997)
Ігар Палівода. «Максім» (1997
Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990-1996 г.
Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г.
NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
KRIWI - праект фольк-мадэрн студыі «Палац»
Купалінка - Kupalinka. Folk-group.
Ліцьвіны. Голуб на чарэшні.
Песьнярок. Песьні «Песьняроў» у выкананьні «Крамы», NRM, «Троіцы», «Тарнада», «Пані Хіды», «Ляпис Трубецкого», «Нейродюбеля», Валіка Грышко.
Белы сон (Беласток, 1997)
Харошкі. Полацкі сшытак, традыцыйная музыка (1997)
Жыгімонт Ваза. Стан Галюцынацыі
Марыя Скуратовіч. Табе, Хрысьце!
Песьнярок. CD (170.000)

КОШТ КАСЭТАЎ 40.000 + 7.000 ПОШТА

Gods Tower. The Eerie.
Gods Tower. Canticles.
Plastic Hardcore. Ultra.
Chemical Warfare. Demolition Tape.
Headcleaner. Hash. Hash. Resistance.
Insania Trivium. Candle of Fire.

Касэты можна замовіць праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

АРХІЎ БЕЛАРУСКАЙ РОК-МУЗЫКІ

Беларускі Гуманітарны Фонд «Наша Ніва» стварае Архіў беларускай рок-музыкі. Галоўная мэта новага праекту – збор матэрыялаў і дасьледаваньне сучаснай незалежнай музычнай традыцыі Беларусі.

Архіў зьбірае: старыя, рарытэтныя аўдыё-відэаматэрыялы, друкаваную прадукцыю (газэты, часопісы, афішы, плякаты і да т.п.).

Зацікаўленым асобам просьба зьвяртацца на адрас:

Архіў беларускай рок-музыкі, а/с 5, Менск 220085, або праз тэлефон: (017) 231-04-08 (Сяргей Сахараў).

НАВІНКА!

Форум: Інфармацыйна-культурны бюлетэнь. Нацыянальныя, этнічныя, культурныя, моўныя, рэлігійныя меншасьці ў Беларусі. — Менск: ЭўроФорум. — Лета 1997, №5. — Наклад 499 ас.

«ЭўроФорум» працягвае рэалізацыю свайго праекту дасьледаваньня меншасьцяў. Галоўная тэма нумару – рэлігійныя меншасьці ў Беларусі.

НАВІНКА!

Русь — Литва — Беларусь. Проблемы национального самосознания в историографии и культурологии. По материалам международной научной конференции, посвященной 90-летию со дня рождения Н.Улащика (Москва, 31 января 1996). — Москва: Наследие, 1997. — 288 с. — Наклад 500 ас. ISBN 5-201-13278-2

Міждысцыплінарная ды інтэрнацыянальная паводле свайго зьместу й аўтарства кніга ставіць задачу разгледзець малавывучаныя праблемы гістарычнага мінулага, культурнай спадчыны й нацыянальнае самасьвядомасьці беларусаў – з улікам міжнароднага, «у прыватнасьці расейска-беларускага гісторыка-культурнага й літаратурнага інтэртэксту». Кніжку яшчэ можна набыць у музэі Янкі Купалы ў Менску.

ГРАМАФОН.

[...]

У МУЗЭІ ВАЛУНОЎ

Ты вязень часу, гонца леднікоў,
І экспанат адвечнага музэю,
Бо ты — жыхар Краіны валуноў,
Краіны, небагатай на падзеі.

Ты — сымбаль змрочнай алегорыі,
Ці то прароцтва, ці то зьдзек —
Забыты на шляху гісторыі
Валун. А можа, чалавек?

Цябе ні зрушыць, ні ўзьняць —
Што табе воля ці свабода?
Табе ніколі не спазнаць
Узьнёслых думак асалоду.

Гакучай мовы родны гук
Ня будзе для цябе спакусай,
Каб распачаць аднойчы рух,
Прэч ад каменнага хаўрусу.

Ты здольны толькі назіраць
У сваёй нязьўнасьці замшэлай,
Як будзе ў часе вандраваць
Наш ветразь бел-чырвона-белы.

Аляксандар Антончык

МАРА НАТУРАПАТА

Калі сонца прыгрэе зямельку,
І сьнег сьлязою сьцячэ ў нізіны,
Я пакіну сяброў сваіх верных
І ўцяку у глухія мясьціны.

Забрыду у далёкую вёску
Да якой ні дайсьці, ні дабрацца,
Каб з прыродаю жыць заўжды разам
І дарамі яе харчавацца.

Капялюш з пінжаком кіну ў шафу
А для простай сялянскай работы
Куплю шапку, сарочку ільняную
І кірзовыя новыя боты.

Буду сок піць зь бярэзін і клёнаў,
Есьці бульбу з капустаю зь печы,
Пасьвіць статак ля сіняй рачулкі,
Грэць на сонцы застылыя плечы.

А на Сёмухі сьветлае сьвята,
Каб сялян не цураліся богі,
Я ў іх гонар надзену вяночкі
Усім кароўкам на вострыя рогі.

Затамлюся хадзіць па палетках,
У сінь лясоў бултыхнуся тады,
Каб блукаць сярод хвоін, алешын,
Верасоў, дзьмухаўцоў, лебяды.

Стану воўку таварышам верным,
Падзялюся зь ім боханам хлеба,
І ад водару траў захмялеўшы,
Паскуголю на зорнае неба.

Разам зь песьняй-выцьцём у паветра
Усю тугу сваю выплесну ў ночы,
Утаплю ў прорве жаднасьць і злосьць,
Што туманяць і розум, і вочы.

Прытаміўшыся лягу ў капну,
Папрасіўшы старую варону,
Каб мне казку на ноч расказала
Пра вужа і ягону карону.

Заадно і навіны пачую,
Што сарока ліcе ляскатала,
Як зьбіраў мёд мядзьведзь на паляне
І вавёрка ў гаі балявала.

К канцу ж лета з ачышчаным духам
І ад дрэў паднабраўшыся сілы,
У мітусьліву сталіцу вярнуся,
Да сяброў гаманлівых і мілых.

Раскажу пра свае ім прыгоды
За сталом ля трапезы багатай.
Заядаючы яблыкам байкі,
Запіваючы смак іх гарбатай.

Тацяна Будовіч

...

Прывітаньне, «нармалёк»!
Шчасьця зманлівы краёк
Прыгадаю без тугі
Ў час асеньняе смугі.
Ці то жартам, ці ўсур'ёз
Зьнічкі падаюць зь бяроз.
І здаецца, мабыць, мне,
Што ў расталым тумане
Усё ж чагосьці не стае.
Мары грэшныя мае
Усё завуць мяне ў вясну,
Быццам я яе вярну.

... Ах, якая неба сінь
Па-за золатам галін!
Слаўны выдаўся дзянёк.
Прывітаньне, нармалёк!

Ганна

...

Вадзіму

Пэўна, я цябе ніколі не кахала.
Не чакала ўночы, ўвечар, ўдзень.
Лета, пэўна, нас не шанавала
Водарам чароўнае надзеі.

Пэўна, мы ніколі не глядзелі
Проста ў вочы зорам і начы.
Пэўна, мы ніколі не гарэлі
Полымем каханьня. Не, маўчы.

Усё зьмянілася навокал хутка.
Восень праганяе доўгі дзень.
І хвіліны рвуцца пругка, гнутка.
Па жыцьці праходзіць шэры цень.

Я лаўлю рукамі рэшткі ветру.
З залатым лістком іду хутчэй.
Адчуваю ўсюды твае крокі,
І шукаю цеплыню тваіх вачэй.

Пэўна, я цябе ніколі не кахала.
Ты быў проста неабходны мне.
Я табе аб гэтым не казала.
Ды і хіба ж ты паверыў? — Не.

Ты даваў надзейны мне ратунак,
Ад людзей, ад злосьці, ад бяды.
Зараз я згубіла накірунак.
Час прайшоў, і шмат сышло вады.

Пэўна, я цябе ніколі не кахала.
Хоць чакала ўночы, ўвечар, ўдзень.
І нас лета шчыра шанавала
Водарам чароўнае надзеі.

Яўген Гучок

...

Ня ў сэнсе мовы абрусела Беларусь,
А ў сэнсе рабства, хамства...
Ды іншае бясконцае мярзоты.

...

Келіх волі хацеў я тут з вамі прыгубіць,
Толькі ж здольныя вы,
Што гарэлку нагбом каўтаць.

...

Беларусь! Беларусь! —
Ледзь забеленая
Зацырка.

...

Калі ты маеш душу і жывеш у Беларусі,
То будзеш доўга ў неба
З надзеяй голаў уздымаць.

...

Богаадступнасьць, Богапранікнёнасьць —
Вось стан які твой
Сягоньня, родны край.

...

А гэтага панка падзьвіжніцтва
Ня больш, чым зэдліка рухомасьць:
Калі пасунеш — дык і ён пасунецца.

...

Балотамі зашклілася ад Бога —
І празь вякі
Гібееш, Беларусь!

...

Ты — ціхае балота, Беларусь,
Але ж ты — і скразьняк,
Што маю душу прагне абнявечыць.

...

А мо ты — толькі абалонка?
А мо цябе зусім
Няма?

...

О Беларусь!
Сама галодная,
А як жа душу жывіш мне.

Зьмітрук Зданьнё

...

У пастку бяды твае мроі злоўлены...
Стой! Паглядзі на самога сябе...
Ты ўжо забіты, сьмяротна стомлены,
Хоць шчэ ўнутры цябе нешта шкрабе.

Мусіш ты йсьці, ды шляхі закрэсьлены,
Цемра з вачніцаў глядзіць у нікуды...
Ужо груганьнё прывячае песьнямі
Кволую здань, якой маеш быць ты.

Дух твой сьмярдзіць на зямлі сукровіцай,
Крук яго сёрбае дзюбай крывой.
Раньне паўзе, пакрыце барвовіцца...
Толькі усход гэты будзе ня твой.

Яўхім Корчак

...

Халодны вецер гоніць лісьце,
Зьбівае ў гурбы каля хатаў.
Скажыце, брацьця, дзе ж тут выйсьце
З такіх шалёных жорсткіх кратаў?

Душа у восень, як у цемру,
Увайшла, і сьвету ўжо ня бачыць.
Хто ж нам паслаў такую хеўру
Ад зла якой так сэрца плачыць?

Напэўна мала я маліўся
І быў няшчыры ў сваіх словах,
Калі вятры парвалі лісьце
І ў целе стала пуста, гола.

Вакол — прыкметы з дрэнным сэнсам.
Зьмяюка ў нетрах дрочыць джала.
Мана, бязважкая як пемза
Правадыром разумным стала.

А вецер вые, вецер сьвішча.
Гальлё галосіць. Цісьне цемра.
Няўжо і нас у кратах зьнішчыць
Хеўра?..

...

Зрываецца голас.
І верш цішыня разрывае.
І ломіцца боль на кускі,
Што ня склеіць ніяк.
І круціцца, круціцца
Чорнае чортава кола,
У якім жорсткі лёс
Стаў у горле маім, як камяк.

Змрочны дзень.
І адзеньне, як быццам у мніха.
І да споведзі нельга пайсьці:
Бо душа — атэіст.
На сьцяне — чорны цень,
На стале — чарадзейная кніга
І мне ведзьма гаворыць
Што я найвялікшы артыст.

Кніга маніць.
Няўтульнасьць душу разрывае.
Трэба б склеіць кускі,
Прыглынуць той мярзотны камяк.
Але ж круціцца, круціцца
Чорнае чортава кола
І, як костка, мой лёс
І яго не глынуць мне ніяк.

Зьмітро Кудлаты

...

У снох ды бярозах я трызьню-шапчу
На матчынай роднай мове;
Зь ёю ў той казачны сьвет я лячу,
Што сам сабе быў замовіў.
Толькі начой душа мае спачын.
Ранак — зноў шэрая багна...
Толькі б дажыць, дапаўзьці да начы,
Як жа за дзень я засьмягнуў!
Уночы ж, адхінуўшы прэч гэты сьвет,
Злыя абдоймы будзёньня,
У чыстую мрою я свой кладу сьлед,
Дзе не бывае сутоньня,
Дзе гістарычна маньяк не крычыць.
Дзе не схіляюць галовы,
Дзе самавіта ды годна гучыць
Мая васільковая мова
Гэтаму ж сьвету яна — войстры нож;
Яна — за калючым дротам.
Ды той, хто калісьці гуляў басанож
Ня ўспрыме дэмбельскіх ботаў.
Роднае слова — гаючы нэктар,
Смагу прагоніць дазваньня;
Днёвы страшэнны стрываю я ўдар
Ды дажыву да зьмярканьня!

Марыля Лагодзіч

ВАРЫЯЦЫІ СЬНЕНЬНЯ

На паліцах
асядаюць думкі.
Недарэчнасьць.

Маланка задыхаецца
ад пяшчоты Пяруна.
Навальніца.

Восень сьмяецца
жоўтымі вуснамі.
Я схавала яе сандалі.

Мост валіцца
кавалкамі цукру.
Кайданы.

Лужына займаецца
гімнастыкай трызьненьня.
Дождж.

Тэлевізар крычыць
знаёмым голасам:
Парыж.

Яма трымаё
прыватную краму.
Рэзэрвацыя.

Сыноптыкі абяцаюць
парасоны.
Паэзія.

Алесь Менскі

ПЕРШЫ СЬНЕГ

Першы сьнег не схавае бруду,
Ён ня здолее жыць на зямлі.
У адлігу ня ўтворыць атруту,
Не пакрые ўзімку ральлі.

Ён ня будзе рыпець пад абцасам,
Бо растане хутчэй за ваш крок.
Без ваганьняў пакіне сам-насам
Зь цяжкім ботам адно свой злы рок.

Ён з халодных вышынь аглядае
Чорна-шэры пусты краявід
І рашуча ізноў пачынае
Штогадовы сьвяты суіцыд.

...

На мурах рудыя плямы —
Водбліск вогнішча-вар'ята.
У шчыльнай цемры стогнуць краты,
Сьцяўся ты, і я таксама.

Цераз шчыліны у масцы
Лёс наш — кат наш пазірае,
У куце стагодзьдзяў зграя
Свой ланцуг ірве, бы ў пастцы.

Чырванее сталь, бо чуе —
Надыходзіць час зьяднаньня.
Жах пакуты да сьвітаньня
Хутка кожны з нас адчуе.

Хаця й маем мы уладу
Каб зьмяніць яго памкненьні —
Аддаемся ў захапленьні
Свайму лёсу — свайму кату.

...

Э.П.

Вы, напэўна, ня любіце холад,
Вы крышыце задумліва сьнег.
Вы глядзіце з усьмешкай, як горад
Запавольвае свой кругабег.

Чакалята нам цёплай здаецца,
Яе смак на губах застые.
Акіян сьвятла з пляжу ліецца —
Вы схавалі ў ім вочы свае.

Па-над морам ільда і каменьня
Вас пранесьці хачу на руках,
Як нясе усе вершы натхненьне,
Як да Ноя галінку нёс птах.

Сяргей Патаранскі

БРЭДБЭРЫ

Цывілізацыя маральных уродаў
працягвае сваё існаваньне
разьбітых баркасаў і лодак,
фальшывых найменьняў і званьняў.

Зомбі — прынятая норма паводзін,
норма любві і жаханьня
паміж балотнага асяродзьдзя
цывілізацыі тупога мычаньня.

І заўсёды знаходзіься ў трансе
ад падзеяў грамадзкіх курылак.
Цывілізацыя камікадзэ
не даруе ніякіх памылак.

Самагубства — праява сілы,
апраўдана і заканамерна
для цывілізацыі духоўных дэбілаў
і нестабільных нэрваў.

Браніслаў Пяткевіч

УПАРТЫ

Заўсёды ў быце нястачы
Згрызаюць развагу й сілы,
Жыцьцёвых калдобін няўдачы
Прыводзяць падчас да магілы.

У справе найлепшая тэза
Задачы рашаць без падману,
Каб роздум ішоў без пратэза,
А думка бяз руты туману.

Калі твой знаёмы ўпарты,
Ня мае правоў разуменьня,
Вучыць, як належыць, ня варта,
Бо згіне ў хвалях кіпеньня.

Прабач яго тупасьць, зьнявагу,
Але не садзі сабе ў лодку, —
Дурноце ён зьдзейсьніў прысягу,
Каб церці дзяркачыкам глотку.

Упарты, мажліва й варты,
Гуляць падкіднога ў карты
Й быць камандзірам для варты.

Сяргей Смага

...

Кацілася кола ды вочы парола
Вочы парола ды рэзала вусны
Сьветлым сваім існаваньнем
Сумным сваім існаваньнем

Дакацілася кола да празрыстай краіны
Да празрыстай краіны зь нябачным народам
Калекам-народам
Дударом зь мёртвых вуліц
Песьняром з-пад акраін

Дакранулася кола да ліхога народа
Дакранулася кола блакітнай рукою

— Калі ласка, прабачце
Што блакітныя пальцы —
Мае мяккія сьпіцы
Вас даверліва гладзяць
Вас пяшчотна люляюць
Не ламаюць вам шыі
Не сьвідруюць вам вочы
А пяшчотна люляюць

Калі ласка, дазвольце
Вам зрабіць падарунак:
Вось кавалачак хлеба
Вось духмяныя кветкі
Сьветлых ветразяў дзеткі
Вось духмяныя кветкі

Усьміхнуўся народ, здранцавелы народ
Адхінуў маё кола ды дадаў на растаньне:

— Уцякай, маё кола
Маё сьветлае кола
Нам ня трэба ні кветак
ані хлеба, вадзіцы
Толькі «чэснае» слова
Нам жыцьцё аднаўляе
Толькі «чэснае» слова

Пакацілася кола...

Ты вярнісь маё кола!!!

Ульянычава Тацяна

РОЗДУМ

Бездыханы ўпаў аловак
На белую бяздумную паперу.
Нічога мы ня вырашым на словах,
А напісаць я страціла ўжо веру.

Ужо колькі тысяч дзён прайшло,
А я сяджу ў задуменьні.
Мой позірк напраўляецца ў вакно
І я лаўлю шчасьлівыя імгненьні.

Зноў вусны шэпчуць рыфму,
А радкі — кладуцца на паперу.
Аловак — безнадзейны мост,
Бо страціла ўжо веру.

РОСПАЧ

У душы маёй смутак і боль,
Лячу я насустрач цемры.
Памерці, Гасподзь, мне дазволь!
Каму на Зямлі я патрэбна.

Я болей ужо не ўздыхну,
Я проста хапаю паветра.
Трымаю руку на вагню,
Памерла надзея, памерла.

Мне хочацца быць, як усе,
Але — ці бываюць бяз сэрца?
Згубіла свой шлях на рацэ,
А можа... найдзецца? Найдзецца?!

Юры Чарнякевіч

КНІГА ЖЫЦЬЦЯ

Сярод старонак
Жоўта-цьмяных
У смузе стагодзьдзяў,
У імгле,
Усе шукаюць
Фаліянты,
Не разважая аб вайне.

Вось тут — галоўная
Навука:
Стары,
Пахоўклы
Лемантар,
Дзе літар звонкіх
Ціхі грукат
Малюе сховы
Сьветлых мар,
Дзе думкі
Ў блытаніне
Тонуць.
У вачах
Бяссонных —
Стома дня.
Дзе не чуваць
Пакуль
І стогну...
А дзесьці —
Крумкае вясна.

Як добра,
Адчыняя вечнасьць,
Быць чытачом
А не пазтам,
Глядзець —
І адчуваць
Бясьпечнасьць.
Казаць —
І забываць
Пра мэту.

Сварог, Ісус,
Алах і Буда...
« — Уратуюць?!»
« — Не.»
І Бог,
І Д'ябал —
Сьлёзы Юды,
І Бог,
І Д'ябал —
Чалавек.

Агонь
Ня зьнішчыць
Кола часу!..
Анёлы
Загарнулі кнігу.
Шляхі пустэльныя,
Бы пасткі,
Перад
Вандроўнікам
Узьніклі.

А.Шадрын

...

Я — ніхто, я — рэха цішыні,
Чорны гук зьнямелае прасторы,
Я — калюгі кропля, мітусьні
Бляск сьляпы, адбіткам цьмяным у моры.

Я — крывёй запэцканы ручнік
Болей не патрэбны ў гаспадарцы,
Я — самотнай песьні мёртвы крык,
Я — атрута ў празрыстай шклянцы.

Я — ніхто, радок у плыні слоў,
Чарната ды вільгаць сутарэньня,
Я — твой боль, што ў роспачы вятроў
Страціў смак імпэтнага імкненьня.

Я — цягнік, што едзе ў Нікуды,
Драбяза бясконцасьці Сусьвету,
Шэры цень, які прыйшоў сюды,
Каб забіць уласных мараў мэту.

...

У гешэфт з сумленьнем я ўступіў —
— Агідны, брудны крок.
Трымценьне сэрца прыглушыў.
Бо, раптам, чорны цмок,
Падступны ды вычварны цмок
Стаў мною кіраваць,
І навакольля брыдкі змрок
Я пажадаў спазнаць,
Бо ён, так вабіць позірк мой,
Што не магу чакаць,
Хутчэй імкнуся за тугой
Я па сьлядах бяжаць,
Хачу атруты смак адчуць,
Стаць цьмянай пустатой,
І з асалодаю заснуць,
Пакінуты табой...

У гешэфт з сумленьнем я ўступіў,
Навокал — Цішыня,
Таму, што тых, каго любіў —
Згубіла мітусьня.

Алена Шарэпа-Лапіцкая

...

Утапіў Нэптун сваю карону,
Ды заплакаў горка ў бядзе,
Што сласлала Неба шмат праклёнаў —
І рассыпаў сьлёзы па вадзе.

Сьлёзы тыя вецер скоры
Хутка у мора уталіў,
І яны, нібыта Зоры,
Ночкай сьвецяць скрозь заліў.
Бо на дне марскім глыбокім
Абярнуліся ў бурштын,
Каб дзяўчатам сінявокім,
Падарыць на ўспамін.

...

Я мела шчасьце адзін раз —
У акваторыі пад морам,
Хоць шчасьце было напаказ, —
Ды Чайкі прывіталі хорам.
І пачалі яны вучыць
Мяне ўсім марскім навукам:
Каб з чарнавокім не дружыць,
Жывою не давацца крукам.
Каб не ісьці у цёмны змрок,
Дзе Рыбакі разложаць сеці,
І запрашалі, незнарок,
Над кручай разам зь імі сесьці.
Дзе столькі сьвету і цягла
І хваляў звонкіх адгалосьсяў...
Дзе б я пад Сонцам расьцьвіла,
Як некалі сярод калосьсяў...

Сымон Шаўцоў

ТРОШКІ АЎТАБІЯГРАФІЧНАЕ

Мае дзіцячыя гады
Напоўнены сіроцкімі сьлязьмі.
Юнацтва поўна голаду, жабрацтва.
Хоць і быў я маладым, ды ня меў юнацтва.
Дарослы век свой
Ня меў я шчасьця.
Нявольна трапіла напасьця.
Улада камуністаў аб'явіла мяне «нячыстым».
Быў з уладай «ня ў ладзе, ня ў згодзе».
Не павінен жыць у сваім народзе.
Выгналі з свайго краю,
Далёка за ўральскія горы
На пакуты, на гора.
Ды пачалася вайна з фашызмам,
Пагналі на перадавую ў бой.
«Заб'юць — чорт з табой».
Ды трапіў у страшны палон —
Фашысцкі палон —
Горш раптоўнай сьмерці.
Жыцьцю быў у палоне ня рад.
Голадам марыў фашысцкі гад.
Як я толькі выжыў?!
Сам таго ня знаю.
Хацеў памерці ў чужым
Варожым краю.

Ірэна Янчанка

...

Я згубіла сябе:
Я гляджу ў люстэрка
І ня бачу вачэй,
Толькі шызы туман.

Я гляджу на людзей:
Твары, вочы пустыя
І крывыя ўсьмешкі
Дораць шчыры падман.

Я б магла уцячы,
Уцячы і схавацца,
Каб ніхто ды ніколі
І не адшукаў.

Ды куды мне ісьці?!
Тут зямля майго сэрца,
Маіх мараў і думак
Быў тут вольны абшар.

Толькі мары абрыдлі,
Бо няможна іх зьдзейсьніць;
Думкі ціснуць мне скроні,
Бы сьвінцовы абруч.

А калі зрэдку справа
І паўстане надзея,
Дык туга ў той жа момант
Ўжо стаіць леваруч.

Я тугу праганяю,
А сыходзіць надзея,
Вера ў шчасьце зьнікае,
Застаюся адна...

Ды ужо адзінота
Не прыносіць спакою,
І яе як збавеньня
Часам клічу дарма.

Яна не дапаможа.
Я хаджу і шукаю
Сябе ў тварах, вітрынах
Але, можа, дарма...

...

Асеньні карагод лістоты...
Ўжо лета свой прайграла бой.
Апошні сонечны праменьчык
Праз хмары кліча за сабой.

Туды кудысьці, дзе ніколі
Мяне ня знойдзе дождж касы,
У крайнім выпадку тры кроплі
Крануць ласкава валасы.

А вецер там ня вые з болю,
Ня б'е у твар табе і мне,
А толькі весела гарэза
Раптоўна твар мне казытне.

А тут — мне холадна ля печы
І апранаюся дарма:
Мая душа ўшчэнт замерзла,
Бо ў ёй ня восень — ўжо зіма.

Працяг. Пачатак у папярэднім нумары.

ЭЎРАПЕЙСКАЯ КАНВЭНЦЫЯ АБ АБАРОНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Й АСНОЎНЫХ СВАБОДАЎ

Артыкул 21 3/

1. Чальцы Камісіі абіраюцца Камітэтам Міністраў абсалютнай большасьцю галасоў са сьпісу, складзенага Прэзыдыюмам Парлямэнцкай Асамблеі; кожная група прадстаўнікоў Высокіх Дамоўных Бакоў у Парлямэнцкай Асамблеі вылучае трох кандыдатаў, два зь якіх абавязкова зьяўляюцца грамадзянамі дзяржавы, якую прадстаўляе гэтая група.

2. У той ступені, у якой гэта магчыма зрабіць, гэтая ж працэдура выкарыстоўваецца пры камплектаваньні Камісіі ў тым выпадку, калі іншыя дзяржавы ў далейшым становяцца ўдзельнікамі Канвэнцыі, а таксама пры запаўненьні вакансіяў, якія адкрываюцца.

3. Кандыдаты мусяць валодаць высокімі маральнымі якасьцямі й адпавядаць патрабаваньням, якія прад'яўляюцца пры прызначэньні на высокія судовыя пасады, альбо мець прызнаны аўтарытэт у пытаньнях унутранага ці міжнароднага права.

Артыкул 22 */

1. Чальцы Камісіі абіраюцца на шасьцігадовы тэрмін. Яны могуць быць перавыбраныя. Аднак паўнамоцтвы сямі чальцоў зь ліку абраных на першых выбарах спыняюцца па сканчэньні трох гадоў з моманту абраньня.

2. Чальцы Камісіі, паўнамоцтвы якіх спыняюцца ў канцы першага трохгадовага пэрыяду, вызначаюцца паводле жэрабя Генэральным сакратаром Рады Эўропы адразу пасьля завяршэньня першапачатковых выбараў.

3. З тым, каб па магчымасьці забясьпечыць абнаўленьне складу Камісіі напалову кожныя тры гады, Камітэт Міністраў можа да правядзеньня любых наступных выбараў прыняць рашэньне аб тым, каб тэрмін ці тэрміны паўнамоцтваў аднаго ці некалькіх абіраных чальцоў складуць ня шэсьць гадоў, а іншы пэрыяд, але ня больш за дзевяць і ня менш за тры гады.

4. У выпадках, калі вырашаецца пытаньне аб большым тэрміне паўнамоцтваў, і Камітэт Міністраў ужывае папярэдні пункт, Генэральны сакратар вызначае тэрміны паўнамоцтваў паводле жэрабя адразу пасьля выбараў.

5. Чалец Камісіі, абраны для замяшчэньня іншага чальца, тэрмін паўнамоцтваў якога яшчэ ня скончаны, займае гэтую пасаду на працягу тэрміну, што застаўся да сканчэньня паўнамоцтваў яго папярэдніка.

6. Чальцы Камісіі займаюць свае пасады аж да самай замены. Пасьля замены яны працягваюць займацца тымі пытаньнямі, якія ўжо знаходзяцца на ім разглядзе.

Артыкул 23 4/

Чальцы Камісіі асабіста ўдзельнічаюць у працы Камісіі. На працягу ўсяго тэрміну, калі чальцы займаюць пасаду, яны ня мусяць прымаць на сябе выкананьне функцыяў, несумяшчальных з патрабаваньнямі да гэтай пасады — незалежнасьцю, бесстароннасьцю й незанятасьцю іншымі справамі.

Артыкул 24

Любы Высокі Дамоўны Бок можа перадаць у Камісію праз Генэральнага сакратара Рады Эўропы пытаньне пра любое меркаванае парушэньне палажэньняў Канвэнцыі іншым Высокім Дамоўным Бокам.

Артыкул 25

1. Камісія можа атрымліваць пэтыцыі, адрасаваныя Генэральнаму сакратару Рады Эўропы ад любой асобы, недзяржаўнай арганізацыі ці групы асобаў, якія сьцьвярджаюць, што яны сталі ахвярамі парушэньня іхніх правоў, якія выкладзеныя ў гэтай Канвэнцыі, адным з Высокіх Дамоўных Бакоў. Гэта магчыма пры ўмове, што Высокі Дамоўны Бок, на які пададзеная скарга, абвясьціў, што ён прызнае кампэтэнцыю Камісіі атрымліваць такія пэтыцыі. Тыя з Высокіх Дамоўных Бакоў, што зрабілі такую заяву, абавязваюцца ніякім чынам не перашкаджаць эфэктыўнаму выкананьню гэтага права.

2. Такія заявы могуць быць зробленыя на пэўны прамежак часу.

3. Заявы здаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы, які накіроўвае іхныя копіі Высокім Дамоўным Бакам і публікуе іх.

4. Камісія выконвае функцыі, прадугледжаныя гэтым артыкулам, толькі ў тым выпадку, калі хаця б шэсьць Высокіх Дамоўных Бакоў зьвязаных абавязкамі, пасьля таго як зрабілі заявы, прадугледжаныя папярэднімі пунктамі.

Артыкул 26

Камісія можа прымаць справу да разгляду толькі пасьля таго, як у адпаведнасьці з агульнапрынятымі нормамі міжнароднага права былі вычарпаныя ўсе ўнутраныя сродкі абароны, і толькі на працягу шасьці месяцаў з дня прыняцьця канчатковага ўнутранага рашэньня.

Артыкул 27

1. Камісія не разглядае любую пэтыцыю, пададзеную ў адпаведнасьці з артыкулам 25, якая:

a) зьяўляецца ананімнай;

b) зьяўляецца па сутнасьці такой самай, якая ўжо была разгледжаная Камісіяй альбо зьяўляецца ўжо прадметам іншай працэдуры міжнароднага разгляду ці ўрэгуляваньня, і калі яна ня ўтрымлівае новай інфармацыі адносна гэтай справы.

2. Камісія лічыць непрымальнай любую пэтыцыю, прадстаўленую ў адпаведнасьці з артыкулам 25, якую яна знойдзе несумяшчальнай з палажэньнямі гэтай Канвэнцыі, відавочна неабгрунтаваній альбо прызнае падачу яе злоўжываньнем права падачы пэтыцыяў.

3. Камісія адхіляе любую перададзеную ёй пэтыцыю, якую яна палічыць непрымальнай у адпаведнасьці з артыкулам 26.

Артыкул 28 5/

1. У выпадку, калі Камісія прымае перададзеную ёй пэтыцыю:

a) яна дзеля ўстанаўленьня фактаў сумесна з прадстаўнікамі бакоў распачынае вывучэньне пэтыцыі і, калі гэта неабходна, рассьледаваньне, дзеля эфэктыўнага вядзеньня якога зацікаўленыя дзяржавы пасьля абмену поглядамі з Камісіяй ствараюць усе неабходныя ўмовы;

b) яна адначасова аддае сябе ў распараджэньне зацікаўленых бакоў з мэтай забесьпячэньня прыязнага ўрэгуляваньня пытаньня на падмурку павагі правоў чалавека, вызначаных у гэтай Канвэнцыі.

2. Калі намаганьні Камісіі па прыязным ўрэгуляваньні пытаньня ўвянчаюцца посьпехам, яна ўкладае даклад, які накіроўваецца зацікаўленым дзяржавам, Камітэту Міністраў і Генэральнаму сакратару Рады Эўропы для апублікаваньня. Гэты даклад зьмяшчае кароткі выклад фактаў і вынікі дасягнутага ўрэгуляваньня.

Артыкул 29 6/, 7/

Пасьля прыняцьця пэтыцыі, прадстаўленай у адпаведнасьці з артыкулам 25, Камісія тым ня менш можа большасьцю ў дзьве траціны сваіх чальцоў прыняць рашэньне адхіліць пэтыцыю, калі ў ходзе яе разгляду высьвятліцца наяўнасьць адной з прычынаў, у сувязі зь якімі паводле артыкулу 27 гэтая пэтыцыя ня можа быць прынятая.

У такім выпадку рашэньне даводзіцца да ведама бакоў.

Артыкул 30 8/

Камісія можа на любой стадыі разьбіральніцтва прыняць рашэньне аб выключэньні пэтыцыі са свайго сьпісу справаў, калі абставіны прыводзяць да высновы, што:

a) заяўляльнік ня мае намеру дамагацца разгляду сваёй пэтыцыі, альбо

b) пытаньне было вырашанае, альбо

c) зь любой іншай прычыны, устаноўленай Камісіяй, неапраўдана далей працягваць разгляд пэтыцыі.

Аднак Камісія працягвае разгляд пэтыцыі, калі гэтага патрабуе павага правоў чалавека, вызначаных у гэтай Канвэнцыі.

2. Калі Камісія вырашыць выключыць пэтыцыю са свайго сьпісу справаў пасьля яе прыняцьця, яна робіць даклад, які зьмяшчае выкладаньне фактаў і рашэньне аб выключэньні пэтыцыі разам з падставамі для гэтага. Даклад накіроўваецца бакам, а таксама Камітэту Міністраў для інфармацыі. Камісія можа апублікаваць яго.

3. Камісія можа прыняць рашэньне вярнуць пэтыцыю ў сьпіс справаў, калі яна палічыць, што абставіны апраўдваюць такі крок.

Артыкул 31 9/

1. Калі разгляд пэтыцыі ня быў завершаны ў адпаведнасьці з артыкуламі 28 (пункт 2), 29 альбо 30, Камісія робіць даклад, які зьмяшчае факты, і выказваецца наконт таго, ці даказваюць выяўленыя факты парушэньне адпаведнай дзяржавай яе абавязкаў паводле гэтай Канвэнцыі. У дакладзе могуць быць выкладзеныя індывідуальныя меркаваньні чальцоў Камісіі па гэтым пытаньні.

2. Даклад накіроўваецца Камітэту Міністраў. Ён таксама накіроўваецца зацікаўленым дзяржавам, якія ня маюць права яго апублікаваць.

3. Калі Камісія накіроўвае даклад Камітэту Міністраў, яна можа ўносіць такія прапановы, якія палічыць слушнымі.

Артыкул 32

1. Калі пытаньне не перадаецца ў Суд у адпаведнасьці з артыкулам 48 гэтай Канвэнцыі на працягу трох месяцаў са дня накіраваньня дакладу Камітэту Міністраў, то Камітэт Міністраў вырашае большасьцю ў дзьве траціны галасоў чальцоў, якія маюць права ўдзельнічаць у паседжаньнях Камітэта, ці мелася парушэньне Канвэнцыі.

2. Пры станоўчым адказе Камітэт Міністраў прызначае тэрмін, на працягу якога адпаведны Высокі Дамоўны Бок мусіць зрабіць захады, прадугледжаныя ў рашэньні Камітэту Міністраў.

3. Калі адпаведны Высокі Дамоўны Бок ня зробіць задавальняючых захадаў на працягу прызначанага тэрміну, то Камітэт Міністраў вырашае большасьцю, прадугледжанай у пункце 1 вышэй, якія захады мусяць быць прынятыя ў сувязі зь яго першапачатковым рашэньнем, і публікуе даклад.

4. Высокія Дамоўныя Бакі абавязваюцца разглядаць ў якасьці абавязковага для іх любое рашэньне, якое Камітэт Міністраў можа прыняць дзеля выкананьня палярэдніх пунктаў.

Артыкул 33

Камісія праводзіць паседжаньні пры зачыненых дзьвярах.

Артыкул 34

Пры ўмове выкананьня палажэньняў артыкулаў 20 (пункт 3) і 29 Камісія прымае свае рашэньні большасьцю галасоў прысутных чальцоў, якія ўдзельнічаюць у галасаваньні.

Артыкул 35

Паседжаньні Камісіі праводзяцца па меры неабходнасьці. Паседжаньні склікаюцца Генэральным сакратаром Рады Эўропы.

Артыкул 36

Камісія выпрацоўвае ўласныя правілы працэдуры.

Артыкул 37

Сакратарыят Камісіі аддаецца ў распараджэньне Камісіі Генэральным сакратаром Рады Эўропы.

РАЗЬДЗЕЛ IV

Артыкул 38

Эўрапейскі Суд па правах чалавека складаецца зь ліку судзьдзяў, роўнага ліку чальцоў Рады Эўропы. Сярод судзьдзяў ня можа быць больш за аднаго грамадзяніна адной дзяржавы.

Артыкул 39

1. Чальцы Суда абіраюцца Парлямэнцкай Асамблеяй са сьпісу асобаў, высунутых чальцамі Рады Эўропы; кожны чалец Рады Эўропы высоўвае трох кандыдатаў, зь якіх хаця б два мусяць быць грамадзянамі гэтай дзяржавы.

2. У той ступені, у якой гэта прыдатна, гэтая ж працэдура ужываецца пры камплектаваньні Суда ў выпадку прыёма новых чальцоў Рады Эўропы, а таксама пры запаўненьні вакансіяў, якія зьявіліся.

3. Кандыдаты мусяць валодаць высокімі маральнымі якасьцямі й адпавядаць патрабаваньням, пастаўленым пры назначэньні на высокія судовыя пасады, альбо быць юрыстамі з прызнаным аўтарытэтам.

Артыкул 40 11/

1. Чальцы Суда абіраюцца тэрмінам на дзевяць гадоў. Яны могуць быць перавыбранымі. Аднак тэрмін паўнамоцтваў чатырох чальцоў Суда першага складу сканчаецца праз тры гады, а тэрмін паўнамоцтваў другіх чатырох чальцоў Суда — праз шэсьць гадоў.

2. Чальцы Суда, тэрмін паўнамоцтваў якіх сканчаецца праз тры й шэсьць гадоў, вызначаюцца паводле жэрабя Генэральным сакратаром Рады Эўропы адразу пасьля завяршэньня першых выбараў.

3. Для забесьпячэньня, наколькі гэта магчыма, абнаўленьня складу Суда кожныя тры гады на адну траціну Кансультатыўная Асамблея можа да правядзеньня любых наступных выбараў прыняць рашэньне, каб тэрмін ці тэрміны паўнамоцтваў аднаго альбо некалькіх абіраных чальцоў склалі ня дзевяць гадоў, а іншы пэрыяд, але ня больш за дванаццаць і ня менш за шэсьць гадоў.

4. У выпадках, калі вырашаецца пытаньне пра больш, чым адзін тэрмін паўнамоцтваў і Кансультатыўная Асамблея ўжывае папярэдні пункт, вызначэньне тэрмінаў паўнамоцтваў робіць Генэральны сакратар з дапамогай жэрабя адразу пасьля выбараў.

5. Чалец Суда, абраны для замяшчэньня другога чальца, тэрмін паўнамоцтваў якога яшчэ ня скончаны, займае гэтую пасаду на працягу тэрміну, што застаўся да сканчэньня паўнамоцтваў яго папярэдніка.

6. Чальцы Суда займаюць свае пасады да самай замены. Пасьля замены яны працягваюць займацца тымі справамі, якія ўжо знаходзіліся на ім разглядзе.

7. Чальцы Суда ўдзельнічаюць у працы Суда асабіста. На працягу свайго тэрміну паўнамоцтваў яны ня мусяць займаць такіх пасадаў, якія несумяшчальныя зь іхнай незалежнасьцю й бесстароннасьцю як чальцоў Суда альбо патрабаваньнямі гэтай пасады.

Артыкул 41 12/

Суд абірае Старшыню й аднаго альбо двух намесьнікаў Старшыні тэрмінам на тры гады. Яны могуць быць перавыбраныя.

Артыкул 42

Чальцы Суда атрымліваюць плату, прызначаную Камітэтам Міністраў, за кожны дзень выкананьня імі сваіх функцыяў.

Артыкул 43 13/

Для разгляду кожнай перададзенай яму справы Суд утварае палату зь дзевяці судзьдзяў. Чальцам палаты ex officio становіцца судзьдзя-грамадзянін дзяржавы, якая зьяўляецца баком у спрэчцы, альбо, калі такога ня знойдзецца, то на выбар гэтай дзяржавы любая асоба, якая засядае ў якасьці судзьдзі; імёны астатніх судзьдзяў вызначаюцца паводле жэрабя Старшынём Суда да пачатку разгляду справы.

Артыкул 44

Толькі Высокія Дамоўныя Бакі й Камісія маюць права перадаваць справу ў Суд.

Артыкул 45

Юрысдыкцыя Суда пашыраецца на ўсе справы, якія датычаць тлумачэньня й ужыцьця гэтай Канвэнцыі, якія Высокія Дамоўныя Бакі альбо Камісія перадаюць Суду ў адпаведнасьці з артыкулам 48.

Артыкул 46

1. Любы Высокі Дамоўны Бок можа ў любы час заявіць, што ён прызнае ipso facto й без спэцыяльнага ўзгадненьня юрысдыкцыю Суда абавязковай па ўсім пытаньням, якія закранаюць тлумачэньне й ужыцьцё гэтай Канвэнцыі.

2. Вышэйзгаданыя заявы могуць быць безумоўнымі альбо на ўмовах узаемнасьці з боку некалькіх альбо некаторых іншых Высокіх Дамоўных Бакоў альбо на пэўны прамежак часу.

3. Гэтыя заявы аддаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы, які накіроўвае іхнія копіі Высокім Дамоўным Бакам.

Артыкул 47

Суд можа прыняць справу да разгляду толькі пасьля таго, як Камісія пераканаецца ў безвыніковасьці намаганьняў па прыязнаму ўрэгуляванню справы, і на працягу трохмесячнага тэрміну, прадугледжанага артыкулам 32.

Артыкул 48

Пры ўмове, што зацікаўлены Высокі Дамоўны Бок, калі ён зьяўляецца адзіным, альбо зацікаўленыя Высокія Дамоўныя Бакі, калі іх больш аднаго, прызнаюць абавязковую юрысдыкцыю Суда альбо, пры адсутнасьці такога прызнаньня, са згоды зацікаўленага Высокага Дамоўнага Боку, калі ён зьяўляецца адзіным, альбо зацікаўленых Высокіх Дамоўных Бакоў, калі іх больш аднаго, перадаваць справы ў Суд могуць:

a) Камісія;

b) Высокі Дамоўны Бок, грамадзянін якога зьяўляецца меркаванай ахвярай;

c) Высокі Дамоўны Бок, які перадаў справу на разгляд Камісіі;

d) Высокі Дамоўны Бок, супраць якога пададзеная скарга.

Артыкул 49

У выпадку спрэчкі аб падсуднасьці справы Суду пытаньне вырашаецца азначэньнем Суда.

Артыкул 50

Калі Суд пастановіць, што рашэньне альбо захад, прынятыя судовымі ці іншымі органамі Высокага Дамоўнага Боку цалкам або часткова супярэчаць абавязкам, якія вынікаюць з дадзенай Канвэнцыі, а таксама калі ўнутранае права пазначанага Боку дапушчае толькі частковае кампэнсаваньне наступстваў такога рашэньня альбо захаду, то рашэньне Суда, калі неабходна, мусіць даць справядлівае кампэнсаваньне пацярпеламу боку.

Артыкул 51

1. Рашэньне Суда мусіць быць матываваным.

2. Калі рашэньне, цалкам альбо ў нейкай сваёй частцы, не выяўляе аднадушнага меркаваньня судзьдзяў, то любы судзьдзя мае права прывесьці сваё асабістае меркаваньне.

Артыкул 52

Рашэньне Суда зьяўляецца канчатковым.

Артыкул 53

Высокія Дамоўныя Бакі абавязваюцца выконваць рашэньні Суда па любой справе, у якой яны зьяўляюцца бакамі.

Артыкул 54

Рашэньне Суда накіроўваецца Камітэту Міністраў, які зьдзяйсьняе нагляд за ягоным выкананьнем.

Артыкул 55

Суд вызначае ўласныя правілы й наладжвае сваю ўласную працэдуру.

Артыкул 56

1. Першыя выбары чальцоў Суда адбываюцца пасьля таго, як колькасьць заяваў, зробленых Высокімі Дамоўнымі Бакамі ў адпаведнасьці з артыкулам 46, будзе роўнай васьмі.

2. Ніводная справа ня можа быць перададзеная ў Суд да гэтых выбараў.

РАЗЬДЗЕЛ V

Артыкул 57

Пасьля атрыманьня запыту ад Генэральнага сакратара Рады Эўропы любы Высокі Дамоўны Бок падае растлумачэньні адносна таго, якім чынам яго ўнутранае права забясьпечвае эфэктыўнае выкананьне любога з палажэньняў гэтай Канвэнцыі.

Артыкул 58

Выдаткі Камісіі й Суду нясе Рада Эўропы.

Артыкул 59

Чальцы Камісіі й Суда падчас выкананьня свах функцыяў маюць прывілеі й імунітэты, прадугледжаныя ў артыкуле 40 Статута Рады Эўропы і ў пагадненьнях, якія былі заключаныя ў адпаведнасьці зь ёю.

Артыкул 60

Нішто ў гэтай Канвэнцыі ня мусіць тлумачыцца як абмежаваньне альбо адхіленьне ад якіх-небудзь правоў і асноўных свабодаў чалавека, якія могуць гарантавацца заканадаўствам любога Высокага Дамоўнага Боку альбо любым іншым пагадненьнем, у якім гэты Высокі Дамоўны Бок удзельнічае.

Артыкул 61

Нішто ў гэтай Канвэнцыі не нясе страты паўнамоцтвам Камітэту Міністраў, якія ўскладзеныя на яго Статутам Рады Эўропы.

Артыкул 62

Высокія Дамоўныя Бакі згаджаюцца з тым, што, акрамя выпадкаў заключэньня асобага пагадненьня пра гэта, яны не скарыстаюць дзейныя між імі дамовамі, канвэнцыі альбо дэкларацыі дзеля перадачы шляхам накіраваньня пэтыцыі спрэчкі, якая ўзьнікла ў сувязі з тлумачэньнем і ўжыцьцём гэтай Канвэнцыі, для яе разгляду іншымі сродкамі ўрэгуляваньня чым тыя, якія былі прадугледжаныя гэтай Канвэнцыяй.

Артыкул 63

1. Любая дзяржава можа пры ратыфікацыі альбо ў любы іншы час пасьля гэтага заявіць у лісьце, адрасаваным на імя Генэральнага сакратара Рады Эўропы пра тое, што гэтая Канвэнцыя распаўсюджваецца на ўсе тэрыторыі альбо на любую зь іх, за міжнародныя адносіны якіх гэтая дзяржава нясе адказнасьць.

2. Дзеяньне Канвэнцыі распаўсюджваецца на тэрыторыю альбо тэрыторыі, пазначаныя ў паведамленьні, з трыццатага дня пасьля атрыманьня гэтага паведамленьня Генэральным сакратаром Рады Эўропы.

3. Палажэньні гэтай Канвэнцыі на такіх тэрыторыях прымяняюцца аднак з належным улікам мясцовых патрабаваньняў.

4. Любая дзяржава, якая зрабіла заяву ў адпаведнасьці з пунктам 1 гэтага артыкула, можа у любы час пасьля гэтага заявіць ад імя адной ці некалькіх тэрыторыяў, да якіх заява адносіцца, што яна прызнае кампэтэнцыю Камісіі атрымліваць пэтыцыі ад паасобных людзей, недзяржаўных арганізацыяў альбо групаў асобаў у адпаведнасьці з артыкулам 25 гэтай Канвэнцыі.

Артыкул 64

1. Любая дзяржава пры падпісаньні гэтай Канвэнцыі альбо пры здачы на захаваньне ратыфікацыйнай граматы можа зрабіць заўвагу ў дачыненьні да любога асобнага палажэньня Канвэнцыі ў адносінах да таго, што той ці іншы закон, дзейсны ў гэты час на ейнай тэрыторыі, не адпавядае гэтаму палажэньню. У адпаведнасьці з гэтым артыкулам абгаворкі агульнага характару не дапушчаюцца.

Артыкул 65

1. Высокі Дамоўны Бок можа дэнансаваць гэтую Канвэнцыю толькі па сканчэньні пяці гадоў з таго моманту, калі ён становіцца ўдзельнікам Канвэнцыі, і шасьці месяцаў пасьля паведамленьня, накіраванага Генэральнаму сакратару Рады Эўропы, які інфармуе пра гэта іншыя Высокія Бакі.

2. Такая дэнансацыя не вызваляе адпаведны Высокі Дамоўны Бок ад ягоных абавязкаў у адпаведнасьці з гэтай Канвэнцыяй ў адносінах да любога акту, які можа ўяўляць зь сябе парушэньне такіх абавязкаў, калі такі акт мог быць зьдзейсьнены ім да даты, калі дэнансацыя ўвайшла ў сілу.

3. Любы Высокі Дамоўны Бок, які перастае быць чальцом Рады Эўропы, перастае быць і Бокам гэтай Канвэнцыі на тых жа ўмовах.

4. Канвэнцыя можа быць дэнансаваная ў адпаведнасьці з палажэньнямі папярэдніх пунктаў у адносінах да любой тэрыторыі, на якую пашыраецца яе дзеяньне згодна з палажэньнем артыкула 63.

Артыкул 66

1. Гэтая Канвэнцыя адкрытая для падпісаньня чальцамі Рады Эўропы. Яна падлягае ратыфікацыі. Ратыфікацыйныя граматы аддаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы.

2. Гэтая Канвэнцыя ўваходзіць у сілу пасьля здачы на захаваньне дзесяці ратыфікацыйных граматаў.

3. Для тых дзяржаваў, якія ратыфікуюць Канвэнцыю пазьней, яна ўваходзіць у сілу пасьля здачы на захаваньне іхніх ратыфікацыйных граматаў.

4. Генэральны сакратар Рады Эўропы паведамляе ўсім чальцам Рады Эўропы пра ўваходжаньне Канвэнцыі ў сілу, пра Высокія Дамоўныя Бакі, якія ратыфікавалі яе, і пра здачу ратыфікацыйных граматаў, якія могуць быць атрыманыя ў далейшым.

Зьдзейсьнена ў Рыме чацьвёртага дня лістападу 1950 году на ангельскай і французскай мовах, прычым абодва тэксты зьяўляюцца аднолькава аўтэнтычнымі, існуюць у адзіным экзэмпляры, які захоўваецца ў архівах Рады Эўропы. Генэральны сакратар накіроўвае заверэныя копіі кожнай зь дзяржаваў, што падпісалі Канвэнцыю.

Зноскі:

1/ European Treaty Series N 5. Тэкст, зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 3 (ETS, N 45), які ўвайшоў у сілу 21 верасьня 1970 году, Пратаколу N 5 (ETS, N 55), які ўвайшоў у сілу 20 сьнежня 1971 году й Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году, і зьмяшчае таксама тэкст Пратаколу N 2 (ETS, N 44), які адпаведна пункту 3 артыкула 5 гэтага Пратаколу зьяўляецца складанай часткай Канвэнцыі з моманту яго ўваходжаньня ў сілу 21 верасьня 1970 году.

2/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

3/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

*/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 5 (ETS, N 55), які ўвайшоў у сілу 20 сьнежня 1971 году.

4/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

5/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

6/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 3 (ETS, N 45), які ўвайшоў у сілу 21 верасьня 1970 году.

7/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

8/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

9/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

10/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 3 (ETS, N 45), які ўвайшоў у сілу 21 верасьня 1970 году й Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

11/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 3 (ETS, N 45), які ўвайшоў у сілу 21 верасьня 1970 году й Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

12/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

13/ Тэкст зьменены ў адпаведнасьці з палажэньнямі Пратаколу N 8 (ETS, N 118), які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 1990 году.

Пратаколы да Канвэнцыі будуць надрукаваныя ў наступным нумары «НН».

Змаганьне за Вітушку пачалося

Як і трэба было чакаць, мае артыкулы (у тым ліку і ў «Нашай Ніве») пра генэрала Міхала Вітушку выклікалі нэгатыўную рэакцыю КГБ. Супрацоўнік прэс-службы гэтай установы Ігар Іваноўскі (былы журналіст) нарадзіў за апошнія месяцы аж тры «разоблачения опусов писателя-фантаста С.Ерша»: «Второе пришествие генерала Витушко» («Гродзенская праўда»; №59, 29 траўня 1997 г.), «Идёт поиск белорусских петэнов и квислингов?» («Народная газета», №150, 29 ліпеня 1997 г.) і «Каратель. Отпетого мерзавца пытаются представить национальным героем» («Знамя Юности», №109, 14 жніўня 1997 г.). Ігар Іваноўскі ганьбіць ня толькі генэрала Вітушку, мяне, як аўтара публікацыяў, але і беларускую эміграцыю.

Ня буду спыняцца на гэтых, поўных ідэалягічных штампаў і кагэбісцкіх фальшывак, артыкулах. Зазначу толькі, што, называючы Вітушку карнікам, Іваноўскі не прывёў ніводнага факту злачынстваў, нібыта ўчыненых ім. Напэўна, іх проста няма.

Сапраўды, пытаньне з генэралам Вітушкам ужо перастала быць толькі гістарычнай праблемай. Цяпер гэта праблема палітычная. КГБ ня хоча прызнацца, што ў свой час атрымаў паразу ў барацьбе зь беларускім нацыяналістам, таленавітым вайскоўцам. Прызнаць гэта — значыць, даць прыклад змаганьня за Бацькаўшчыну сучасным маладым радыкалам. Дзясяткі гадоў мы нічога ня ведалі пра нашага беларускага Бандэру, і вось праўда пра яго пачала прарывацца ў друк, даходзіць да моладзі. І вось ужо прэс-група УКГБ РБ па Гарадзенскай вобласьці ў запале ёрніцтва папярэджвае, што ў лясах можа зьявіцца вызвольная армія «бессмертного генерала Витушко»!

Што да стараньняў прэс-службы КГБ «пахаваць» генэрала ў студзені 1945 г., дык гэта справа безнадзейная. І я думаю, што яны разумеюць гэта, але вымушаныя абараняцца й захоўваць свае тайны, зь якіх яшчэ ня зьняты грыф «совершенно секретно». Тым больш, што некаторыя ўплывовыя асобы Беларускага Рэзыстансу яшчэ жывыя.

Тым часам пра беларускага генэрала Вітушку памятаюць ва Ўкраіне. Нядаўна ўсеўкраінскі тыднёвік «Шлях Перемоги» (ён распаўсюджваецца па ўсім сьвеце) зьмясьціў прысьвечаны яму артыкул, ілюстраваны фотаздымкам. Не забываецца пра Вітушку й Беларуская Энцыкляпэдыя, у 4-м томе якой зьявіўся мой артыкул пра яго. Праўда, без маёй згоды было дабаўлена некалькі ідэалягічных штампаў. Аднак на гэта можна закрыць вочы, бо ўжо сам факт зьяўленьня ў наш час у беларускай энцыкляпэдыі згадкі пра генэрала Вітушку й вызвольную армію «Чорны Кот» ня можа ня радаваць. Аднак гэта толькі пачатак змаганьня за нашага нацыянальнага героя. Прыйдзе час, і гісторыя назаве імёны сапраўдных калябарантаў — квісьлінгаў і пэтэнаў.

Сяргей Ёрш

Бібліяграфія публікацыяў, прысьвечаных генэралу Міхалу Вітушку

(для Архіву Найноўшае Гісторыі)

1. Беларускія матурысты // Шлях моладзі (Вільня). №7, 1930. С.15.
2. Ластаўка П. Беларусы ў Варшаве // Шлях моладзі. №8. 25.03.1938.
3. Агульны сход Асьветнага Таварыства Беларусаў у Варшаве // Шлях моладзі. №3, 1939.
4. Беларусы ў Варшаве // Рэха (Парыж). №6-7. Красавік-травень 1939.
5. Смаленская самаахова дзейнічае! // Новая дарога (Беласток). №10. 1 красавіка 1943.
6. Змаганьне і тэрор на Беларусі // Рух (Нямеччына). №4. Студзень 1947.
7. Schiesskrieg — hinter dem Eisernen Vorhang // Abendpost (Нямеччына). 11 Dezember 1948.
8. Вітушка апраўдаў давер. 45 000 партызанаў змагаецца за незалежную Беларусь // Бацькаўшчына. 26.12.1948. (Пераклад у скароце папярэдняга артыкула).
9. Генэрал Вітушка змагаецца // Бацькаўшчына. 3.05.1949.
10. Вітушка шырыць змаганьне // Бацькаўшчына. 30.05.1949.
11. Стары жаўнер. Партызаны і палітыканы // Беларускае слова (Заходняя Нямеччына). 18.06.1949.
12. Д. Расплата // Беларускае слова. 15.09.1949.
13. Падпольныя выданьні беларускіх партызанаў і нацыянальных арганізацыяў // Вольнае Слова (Заходняя Нямеччына). №7-9. 5.12.1949.
14. Партызанская барацьба на Беларусі несупынна трывае // Вольнае Слова. №1(10). Студзень-люты 1950.
15. У службе «Чорнага Ката» // Божым шляхам. №8-9. Жнівень-верасень 1950.
16. Вытрымкі з друкаў беларускіх партызанаў // Вольнае Слова. №2-3 (11-12). Красавік 1950.
17. Інтэрвію прэзыдэнта М.Абрамчыка // Божым шляхам. №8-9. Жнівень-верасень 1950.
18. Весткі з Бацькаўшчыны // Вольнае Слова. №4-5 (13-14). Верасень 1950.
19. Узнагароды для заслужаных Беларусаў // Бацькаўшчына. №7-8. 24.02.1952.
20. Адозва Цэнтральнага Камітэту Беларускай Незалежніцкай Партыі. — Заходняя Нямеччына. Сакавік 1954.
21. Другі Ўсебеларускі Кангрэс. — Мюнхен, 1954. С.31, 72.
22. Крук А. У 1954 годзе на Беларусі // Бацькаўшчына. №40(322). 30.09.1956.
23. За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі. — Лёндан, 1960. С.172.
24. Раманоўскі В. Саўдзельнікі ў злачынствах. — Менск, 1964. С.167, 191, 247.
25. Сакольскі. Некаторыя нясьцісласьці // Беларускі Голас (Таронта). №137. Красавік 1966.
26. На 30-я ўгодкі Беларускай Краёвай Абароны // Беларус (Нью-Ёрк). №206. Чэрвень 1974.
27. Стасевіч Ю. Беларуская партызанка 1944-1952 г. // Беларускі Голас. №232. Красавік 1975.
28. Малецкі Я. Пад знакам Пагоні. — Таронта, 1976. С.4.
29. Брылеўскі Ул. Беларусы ў даваеннай Варшаве (жменя ўспамінаў) // Беларус. №250. Люты 1978.
30. Лясы, бункеры, партызаны // Зважай (Таронта). №2, №3. Чэрвень, верасень 1978.
31. Стасевіч Ю. Беларуская партызанка па II вайне // Беларускі Голас. №292. Красавік 1981.
32. Другая сусьветная сустрэча беларускіх вэтэранаў // Зважай. №4 (36). Сьнежань 1984.
33. Летапіс беларускай эміграцыі. №23. Сьнежань 1984.
34. Летапіс беларускай эміграцыі. №477. Красавік 1987. С. 72.
35. Міхальчанка А. Белорусская символика: традиции и современность // Советская Белоруссия. 25.11.1990.
36. Гуленка У. Партызанскі рух: спроба неідэалізаванага аналізу, альбо некалькі пытаньняў сабе // Звязда. 7.08.1991.
37. Вір В. Маёр Беларускай Краёвай Абароны — Усевалад Родзька // Беларускі Голас. №365. Кастрычнік 1991.
38. Жумарь С. Армия Краёва: свет или тени? // Рэспубліка. 28.10.1992.
39. Ёрш С. Менск, 1942. У падпольлі створана Беларуская Незалежніцкая Партыя // Пагоня. №15. 4-10.06.1993.
40. Геніюш Л. Споведзь. — Менск, 1993. С.36, 65, 88.
41. Ёрмолович В., Жумарь С. Огнем и мечом. Хроника польского националистического подполья в Беларуси (1939-1953 г.) — Менск, 1993. С.99.
42. Сямашка Я. Армія Краёва на Беларусі. — Менск, 1994. С.217.
43. Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі. Т.2. — Менск, 1994. С.309.
44. Ёрш С. За волю і Бацькаўшчыну! Баявая партызанская прэса ў пасьляваеннай Беларусі // Пагоня. №19. 17-23.06.1994.
45. Жумарь С. Освобождение после освобождения // Советская Белоруссия. 26.08.1994.
46. Ёрш С. Провал «красного» призыва // Свободные новости. №21. Жнівень 1994.
47. Ёрш С. «Чёрный Кот» не басня — правда // Свободные новости. №21. Кастрычнік 1994.
48. Каўшанка З. «Так мне напісана ў Страшнай Кнізе...» // Наша Ніва. №10. Кастрычнік 1994.
49. Гасмюлер Д. Лясы, бункеры, партызаны // Пагоня. №36. 4-10.11.1994; №37. 11-17.11.1994.
50. Г.Д. Ніхто не забыты, нішто не забыта // Пагоня. №3. 20-26.01.1995.
51. Вежан Я. Дзе і калі загінуў генэрал Вітушка? // Пагоня. №5. 3-9.02.1995.
52. Ёрш С. Неизвестное покушение (как белорусы хотели убить Сталина) // Свободные новости-плюс. №12. 24-31.03.1995.
53. Вежан Я. Вызвольны рух у дакументах // Za volu. №2. Сакавік-красавік 1995.
54. Шукайловіч М. Беларускія нацыяналісты на маршы // Пагоня. №20. 26.05.-1.06.1995.
55. Ёрш С. Пасьляваенны супраціў бальшавіцкім акупантам на Беларусі // Пагоня. №23. 16-22.06.1995; №24. 23-29.06.1995; №26. 7-13.07.1995; №28. 21-27.07.1995.
56. Ёрш С. Беларускі нацыянальны рэзыстанс у гады Другой сусьветнай вайны // Пагоня. №33. 1-7.09.1995; №36. 29.09.-5.10.1995; №37. 6-12.10.1995.
57. Дудаліч С. Дзяды // Пагоня. №40. 27.10-2.11.1995.
58. Только «Чёрному Коту» не повезло // Пагоня. №41. 3-9.11.1995.
59. Ёрш С. Лісты прэзыдэнта // Пагоня. №46. 8-14.12.1995; №47. 15-21.12.1995.
60. Ёрш С. Адгалоскі // Ніва (Беласток). 3.12.1995.
61. Віцьбіч Ю. Антыбальшавіцкія паўстаньні і партызанская барацьба на Беларусі. — Нью-Ёрк, 1996. С. 330-337.
62. Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях. — Менск, 1996. С. 117-118.
63. Вежан Я. Да гісторыі палітычнай дзейнасьці беларускай эміграцыі; Тайна зьнікненьня беларускага загранічнага архіву // Пагоня. №12. 22-28.03.1996.
64. Дудаліч С. Беларускі генэрал-антыкамуніст // Пагоня. №14. 5-11.04.1996; №15. 12-18.04.1996.
65. Ёрш С. Арыштаваны ў Беластоку // Ніва. №27. 7.07.1996.
66. Ёрш С. Асьветнае Таварыства Беларусаў у Варшаве // Ніва. №31. 4.08.1996.
67. Лофтус Д., Севрук В. Секрет бригады «Беларусь» // Беларуская думка (Менск). №4. 1996. С.122.
68. Ёрш С. Першы Штурмовы Зьвяз // Ніва. №42. 20.10.1996.
69. Беларуская Энцыкляпэдыя. Т.4. — Менск, 1997. С.205, 206.
70. Ёрш С. Генэрал Вітушка // Наша Ніва. 12.05.1997.

Падрыхтаваў Сяргей Ёрш

Балтыйска-Чарнаморскі калектар

У верасьнёўскім нумары «НН» былі надрукаваныя матэрыялы, прысьвечаныя спатканьню дэпутатаў краінаў Балтыі, Беларусі і Ўкраіны, якое адбылося ў Менску ў лістападзе 1990 году, і дзе разглядаліся пытаньні стварэньня БЧС. Сёньня мы працягваем гэтую тэму.

Парлямэнцкая апазыцыя на плятформе БНФ у Вярхоўным Савеце 12-га скліканьня ўвесь час працавала ў накірунку рэальнага стварэньня БЧС. Адным з момантаў гэтай працы было правядзеньне канфэрэнцыі ў Менску ў справе будаўніцтва Балтыйска-Чарнаморскага нафтавага калектару. Адна з галоўных мэтаў праекту — зьменшыць сыравінавую залежнасьць Беларусі ад расейскае нафты. Па выніках канфэрэнцыі мною быў зроблены дэпутацкі запыт на 11-ай пазачарговай сэсіі ВС з мэтай высьветліць думку на гэты конт ураду Вячаслава Кебіча. 30 верасьня 1993 году з Саўміну Беларусі паступіў афіцыйны адказ, які я цалкам прапаную чытачам «Нашай Нівы». Лічу, што факты й лічбы, пададзеныя ў гэтым службовым допісе, не згубілі сваёй актуальнасьці й зараз.

Алег Трусаў,

намесьнік старшыні парлямэнцкай апазыцыі ў Вярхоўным Савеце 12-га скліканьня

Камітэт па нафце і хіміі пры Савеце Міністраў
Рэспублікі Беларусь
30 верасьня 1993 г. № 03-01-09/2915

Вярхоўны Савет
Рэспублікі Беларусь
Народнаму дэпутату
Рэспублікі Беларусь
А.А.Трусаву

На Ваш запыт на 11-ай пазачарговай сэсіі Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь аб неабходнасьці правядзеньня тэрміновых перамоваў зь іншымі краінамі па будаўніцтву Балтыйска-Чарнаморскага нафтавага калектару й дзеля выкананьня пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 24 траўня 1993 г. №340 Камітэт па нафце і хіміі паведамляе.

Нафтаправод Полацак-Вэнтспілс працягласьцю 516,7 км, дыямэтар трубы 720 мм, быў уведзены ў эксплуатацыю ў 1968 годзе. На нафтаправодзе пабудаваныя чатыры помпаперакачныя станцыі (ППС): «Полацак» — галоўная станцыя з рэзэрвуарным паркам 180 тыс. м. куб., «Скрудаліена», «Біржай» і «Джукетэ». Прыймова-здавальны пункт знаходзіцца на канцавым пункце нафтаправоду ў г.Вэнтспілсе. Кіраваньне перакачкай нафты ажыцьцяўляецца з дыспэтчарскага пункту ў г.Наваполацку праз сыстэмы лінейнай тэлемэханікі.

Працягласьць нафтаправоду складае:

Рэспубліка Беларусь	0-112 км	-112 км
Латвійская Рэспубліка	112,55-169,95 км	-57,4 км
	221,28-248,76 км	-27,46 км
	284,80-516,82 км	-232,02 км
	387,00-403,5 км	-16,5км (лупінг)
	РАЗАМ:	**-323,387 км**
Літоўская Рэспубліка	169,95-221,28 км	-51,33 км
	248,76-284,80 км	-36,05 км
	РАЗАМ:	**-87,384 км**

Прадукцыйнасьць нафтаправоду паводле праекту складае 16,55 млн. тонаў на год. Меркаваная прадукцыйнасьць пры зваротнай перакачцы з Вэнтспілсу ў Полацак складзе 6 млн. тонаў на год. Дзеля павелічэньня прадукцыйнасьці нафтаправоду Вэнтспілс — Полацак (безь перавышэньня дапушчальнага ціску) неабходна пабудаваць лупінгі на нагнятаньне ППС. Агульная працягласьць лупінгаў згодна са зробленымі ТЭР (тэхніка-эканамічнымі разьлікамі — Рэд.) складае 131 км. Пасьля ўводу ў эксплуатацыю лупінгаў прадукцыйнасьць можа быць даведзеная да 12 млн. тонаў на год.

З мэтай зьдзяйсьненьня зваротнай перакачкі на Наваполацак неабходна таксама пабудаваць ГППС у Вэнтспілсе й зрабіць пераабвязваньне трубаправодаў на дзейных ППС. Кошт рэканструкцыі нафтаправоду складзе арыентацыйна 80 млрд. рублёў у дзейных цэнах.

Паводле папярэдніх зьвестак, Рэспубліка Латвія, якая ня мае свайго нафтаперапрацоўчага заводу (НПЗ), зацікаўленая ў зваротнай перакачцы нафты на Наваполацкі НПЗ замест нафтапрадуктаў, якія пастаўляюцца з Рэспублікі Беларусь.

Рэспубліка Літва ў сучасны момант распачала праектаваньне тэрміналу паблізу г.Клайпеда і нафтаправоду працягласьцю прыкладна 100 км да НПЗ «Мажэйкяй». Кошт будаўніцтва будзе вызначаны праектам. Гэты варыянт пры дасягненьні дамоўленасьці зь Літвой і Латвіяй па выніках перамоваў і долевага ўдзелу Беларусі ў будаўніцтве дазволіць ажыцьцяўляць перакачку нафты на Наваполацкі НПЗ з Клайпеды.

Дзеля перакачкі нафты з портаў Чорнага мора спатрэбіцца пракласьці па тэрыторыі Ўкраіны болей за 400 км нафтаправоду коштам каля 200 млрд. рублёў у дзейных коштах без уліку вартасьці земляў, па якіх пройдзе траса нафтаправоду, а таксама кошту 4-х ППС. Апроч таго, пры гэтым неабходны долевы ўдзел рэспублікі ў будаўніцтве тэрміналу і рэканструкцыі порту ў г.Адэса. Усе аб'ёмы працаў запатрабуюць велізарных капітальных укладаньняў (дакладны кошт можа быць вызначаны толькі пасьля распрацоўкі ТЭА (тэхніка-эканамічнае абгрунтаваньне — Рэд.)) пры тэрмінах праектаваньня й будаўніцтва ня менш за 5-7 гадоў.

Такім чынам, патэнцыйная тэхнічная магчымасьць перакачкі нафты з портаў Латвіі і Літвы маецца. Аднак пры гэтым неабходна ўлічыць, што кошт паставак нафты са Скандынавіі праз гэтыя порты ў параўнаньні з коштам паставак з Расеі ў сусьветных коштах будзе вышэйшы ня менш чым на 20 даляраў ЗША за 1 тону з прычыны кошту танкерных транспартовак і выгрузак у тэрміналы.

У сувязі з выкладзеным, Камітэт па нафце і хіміі лічыць мэтазгодным на гэтым этапе правесьці перамовы з Латвіяй, Літвой і Расеяй па пытаньнях забесьпячэньня дадатковых паставак нафты ў тым ліку праз порты Вэнтспілс і Клайпеда.

Што датычыць удзелу Рэспублікі Беларусь у будаўніцтве нафтапроваду па тэрыторыі Ўкраіны, Белнафтахім лічыць магчымым вярнуцца да разгляду гэтага пытаньня пасьля пачынаць рашэньня па Балтыйскім кірунку. Вышэйназваныя прапановы падтрымліваюць Дзяржэканомплян і Дзяржзьнешэканомсувязі.

Намесьнік Старшыні А.М.Мазанік

Пераклад дакумэнта зроблены з расейскай мовы.

Публікацыя ажыцьцёўленая ў рамках праекту «Адна зямля — Ускодняя Эўропа». © Архіў Найноўшае Гісторыі

Пацьверджаньне набыткаў Архіву Найноўшае Гісторыі

НОВЫЯ ПАСТУПЛЕНЬНІ .. АД КАГО ПАСТУПІЛІ

Гуляць дык гуляць: Застольныя песьні беларусаў ..... В.Арэшка
Самвыдавецкія друкі ..... М.Баразна
Самвыдавецкія газэты, улёткі ..... С.Кнырэвіч
Самвыдавецкія друкі ..... У.Вяроўкін
Улёткі, карыкатуры ..... А.Анціпенка
Улёткі (Віцебск) ..... Ю.Сьцяпанаў
Палесьсе, якога ня ведаем: фотаэтнаграфічная выстава ..... А.Клакоцкі
Наш радавод ..... А.Коржыч
Ф.Кафка (самвыдат) ..... А.Фядорчанка
Неформальные объединения в политической жизни республики ..... В.Супрановіч
Улёткі (Баранавічы) ..... Р.Равяка
Практычны расейска-беларускі слоўнік (1926) ..... В.Валошын

ПАСТУПЛЕНЬНІ АРХІВУ БЕЛАРУСКАЙ РОК-МУЗЫКІ

Фота, плякаты, касэты і інш. ..... А.Мяльгуй
Плякаты, кампакт-дыск гурта «Крама» і інш. ..... А.Белізяк
«Праз рок-прызму» ..... В.Мартыненка, А.Мяльгуй
Плякаты, касэты гурта «Новае неба» ..... К.Камоцкая
Плякаты, касэта, плыты гурта «Уліс» ..... В.Корань

Архіў Найноўшае Гісторыі выказвае падзяку ўсім ахвярадаўцам

Сяргей Паўлоўскі

Марыя і правакатар

(Вострая Брама і вобраз Леніна)

О Маці Божая, што ў слаўнай Вострай Браме,

Як зорка ясная, нам сьвеціш заўсягды...

Цудадзейны абраз Маці Божае Вострабрамскае, апеты беларускімі творцамі ўсіх веравызнаньняў, у вершах савецкага часу і савецкае прасторы ня згадваецца. Галоўны сьвяты абраз беларусаў у Беларусі на доўгія гады трапіў пад цэнзуру. Яму на зьмену прыйшоў іншы галоўны абраз — вобраз Леніна. Гучыць, вядома, паблюзьнерску: Маці Божая і Ленін. Але сказаць пра гэта па-іншаму яшчэ не атрымліваецца. Як апісаць сатанінскую эпоху без сатанізму? Праблема! Так часам у тэксьце аўтара, які выкрывае злачынствы КГБ раптам вычуваеш гэбісцкія ноткі. Дастаткова інтанацыі. Або — як шмат камунізму ў сучасных антыкамуністычных лёзунгах і дзеяньнях, у характарах і поглядах дэмакратаў і незалежнікаў.

Паступова пачынаеш разумець, што «перастройка» ў Беларусі не дайшла да глыбіннага ўзроўню, а адбылася толькі фармальна. На словах. Таму так пасьпяхова ідзе сёньня рэсаветызацыя. Індыкатарам пераменаў можа стаць толькі праўда пра Леніна, прамоўленая безь ленінізму ў голасе і пачутая бязь Леніна ў сэрцы.

... Мы зь сябрамі разглядаем архіўныя здымкі Леніна перад скананьнем. Здымкі нагадваюць ілюстрацыі з падручніка судовае мэдыцыны. Я шукаю ў слоўніках беларускі адпаведнік дыягназу «невменяемость» і не знаходжу. Шырока расплюшчаныя пустыя вочы з матавым бляскам зрэнак. Погляд, які пакінула думка. Погляд немаўляці. Адтапыраная ніжняя губа, галава нахіленая ўправа. Вось-вось з вуснаў сарвецца штосьці дадаістычнае...

Сузіраньне здымка выклікае адначасова гідлівасьць і боль, даўкую вусьціш ад адчуваньня несапраўднасьці ўсяго твайго ранейшага жыцьця. Напэўна штосьці падобнае адчуваюць самагубцы, стоячы на краі прорвы.

«Ленін думае пра Беларусь», — жартуе адзін мой сябра, але яму не ўдаецца схаваць хваляваньня. Падпішам «Ленін думае пра Беларусь» і паставім у газэту на першую старонку —да 80-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Я перахопліваю позірк другога сябра: «Ні ў якім разе нельга гэтага рабіць. Гэта брыдка».

Колькі мы ні пісалі пра Леніна, колькі ні пераконвалі сябе ды іншых у антычалавечнасьці самага чалавечнага чалавека, а ён, бачыш, па-ранейшаму глыбока хвалюе нас. Сядзіць у нас усярэдзіне як доказ таго, што несапраўднае мінулае жыцьцё не прысьнілася нам, і што сапраўды па сутнасьці сваёй было несапраўдным. Сапраўднае — вось яно, без знакамітага ленінскага прышчуру і ўвогуле хоць якой радасьці або чалавечынкі.

Згадайце, якія ўсё ж вясёлыя былі анэкдоты пра Леніна савецкае пары. «Уладзімір Ільліч, сяляне галадаюць. — Няхай салому ядуць. — Дык замычаць жа! — Не замычаць. Я вось слоічак мёду навярнуў і не жужжу».

Побач — афіцыйная прапаганда пачынала свой пажыцьцёвы гіпнатычны сэанс яшчэ ў дзіцячым садку:

Мы прыйшлі ў дзіцячы сад,
Бачым Леніна пагляд,
Добры дзень, дзядуля Ленін,
Прывітацца кожны рад.

Ужо ў пачатку васьмідзясятых такія скарбашукальнікаў трабушылі тады разварочаныя магілы, зьбіралі крыжыкі, абразкі, манэткі. Сёньня ўжо маладзейшыя натхнёна церабушаць ямы ў Курапатах...

Наогул, мае ўспаміны часта зьвязаныя з чалавечымі косткамі на менскіх будоўлях. Да прыкладу, падчас добраўпарадкаваньня ў дварах на Рэспубліканскай вуліцы (сёньня Раманаўская слабада), рабочыя расьцярушылі старадаўнія жыдоўскія могілкі і расставілі чарапы на плоце вакол будоўлі... Сьмех зрабілі... Пасьля гэтага некаторыя мае аднакляснікі гулялі чарапамі ў футбол. Калі я вучыўся ў школе, у многіх менскіх

Сяргей Харэўскі

Менск з птушынае вышыні



Працяг. Пачатак у мінулым нумары.

ГОРАД НА КОСТКАХ

Калі сядзіш на 22-м паверсе, у кавярні самага высокага менскага гатэлю «Беларусь», многія будынкі можна разгледзець нашмат лепей, чым зь зямлі.

Вось проста ўнізе, зьзяе залатымі крыжамі царква Марыі Магдалены, колішні архіў кінафотадакумэнтаў.

Першапачаткова гэта быў будынак лютаранскае кірхі, набыты праваслаўнымі ў 1847 годзе, у 30-я гады, за бальшавікамі, гэта была адзіная дзейная бажніца ў Менску, дзе перахоўвалася шмат царкоўнага ўбраньня й рыштунку з розных менскіх цэркваў. У 1990-м яе вярнулі вернікам, дзякуючы намаганьням дэпутата Вярхоўнага Савету БССР Зянона Пазьняка. Не пасьпелі менчукі пацешыцца з выгляду гэтае царквы на высокім пагорку, як перад ёю пабудавалі з сэлікатнае цэглы цэх хлебазавода. Зрэшты, гэта ўсё ж звычайная менская гісторыя...

У свой час трэба было прыкласьці нямала намаганьняў, каб уявіць сабе, што шэранькі будынак з грувасткімі портыкамі 50-х гадоў насамрэч — царква. Пра гэта нагадвалі толькі зграбная брама зь лязурнаю цыбулінкай уверсе і вялікія Старажоўскія могілкі зь безьліччу старасьвецкіх крыжоў зь «яцямі». У 1984 годзе зрылі й могілкі, надмагільлі пусьцілі на шчабёнку, альбо на броўку для тратуараў.

Пракладку цераз могілкі шашы запраектаваў архітэктар Шыдлоўскі, які бадай толькі гэтым праектам і вызначыўся. Ніколі не забуду ягоныя натхнёныя вочы й імпэтныя доказы таго, што наогул усё трэба зрыць... Як ніколі не забуду й груду костак, якія трамбавалі ў адхоны трасы і пад асфальт дарогі. Дзясяткі юных кватэрах можна было пабачыць людзкія чарапы, прыладжаныя пад начнікі, скарбонкі, альбо попельніцы. Як памятаю, шкілеты не пужалі менскіх дзяцей. Часам магла быць грэбліваcьць, але чыста санітарнага парадку. Памятаю яшчэ адзін матыўчык: «А-а, гэта ж з жыдоўскіх могілак...»

Тады, дзіцём, я часта бачыў у кожным катлаване або траншэі чалавечыя косткі. Вакол кляштараў заўсёды былі вялікія цьвінтары. Надмагільлі не ацалелі, але ледзь не пад кожнай сьцяною засталіся чалавечыя парэшткі. Рабочых гэта звычайна забаўляла. Рыюць, да прыкладу, траншэю пад кабэль, трапляюць акурат на шыхт пахаваньняў, засунуць недапалак у зубы чэрпу і пакладуць паверх кабэля. Празь некалькі гадоў кабэль правяраюць — а па ім чарапы ляжаць зь недапалкамі. Пацеха...

З вакна 22-га паверху старых менскіх могілак ужо не відаць. Адныя ўжо захінутыя новабудоўлямі, другія зрытыя. Вунь відаць шпіль касьцёла Сьвятога Роха... Каталіцкі цьвінтар вакол яго зруйнавалі, калі будавалі «Палац мастацтва». А проста ўніз, за Сьвіслачай, быў татарскі мізар. Часьцяком у ваяроў зь нябожчыкамі прачыналася... не, не сумленьне, а гаспадарліваcьць. Калі руйнавалі жыдоўскія могілкі, то простакутныя чорныя камяні надмагільляў надаваліся для абліцоўкі адміністратыўных будынкаў. Такімі камянямі абліцаваныя парталы былое Вышэйшае партшколы, Дому афіцэраў ды іншых сур'ёзных установаў. За Домам мастацтваў, пад старой бярозай, да сёньня ляжыць груда «будматэрыялу» з мудрагелістымі жыдоўскімі надпісамі...

Летась, калі рамантавалі вуліцу Карла Маркса, рабочыя папраўлялі каменную броўку. Калі яны адвальвалі камень, то на ім добра былі відаць літары эпітафіяў. Пэўна, гэта помнікі са Старажоўкі. З таго часу я імкнуся не наступаць на гранітныя броўкі менскіх тратуараў...

Сяджу на 22-м паверсе, слухаю надрыўны сьпеў расейскае эстраднае зоркі, а ў вушах — скрыгочуць гусяніцы бульдозераў, трашчаць чарапы... Не магу адвесьці вачэй ад гулкае шашы, тутака, проста ўнізе, пад гатэлем «Беларусь»...

СТАРОЕ МЕСТА

... За вакном дождж... За ім цікава назіраць, седзячы на такой вышыні. Патоп! Ацалелая выспачка старасьвеччыны, якой натхняліся сотні падарожнікаў, Сыракомля, Кіркор, Шпілеўскі, аточаная сьцяною дажджу й бэтоннымі хвалямі навабудаў.

Панарама й помнікі Верхняга Места — цэлы пляст у гісторыі беларускага мастацтва, у традыцыі беларушчыны. Сюды, бы магнэсам, цягнула мастакоў адразу па расейскай акупацыі. На адным зь сямі менскіх узгоркаў ацалела ўсё тое, што сьведчыла пра непаўторнасьць нашага лёсу і пра найвышэйшы кшталт цывілізацыі. Малюнкі, гравюры, эцюды Пешкі, Дамеля, Орды, Лявэрня, найбуйнейшых мастакоў свайго часу, адлюстравалі гэты куток краю, поўны рамантычнае элегіі. Нават працы аматараў, такіх, як Герасімовіч, альбо бацька Станіслава Манюшкі, данесьлі да нас трапяткое стаўленьне да кожнае тутэйшае камянічкі. Вежы бажніцаў, сьпічастыя дахі менскага Верхняга Места, нібы мачтавы карабель плылі праз каламутныя хвалі забранага краю. З пачаткам стагодзьдзя абаяльнасьць гэтых старых кварталаў была ўжо клясычнаю. Малюнкі й гравюры Лукомскага, Драздовіча, Альтмана, Воранава, Раманава, стваралі клясычны вобраз старога Менску. Нават панявечанае, ужо глыбока савецкае, Верхняе Места, па-ранейшаму прыцягвала мастакоў. Графічныя й жывапісныя працы Дучыца, Марыкса, Тычыны, Ціхановіча, Волкава, Зайцава, Дударэнкі прысьвечаныя менавіта гэтаму кутку. Цэлая галерэя...

Стары горад цудам захаваўся насуперак лёгіцы самазьнішчальнае менскае прыроды. Памятаю, калі я хадзіў тутака ў школу ў 70-я, то ледзь ня кожны месяц бачыў, як нешта руйнуюць, перабудоўваюць, расчышчаюць. То сьпілуюць старую сасну, то выкалупаюць брук, то сарвуць каваны гаўбец, то вывернуць ацалелы ліхтар. Пазьней ўсё стала на паток: руйнавалі адразу вуліцамі — спачатку з боку Сьвіслачы, пасьля з боку Нямігі.

Яшчэ ў мінулым стагодзьдзі «вясковы лірнік» Сыракомля заўважыў, што ў Менску ўвесь час як наўмысна съціраюцца

трындушкі не маглі не выклікаць іронію. Але побач з гэтым на поўным сур'ёзе распрацоўвалася «дарослая» ленініяна. Гэтак у 82-м годзе ў сваіх дзёньніках, г.зн. — для сябе, Іван Шамякін пісаў:

«Думаю, што многія з нас, савецкіх літаратараў, людзей партыйных, мараць калі-небудзь напісаць вобраз Уладзіміра Ільліча Леніна, кожны ў сваім жанры».

У 86-м выйшаў у свет трэці том Энцыкляпэдыі Літаратуры і Мастацтва Беларусі з аграмадным артыкулам «Ленініяна».

«Вобраз Леніна — самы ўзвышаны і яркі ў народнай творчасьці. Усенародная любоў і павага да правадыра адлюстраваная ў шматлікіх і разнастайных формах і жанрах фальклёру: казках, лірычных песьнях, паданьнях, сказах, прыказках, прымаўках, легендах. Найбольш вядомыя творы беларускага фальклёру пра Леніна — казкі «Ленінская праўда», «Вялікі багатыр»... Галоўная ідэя «Ленінскай праўды» — пашырэньне ленінскага вучэньня ва ўсім сьвеце...»

Праўда, памятаю, у тыя часы, на такія рэчы мы ўжо не зьвярталі ўвагі, як на артыкулы з часопіса «Корея сегодня», дзе «ідэі Чучхе жылі і перамагалі» і над якімі мы адсьмяяліся яшчэ ў канцы 70-х. Іншая рэч, што творы літаратурнай Ленініяны ў той час маглі стаць адпраўным пунктам нацыянальнага пачуцьця, як адзіная даступная для гэтага крыніца. Напрыклад, паэма «Ленін думае пра Беларусь».

На беларускім журфаку чытаўся курс «Ленін — рэдактар», мы сыходзіліся ў палеміцы над ленінскай ацэнкай Беларускай Сацыялістычнай Грамады, цытавалі правадыра ў артыкулах, калі трэба было давесьці нешта неартадаксальнае. Словам, як ні круці, а Ленін жыў, замінаў і дапамагаў, станавіўся нагодаю для сьмеху і

расчараваньня. Прысутнічаў. Узьведзены ў ранг камуністычнага бога, Ленін стаў увасобленай спакусаю — правакацыяй блюзьнерства. Зь яго сьмяяліся, але разумелі, што гэта — сьмяротны грэх.

Аднак вось, зрабіўшы сваё трыюмфальнае шэсьце, цудатворны абраз галоўнага бальшавіцкага сьвятога ператварыўся ў дакумэнтальныя здымкі — у тую праўду, якая гучыць як блюзьнерства. Да той, вядома, ступені, пакуль мы хоць трохі вычуваем у «невменяемым» правадыры — сьвятога.

Маці Божай з Вострае Брамы ніколі ня зьведаць такіх мэтамарфозаў. Яна сёньня вяртаецца — ажываюць радкі колішніх вершаў, ствараюцца новыя. Адрозьненьне ад яе галоўнага савецкага сьвятога — у тым, што для яго непазьбежная пэрспэктыва разьвянчаньня.

«Мама, а хто такі Ленін?» — пытаецца часам сёньняшняе дзіця ў матулі, якая адчувае пры гэтым у глыбіні душы вусьцішны халадок ад раптоўнага разуменьня несапраўднасьці ўсяго свайго ТАГО жыцьця.

Гэтае дзіця, калі вырасьце, ужо наўрад ці стане абараняць свае погляды цытатамі зь Леніна або сьмяяцца з нашых анэкдотаў пра самага чалавечнага чалавека. Яно будзе ведаць не правадыра, а пачвару з дакумэнтальных здымкаў. Разам з тым гэтае дзіця застрахаванае ад блюзьнерства. Яно не рызыкуе абразіць бога. Бо праўду пра Леніна яно будзе вымаўляць без ленінізму ў голасе і слухаць бязь Леніна ў сэрцы.

Вострая Брама

беларускі культурны кантэкст XX ст.

Новы супольны праект «Нашай Нівы» і беларускай рэдакцыі Радыё Свабода: рэпартажы, рэфлексіі, гутаркі — кожную нядзелю на зьмененых хвалях Свабоды. Кожную сераду — паўтор перадачы.

Адсутнасьць кантэксту культуры — гэта адсутнасьць глябальных арыенціраў нацыі. Яна нявечыць нашае жыцьцё і на вялікім і на малым узроўні. Беларусь нібыта сьцьвярджае сябе як незалежная дзяржава, але дзеля чаго гэта робіцца, дзеля чаго тая незалежнасьць — разумее ня кожны. Людзі не задумваюцца над тым, што сувэрэнітэт патрэбны для самабытнага існаваньня нацыі, бо менавіта ў самабытным існаваньні нацыя найлепшым чынам рэалізуе свой патэнцыял, уладкоўвае жыцьцё ў адпаведнасьці са сваімі прыроднымі рысамі характару. Калі народ існуе ў культурным кантэксьце, яму не прыходзяць у галаву розныя самаедзкія, дзікунскія ідэі, ён не азлоблены, а прагны да творчасьці і працы.

Кожную нядзелю на хвалях Радыё Свабода паводле абноўленага раскладу:

RADIO FREE EUROPE
RADIO LIBERTY

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Новыя Хвалі, Пастаянны Час,
Нязьменная Свабода
(ад 26 кастрычніка 1997)

Час	К/Hz	Хвалі
18.00 - 19.30	6170	49
	7155	41
	7295	41
22.00 - 23.30	6095	49
	6170	49
	7155	41
	9750	31
06.00 - 07.00	5995	49
	7295	41
	9750	31

Паштовы адрас: 220005, Менск-5, п/с 111 У 22.00 беларускую праграму можна слухаць у Інтэрнэце: http://www.rferl.org/bd/be/index.html

Заставайцеся са Свабодай!

ўсялякія памяткі мінуўшчыны. Два стагодзьдзі змаганьня з помнікамі... Нават калі помнік існуе фізычна, у Менску ён рэдка выглядае помнікам. Адсюль, з 22-га паверху гатэлю добра відаць апсыду касьцёла і кляштар марыявітак. Сёньня гэта Суворaўская вучэльня. Кляштар базыльянак на Траецкай гары — 2-я савецкая бальніца. Слынная менская турма-«валадарка» — Пішчалаўскі замак. Калісьці белую вежу замка на зялёнай гары менскага гарадзкога вала было відаць аж праз усю вуліцу Інтэрнацыянальную (колісь Валоскую), а сёньня пэрспэктыва вуліцы ўпіраецца ў шэрую спаруду вылічальнага цэнтру Міністэрства ўнутраных спраўаў.

... Сяджу, углядаюся праз мокрае шкло ў свой горад, які там, унізе. Да майго століка падыходзіць чалавек. Ён паляк. Сядае, выбачаецца. Імкнецца загаварыць. Я прыкідваюся нетутэйшым. «Нецікавы горад», — кажа паляк, — «Няма дзе пахадзіць, няма на што паглядзець». Я ківаю на Траецкае прадмесьце. Ён іранічна ўсьміхаецца. Турысты ўвечары туды ня ходзяць.

Пасьля паляк пачынае крытыкаваць Старое Места ў Варшаве, якое было дашчэнту зруйнаванае ў вайну. Маўляў, даўмеліся па вайне будаваць бэтонныя дэкарацыі. Адразу ж відаць што несапраўдныя помнікі. Каму відаць? «Варшавякам», — кажа ён. А мне, кажу я, не відаць. Мне ў Варшаве было і на што глядзець, і дзе прытуліцца. Выпадковы сусед па століку нарэшце сыйшоў...

Цэнтар Старога Места ў Менску, у адрозьненьне ад Варшавы, у часе вайны ацалеў. Яго зьнішчалі нашмат пазьней, проста на маіх вачах. Адначасова ў сьвядомасьць людзей заганяўся стэрэатып пра цалкам зруйнаваны ў вайну горад.

Вунь там, перад Сьвята-Духавым саборам, стаяў двухпавярховы старасьвецкі дамок. Ён падкрэсьліваў маштаб гары. Сабор, які ўзвышаўся па-над ім, здаваўся яшчэ больш велічным. Гісторыкі дазналіся, што гэты дамок — аптэка пачатку 18 стагодзьдзя. Прыдумалі прыгожы праект рэстаўрацыі. Плянавалася зрабіць музэй. У той жа год мэтрабудаўцы зьнішчылі гэты помнік. Паставілі там вэнтыляцыю мэтро. Ня зьлева, ня справа, а менавіта тут... Звычайную менскую камянічку ламалі два тыдні — надта ж таўшчэзныя аказаліся сьцены, надта ж глыбокія былі лёхі. Калі ўпаў дах, з гарышча пасыпаліся старасьвецкія, яшчэ часоў Рэчы Паспалітае, кнігі. Запомніўся мне адзін аграмадны фаліянт з нотамі для аргана. Рабочыя яго паднялі на рыдлёўкі і ўчатырох некуды зьнесьлі.

Ці варта адбудаваць стары Менск наноў?

Пасьля вайны, напрыклад, у Нямеччыне розныя гарады напаткаў розны лёс. Сацыялістычны Бэрлін ператварылі ў сацыяльны палітычны мэмарыял. А ў Заходнім Бэрліне паўразбураны бомбамі, учарнелы ад дыму гатычны касьцёл пакінулі як помнік, і падсьвятляюць па начах. Тое самае, дарэчы, у Менску хацелі зрабіць з абгарэлым Спаса-Праабражэнскім саборам, былым касьцёлам бэнэдыктынак, што стаяў зьлева ад кінатэатра «Перамога». Хацелі пакінуць як помнік «нямецкаму варварству», але самі даруйнавалі ўсё дашчэнту... У Заходнім Бэрліне доўгія гады і рэйхстаг стаяў без славутага срэбнага купала, сьпісаны зьнізу дагары пераможцамі. Урэшце немцам гэтая нэкрафілія абрыдла, і рэйхстаг аднавілі ва ўсім былым харастве... А ва Ўсходнім Бэрліне рабілі амаль як у Менску — зьнішчылі дарэшты сотні помнікаў, панатыкалі новабудоўляў.

У Кёльне, спляжаным саюзьніцкімі бамбардоўкамі, адразу ўзяліся за аднаўленьне. Вядома, не такімі тэмпамі, як у сацыялістычнай Польшчы, але грунтоўна. І ёсьць чым ганарыцца. Як пісаў часопіс «Гутэн Таг»: «Паўсталыя з руінаў раманскія касьцёлы Кёльна сталі яшчэ прыгажэйшымі». Такім чынам, пытаньне, ня ў тым, ці аднаўляць, а ў тым, як аднаўляць.

... Гляджу — вунь сьвеціцца толькі што адноўленая каталіцкая Катэдра. Калі я хадзіў там штодзень у школу, я ня мог ведаць, што ўнікальны помнік барока, былы езуіцкі касьцёл, існуе. Гэтая бажніца ў мінулую вайну ацалела цудам. Але ў 1954 годзе гэты помнік зьнявечыў запрошаны зь Ленінграда архітэктар Драздоў. З таго часу гэта быў спартовы комплекс «Спартак».

Насталі іншыя часы. У 1984 годзе быў распрацаваны дэтальны плян аднаўленьня Верхняга Места ў Менску. У барацьбе за рэстаўрацыю старасьвеччыны выросла цэлае пакаленьне змагароў за незалежную Беларусь. Тымчасам пра спадчыну забыліся. А за што змагаліся?

Помнікі не йснуюць самі па сабе. Помнік — гэта тое, што йснуе толькі ў нашай сьведамасьці і ў чым мы пераканаем нашых нашчадкаў. Калі помнік патрэбны нам — мы маем падставы яго аднавіць такім, якім ён існуе ў нашай сьведамасьці. І мы адновім менскую Ратушу, якую зруйнавалі на загад Мікалая II, бо яна, маўляў, «нагадвала аб былых вольнасьцях»... І царкву Сьвятога Духа, шматкроць панявечаную расейскімі акупантамі і ўзарваную бальшавікамі ў 1937-м. І будынак тэатру, дзе была пастаўленая першая беларуская опэра, які зруйнавалі ўжо на маіх вачах у 1986 годзе. Напэўна, калі мы ўсё гэта адновім, мне будзе цікавей у Менску. Як і таму паляку — знойдзецца, на што паглядзець. І я буду сядзець не пад аблокамі, на 22-м паверсе гатэлю «Беларусь», а там, у тым горадзе, які жыве пакуль толькі ў маіх летуценьнях. Не сярод птушак, а сярод людзей.

ЖЫЦЬ ВЕЧНА

Адам Глёбус. Койданава. — 1997

Вельмі лёгка заўважыць непасрэдную сувязь паміж характарам літаратуры і матэрыяльным утрыманьнем. Хто аплочвае друк, той, як кажуць, і замаўляе музыку. Ад пачатку літаратурныя выданьні — несамаакупныя. І калі плоціць улада, тады й густы літаратараў мусяць быць такія, як ва ўлады, якая сёньня трымае курс на рэсаветызацыю. Па-мойму, савецкі дух нашых пісьменьнікаў вытлумачваецца менавіта гэтым. Тыя ж выданьні, якія змушаныя самі адшукваць сродкі, маюць, вядома, тысячу і адну СВАЮ загану. Вось толькі саветчыны ў гэтым пераліку няма.

Сьвежы прыклад такой літаратуры — новая кніга прозы Адама Глёбуса «Койданава».

Адам Глёбус хоча жыць вечна, нават пасьля сьмерці. І каб тыя людзі, якіх ён ведаў у дзяцінстве і якіх ужо няма, працягвалі жыць сваімі клопатамі і выяўляць свае непаўторныя характары. І каб мястэчка Койданава, дзе ён нарадзіўся і гадаваўся, не прападала зь ягонага далягляду, нават калі яму ніколі больш не давядзецца туды паехаць. Урэшце, гэта ж трэба паехаць. І абавязкова ў чым-небудзь расчаравацца. Бо ўсё ня так, як было ў тваім дзяцінстве. А як зрабіць, каб, ня езьдзячы, апынуцца там, у Койданаве і дзяцінстве, нават калі ў гэтую хвіліну ты ляціш у Бангкок, або з Барсэлёны, або проста шпацыруеш па Менску. Як можа ўсё гэта існаваць, калі яно даўно скончылася? Ведама, ва ўспамінах. Толькі ж успаміны хутка сьціраюцца. А Адам Глёбус хоча жыць вечна. І ён піша кнігу, дзе ягонае Койданава разам з койданаўцамі і самім Адамам Глёбусам ператвараецца зь мінулага ў пэрыядычнае. Вось надзеў некалі Іван Мілько абедзьве шкарпэткі на адну нагу. Усе пасьмяяліся і забыліся. А цяпер Іван Мілько будзе раз за разам надзіваць свае шкарпэткі і ўсе будуць сьмяяцца — пэрыядычна. Пяць разоў, сто разоў, мільён разоў. Мільярд разоў будзе тануць самая прыгожая ў Койданаве дзяўчына Валя, трыльён разоў будзе псавацца ад гэтага местачковае беларускае вясельле. І калі нейкі іншы Іван Мілько ў Докшыцах ці Лунінцы надзене на нагу абедзьве шкарпэткі, то ўсе мусяць сьмяяцца і дадаваць: «Ды ён проста як Іван Мілько з Койданава»...

Гэтак Адам Глёбус стварае вобраз беларускага мястэчка. Такі вобраз быў у нас перад вайною і да рэвалюцыі. Але пэрсанажамі местачковых анэкдотаў выступалі амаль адныя жыды, якіх у мястэчках было да 90 працэнтаў насельніцтва. Жыды стварылі цэлую местачковую культуру ў Беларусі і на ўсіх абшарах Вялікага Княства Літоўскага. Але ў вайну жыдоў выбілі немцы, а найбольш яркіх беларускіх пэрсанажаў пазабівалі бальшавікі. Спатрэбілася 50 гадоў, каб пачала завязвацца новая, ужо без жыдоў, беларуская местачковая культура. Яна — як неабходная зьвязка паміж спрадвечнай нашай вясковай культурай і беларускім горадам, якога яшчэ няма.

Вядома, усе гэтыя 50 гадоў жылі сваім жыцьцём нашыя мястэчкі і пісалі свае кнігі пісьменьнікі. Але мястэчкі мусілі перажыць свае страты, забыцца на вынішчаных сваіх жыхароў, прывыкнуць да людзей, якія прыехалі на месцы забітых зь вёскі і з Расеі, нарадзіць новых, уласных дзяцей, якія здолеюць пісаць кнігі. А нашыя пісьменьнікі ўвесь гэты час думалі пра літаратурны працэс і пра сацыялістычны рэалізм, які адмаўляе вечнае жыцьцё. Вось чаму яны не напісалі кнігу пра Койданава або Лепель, або Мазыр, дзе б местачковыя гісторыі разам са сваімі героямі з простых здарэньняў ператварыліся ў здарэньні пэрыядычныя. Дарэчы, з-за гэтага і самі пісьменьнікі не засталіся ў вечнасьці, як і іхныя творы.

Адам Глёбус зрабіў вельмі простую, але разумную справу. Гэта ж можа зрабіць кожны, каму Бог даў хоць крупіну таленту —апісаць здарэньні і людзей свайго роднага мястэчка. І ўсё, што апісанае, застанецца жыць нават пасьля сьмерці. Бо колькі будзе жыць сьвет, Іван Мілько будзе губляць сваю шкарпэтку і, нікуды ня дзенесься, будзе тапіцца прыгожая Валя. Хоць... Можа быць, прачытаўшы пра Валю, нейкая іншая Валя зь іншага мястэчка, неяк і засьцеражэцца ад вернай пагібелі і перахітрыць свой лёс.

Дзіўна, што дагэтуль ніхто ў Беларусі не напісаў такую кнігу. Здаецца, усе толькі пра такое і распавядалі, колькі заўгодна ў нас характараў і выразнага рэгіяналізму, але за характарамі не паўстае цэльны вобраз паселішча, а паселішча асацыятыўна не навязваецца да характараў сваіх насельнікаў. Фігуральна кажучы, такую кнігу можна зрабіць з кніг ці ня кожнага нашага шматтамовага празаіка, выкарыстоўваючы нажніцы і клей. Але гэта ўжо будуць іншыя творы іншых аўтараў.

Крыт.

Спытайма пра Магілёў

Магілёўская даўніна ў пытаньнях і адказах. 730-й гадавіне горада Магілёва прысьвячаецца. — А.Агееў, І.Марзалюк, І.Пушкін. — Магілёў, 1997. — С.192. — Наклад 500 ас.

Можа быць, гэта адна з самых удалых кніг па гісторыі, якія выйшлі сёлета. Выйгрышны сам па сабе жанр — пытаньні і адказы. Дыялёг прадугледжвае шчырасьць; галоўнае, каб былі шчырымі пытаньні. Жанр дыялёгу ў беларускай літаратуры XX ст. мае бясспрэчныя посьпехі, якія прызнаныя вехамі ў нашай гістарыяграфіі. Напачатку гэта былі каталіцкія катэхізмы («Хто гэта ёсьць Бог?»), потым — знакаміты твор В.Ластоўскага «Што трэба ведаць кажнаму беларусу?», далей — ня менш вядомыя «100 пытаньняў і адказаў па гісторыі Беларусі». Посьпех кніг у пытаньнях і адказах падобны да посьпеху кампутарных гульняў —па сутнасьці, гэта той самы двухбаковы працэс, размова двух. Ня будзе дзівам, што хутка зьявяцца іншыя «дыялёгавыя» працы. А пакуль праглядзім «Магілёўскую даўніну».

Пытаньняў у ёй 112. Для прыгажосьці некаторыя можна было б аб'яднаць, каб атрымалася «сотка», але аўтараў (А.Агееў, І.Марзалюк, І.Пушкін) гэта чамусьці не прывабіла. Храналягічныя рамкі кнігі — ад жалезнага веку да 1917 г., але абяцаецца і другая частка працы, прысьвечаная пазьнейшым падзеям. Пытаньні, якія задаюць аўтары, адлюстроўваюць сёньняшнюю цягу да такіх праблемаў, як культура, рэлігія, вайна, любоў і сьмерць. Не стае, бадай што, праблемаў сэксу (напрыклад, «Колькі было ў дарэвалюцыйным Магілёве дамоў цярпімасьці?»), таксама даволі папулярных у сучасным друку. Аўтары добра ведаюць пра пошасьці тыфу і халеры ў Магілёве, пра апошнюю нават — год, калі яна зьявілася ў горадзе (1831 г.). Застаемся з надзеяй, што аўтары знойдуць зьвесткі і пра тое, калі «парадавалі» магілёўцам пранцы і AIDS. Але і прыемных зьвестак у кнізе багата.

Структура працы прадуманая. Пытаньні задаюцца ў храналягічна-тэматычным парадку. Ёсьць кароткія артыкульчыкі з канкрэтнымі пытаньнямі-адказамі. Яны перамяжоўваюцца з даволі вялікімі нарысамі, дзе аўтары маюць магчымасьць паказаць ня толькі сваю эрудыцыю, але й літаратурныя здольнасьці. А каб чытаць кнігу было яшчэ больш прыемна, зьмешчаныя шматлікія малюнкі і дарэвалюцыйныя фота. Здавалася б, у кнізе ёсьць калі не пра ўсе падзеі з гісторыі дарэвалюцыйнага Магілёва, дык амаль пра ўсё. Але ж...

На тытульным аркушы кнігі пазначана, што яна прысьвечаная 730-й гадавіне Магілёва. Такім чынам, можна падлічыць, пад якім годам упершыню згадваецца горад. Самі аўтары пра гэта чамусьці адмаўчаліся, а гэта варта было вынесьці ў асобны артыкул. Далей пытаньні ідуць паводле храналёгіі, і раптам прагал — зьніклі ўсе зьвесткі, якую ролю адыграў Магілёў у войнах з Маскоўскай дзяржавай у XVI-XVII ст. Дзякаваць Богу, што ў кнізе хоць прыгадваецца вайна 1654-67 г., нават з эпітэтам «жудасная», але што гэта была за жудасьць? Затое шмат месца адведзена падзеям Паўночнай вайны 1700-21 гадоў і вайны 1812 году. Гэтыя разьдзелы маюць узважаны характар. Аўтары знайшлі добрыя словы для прадстаўнікоў абодвух бакоў у падзеях 1812 году — і для францускага маршала Даву, і для расейскага генэрала Раеўскага. Нэўтральна пададзеныя зьвесткі пра магілёўскага праваслаўнага япіскапа Варлаама, які з клірам прысягнуў Напалеону. Суд над ім аўтары вырашылі перанесьці ў будучыню, калі будзе грунтоўна дасьледаваная гэтая праблема.

Крыху дзіўна, на першы погляд, выглядае пытаньне «Магілёўшчына — край беларусаў?» Але не самім жа сабе даказвалі гэта навукоўцы-аўтары! Даводзілі, вядома, сучасным магілёўцам, якія... Хто іх ведае, ці беларусамі яны сябе лічаць. Яшчэ адно аналягічнае пытаньне — «Ці жылі ў Магілёве яўрэі?» апынулася не на сваім месцы, бо перад гэтым аўтары шматкроць і досыць падрабязна распавядалі пра магілёўцаў-жыдоў. Пра іх ёсьць у кнізе і замалёўка з падзеяў 1812 г. У час знаходжаньня французаў у Магілёве жыды намагаліся ў размовах пазьбягаць расейскае мовы і гаварылі пераважна па-польску. Калі ўлада перамянілася, сталі размаўляць па-расейску. Простыя людзі, як і беларусы, «тутэйшыя».

Адзначым яшчэ некалькі пытаньняў, якіх не стае ў кнізе: калі Магілёў апынуўся ў Расейскай імпэрыі, чаму ў XVI — першай палове XVII ст. быў росквіт гораду, а ў XVIII ст. — заняпад, і што гэта за дзіўная трыюмфальная арка стаіць цяпер на вул. Першамайскай? Лёгіка выкладаньня гісторыі горада падказала аўтарам неабходнасьць злучыць яе з гісторыяй краіны. Такая сувязь праглядаецца шмат у якіх артыкулах. Знайшлі месца і проста пытаньні з агульнай гісторыі Беларусі, накшталт: «Хто выратаваў Беларусь падчас Паўночнай вайны?»

Аўтары сьмела бяруцца за вырашэньне складаных праблемаў гісторыі Беларусі — і гэта ім удаецца. Адначасова заўважны і цьвярозы падыход да гэтай справы, нават сьціпласьць. У Беларусі шмат гісторыкаў, якія пра гандаль сярэднявечнага Магілёва напісалі б так: «Магілёўскія тавары прадаваліся ў Эўропе». Гэта сьвятая праўда. Але яна непрыймальная аўтарамі гэтай кнігі, якія робяць удакладненьне: «У Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе», адсякаючы Заходнюю. І гэта праўда, толькі больш праўдзівая, і, здаецца, яна не пашкодзіць слаўнаму гораду Магілёву і ўсёй Беларусі.

У канцы кнігі зьмешчаныя сьпісы памятных датаў на кожны з 1997-2001 гадоў. Гэта вельмі зручная рэч для нашага багатага на юбілеі часу. Можа, спатрэбіцца для нейкіх «гуляньняў», а не — дык і проста чытачу будзе цікавай. Пачакаем выхаду другой часткі кнігі. А раптам зьявіцца і трэцяя, пра XVI-XVII стагодзьдзі?

Валеры Пазьнякоў

Усе беларускія фільмы

Все белорусские фильмы. Том 1. Игровое кино (1926-1970). Каталог-справочник. На расейскай мове. Аўтары-складальнікі Ігар Аўдзееў, Ларыса Зайцава. — Менск: Беларуская навука, 1996

Калі Беларусі з чым і пашэнціла за дзясятак-паўтара апошніх гадоў, дык гэта, напэўна, з даведнікамі. Чаго толькі ні пасьпелі навыдаваць — і «Зборы помнікаў», і «Эцыкляпэдыю Літаратуры і Мастацтва», і «Этнаграфію», і «Археалёгію», і «Беларускіх пісьменьнікаў», і нават «Беларускую Энцыкляпэдыю» ў васямнаццаці тамах выдаюць дагэтуль. Што б там ні было добрага альбо дрэннага ў гэтых энцыкляпэдыях і даведніках — што б там ні накруцілі нашыя навукоўцы з ідэалёгіяй ці з самімі фактамі, як бы ні парэзалі-папсавалі сучасныя ўжо цэнзары, але нават намінальнае існаваньне гэтага корпусу даведкавай літаратуры замацоўвае факт прысутнасьці Беларусі ў сьвеце як дзяржавы, як геапалітычнай, а таксама інфармацыйнай, культурнай, тэкставай прасторы.

Сярод апошніх выданьняў гэтага жанру — каталёг-даведнік «Все белорусские фильмы», першы том якога ахоплівае беларускае ігравое кіно ад пачатку, за які аўтары лічаць 1926 год, і да 1970-га. Складальнікі паспрабавалі абмежавацца чыстай інфармацыяй, унікаючы «неаб'ектыўнасьці» — прыводзяцца зьвесткі пра стваральнікаў фільма, жанры, захаванасьць стужкі ды інш. Чамусьці няма інфармацыі пра мову фільма — нягледзячы на тое, што назвы прыводзяцца ня толькі па-расейску, але й па-беларуску ды па-ангельску, складаецца ўражаньне, што ўсе фільмы гучалі на «вялікім і магучым», хоць гэта зусім не адпавядае рэчаіснасьці. Якраз дзеля аб'ектыўнасьці й было б варта параўнаць колькасьць беларускамоўных беларускіх фільмаў у розныя гады.

Асабліва цікавымі атрымаліся аўтарскія анатацыі ды вытрымкі з крытычнае прэсы й манаграфіяў. Але й тут паўстае некалькі пытаньняў. Ніякай уласнай ацэнкі творам аўтары не даюць прынцыпова, а цытаты з рэцэнзіяў выглядаюць хутчэй яскравымі ілюстрацыямі часу, чым ствараюць уражаньне аб мастацкай вартасьці стужак, шмат зь якіх ужо немагчыма сёньня ўбачыць. Таму скласьці ўяўленьне пра сапраўдны ўзровень беларускага кіно ў розныя пэрыяды даволі складана: зьвесткі пра ўзнагароды ці крытычныя «разносы-даносы» — ня вельмі аб'ектыўныя крыніцы. Адзнакаю значнасьці фільма застаецца, бадай, колькасьць прыведзеных цытатаў. Але — наколькі ўсё ж «безацэначныя», як пазначаюць іх аўтары, іхныя анатацыі? («... Кавалерийская часть преследует остатки белогвардейской банды...», «... Вместе со своим помощником подкулачником Павлюком Круковский поджигает конюшню», «... Фильм в символической форме рассказывает об истории белорусского народа, его многовековой борьбе за свое освобождение... Завоевания советской власти приходится защищать от многочисленных врагов: немцев, Белорусской добровольческой армии Булак-Балаховича, поляков. Рада БНР отбирает у крестьян землю, продает в Европу строевой корабельный лес.») Бадай што, пазбавіўшыся эстэтычных ацэнак, аўтары, магчыма й міжволі, але пакінулі ацэнкі ідэалягічныя (ці, хіба, клясавыя?). Праўда, супярэчнасьці ды хібы даведніка можна аднесьці на рахунак малога досьведу падрыхтоўкі падобных працаў і, што было б больш слушна, — істотнага недахопу зьвестак пра фільмы й працу над імі. Сапраўды, стужкі, што былі прызнаныя «шкоднымі», зьнікалі, інфармацыя пра іх засакрэчвалася, а часам зьнішчалася. З сумам можна заўважыць, што ў артыкулах пра многія фільмы дваццатых-трыццатых гадоў пазначана: «ня выйшаў на экраны», «не захаваўся»... У гэтым пляне даведнік дае шмат маладаступнай інфармацыі.

Прынамсі мяне, аднак, асабліва зацікавіла магчымасьць, нават і праз гэтыя не зусім дасканалыя пераказы прааналізаваць свайго роду «гісторыю сюжэтаў» — даведнік найлепш паказвае дыяхранічную карціну разьвіцьця беларускага кінематографу менавіта з боку таго, ня «як здымалі», а «пра што здымалі». Сапраўды, пераконваесься, што кіно было «найважнейшым з мастацтваў» і ад самага пачатку савецкага рэжыму актыўна спрыяла складаньню й замацоўваньню ў сьвядомасьці чарговых ідэалягічных парадыгмаў і карысных для ўлады мітаў.

Першы пэрыяд — дваццатыя, пачатак трыццатых, гэта час барацьбы з «памешчыкамі» і «белапалякамі». Ужо фільм Юрыя Тарыча «Лясная быль», які пачынае адлік гісторыі беларускага кінематографу, задае гэтую тэму. Герой — ці гэта Кастусь Каліноўскі, ці які-небудзь Міхась Аса з «Хвоі гамоняць» — гэта, звычайна, адважны атаман, гэткі беларускі Зора. Нават тэма будаўніцтва «новага жыцьця» саступае пакутам сялян-беларусаў у Заходняй Беларусі ды спрытным штучкам камуністаў-падпольшчыкаў. Але надыходзіць разгром «нацдэмаў» і на першае месца выходзіць вораг-шпіён. Уся Беларусь, якая пераважна складаецца з «глухіх палескіх балот», кішыць шпіёнамі і шпіёнкамі, сабатажнікамі, прыхаванымі кулакамі й здраднікамі. Вельмі папулярным становіцца сюжэт, дзея якога «разгортваецца падчас магчымай вайны». Цікава, але перад самай вайной тэма вайны сыходзіць на дальні плян — «белапалякаў» ужо ня стала, а сапраўдны патэнцыйны супраціўнік да часу ператварыўся ледзь ня ў першага прыяцеля. Пачынаючы з канца трыццатых і аж да сярэдзіны пяцідзясятых у беларускім кіно пануюць экранізацыі тэатральных спэктакляў. Перад вайной — Чэхаў («Мядзьведзь», «Мянтуз», «Маска», «Чалавек у футарале» — цэлы збор твораў). Пасьля вайны — час беларускай драмы: «Паўлінка», «Пяюць жаваранкі», «Хто сьмяецца апошнім», «Несьцерка». Нягледзячы на цікавыя акторскія працы, гэта па сутнасьці й не кіно ўвогуле. З гэтага ж часу пачынае разгортвацца генэральная тэма — татальнае змаганьне народа ў «вялікай айчыннай вайне». Міт пра гэта, пра «партызанскую рэспубліку», у значнай ступені створаны і ўбіты ў галаву менавіта праз кіно, рукамі не абы-якіх майстроў — Турава, Дабралюбава, Рубінчыка. Літаратурны матэрыял ішоў таксама якасны — творы Быкава, Адамовіча. Вынік таленавітай самаадданай працы, я маю на ўвазе сацыяльны вынік, — у нашым сёньня. І яшчэ цікавая дэталь — за некалькі дзесяцігодзьдзяў ледзь не адзіны фільм пра беларускую гістарычную даўніну, гэта «Я, Францыск Скарына...», зьняты ў 1969-м. І той — правальны.

Ды ўвогуле, прачытаўшы ўсю кнігу, я зразумеў, — менш за ўсё мне хочацца паглядзець тыя фільмы, якія бліжэй да нас па часе. Настальгіі няма.

Вацлаў Арэшка

Луіджы Пірандэла

ПАРА ЖАЎРУКОЎ

Лука Пэлета не пазнаў бы на рымскім вакзале Санці Курао, калі б той ня кінуўся да яго з крыкамі:

— Дружа Пэлета! Дружа Пэлета!

Ачмурэлы ад падарожжа, пасярод сумятні і натоўпу пасажыраў, ад чаго круцілася галава, ён застыў і глядзеў на яго аслупянела:

— О, гэта ты, Санці? Як жа гэта? Вось так...

— Пра што гэта ты?

— Quantum mutatus ab illo!¹

— Што за abillo? Гады, дружа Пэлета!

— Гады, праўда, але ж... — Лука зірнуў на яго ў сьвятле электрычных сьвяцільнікаў. Гады? А гэтая вопратка? Вялікі маэстра-музыкант у гэтай кашулі, пінжаку, у гэтых портках і чаравіках? Значыць, жыве ў беднасьці? А гэтая недагледжаная барада, ужо амаль зусім сівая, што парасла больш на шчаках, чым на падбародзьдзі? А гэты твар, бледны і тлусты? А гэтыя падпухлыя кругі вакол вадзяністых вачэй? Што здарылася? Ды й ростам ён стаў ніжэйшы?

Пад позіркам Лукі Пэлеты, поўным зьдзіўленьня, вусны Курао выцягнуліся ў нямой грымасе:

— Ты багаты, дружа Пэлета, і час цябе не руйнуе. Хадзем, хадзем! Але давай дамовімся: ні слова пра мізэрнае месца, дзе я і ты мелі няшчасьце нарадзіцца. Хто жывы, той жывы, хто мёртвы, той мёртвы: не хачу нічога пра гэта ведаць. Ня трэба браць экіпаж: я жыву тутака ў канцы алеі. Давай мне валізу або скрынку.

— Не, дзякуй, сам данясу, яны зусім ня цяжкія.

— А багаж ты пакінуў у захавальні на вакзале?

— Які там багаж? — гукнуў Лука Пэлета. — Са мной толькі гэтыя два клункі: кнігі й бялізна.

— Значыць, ты прабудзеш тут мала?

— Не, чаму ж? Магчыма, я прыехаў назаўсёды.

— Вось так, з пустымі рукамі?

Яны ішлі пэўны час у маўчаньні.

— А твая сыньёра? — рызыкнуў урэшце спытаць Лука.

Курао схіліў галаву і прамармытаў:

— Я сам.

— Яна зьехала з Рыму?

— Яна ў Рыме, дружа Пэлета. Раскажу дома. Цяпер пагаворым пра цябе. Але давай бяз хітрыкаў, вось як. Чаму ты прыехаў у Рым? Ну і чмо ж я. Забыўся, што ў цябе грошаў куры не дзяўбуць.

— Памыляесься... — паправіў яго Пэлета з дабрадушнай усьмешачкай. — Сапраўды, штосьці маю, мне хапае, але й трэба мне мала. Няма што дзяўбсьці. А вось, што праўда, дык я цяпер урэшце сам сабе гаспадар. Ледзь-ледзь усё ня ляснула, ведаеш? На дзіва, беднасьць не пастукалася ў нашыя дзьверы. Але ўрэшце паўтараю, я цяпер вольны і гаспадар...

— ... сам сабе. Добра. Але, калі ты не такі ўжо багаты, то чаму прыехаў у Рым?

— Бачыш! — уздыхнуў Лука, зноў таямніча прыплюшчваючы вочы. — Гэта мой горад. Я заўсёды яго сьніў.

— Дружа Пэлета, я нешта падазраю, — паўтарыў Санці Курао. —Клянуся: ты хлусіш. Скажы праўду, ты бяднейшы за мяне?

— Не, чаму ж? — інстынктыўна выгукнуў Лука, і адразу спахапіўся — Магчыма, не...

— Гэтае ТВАЁ, хаця б намякні, на колькі пацягне?

— Прыбытачак сьціплы, але надзейны: пяць ліраў на дзень. Мне хапае.

Санці Курао зарагатаў, матаючы галавой.

— Сто пяцьдзесят ліраў на месяц? І што ты зь імі робіш?

Яны дайшлі да канца алеі, Курао зазірнуў у браму дому і перш, чым увайсьці, сказаў Луку:

— Прашу размаўляць у паўголас.

Пакойчык мізэрны, бруднаваты, у беспарадку, з ложкам у кутку, не перасьцеленым даўным-даўно; просты столік без абрусу, побач з адзіным вакном, вешалка на сьцяне, плеценыя крэслы, умывальнік.

Санці Курао запаліў сьвятло на століку і запрасіў сябра сесьці.

— Калі хочаш памыцца, усё, што трэба, тут.

— А... люстра ў цябе няма? — здушана спытаў Лука, разгублены ад такой бядоты, разглядаючы навокал пыльныя сьцены.

— Плачу дванаццаць ліраў на месяц, дружа Пэлета, і мяне не паважаюць. Час ад часу даю ўрокі музыкі, і мне ня плоцяць; надыходзіць канец месяца, і я не плачу; а чым больш не плачу, тым менш мяне паважаюць. Тамака, каля ручніка, было люстра, калі не памыляюся. Яго зьнесьлі.

— Дык як жа ты глядзісься? — спытаў уражана Лука.

— Ды я пра гэта й ня думаю!

— Гэта кепска, Санці! Таму што фізычны бок...

— Сапраўдны фізычны бок — гэта хлеб, дружа Пэлета! — рэзка падвёў рысу Курао.

— Э-э, дык жа не, не... — гукнуў Лука. — Non solo pane vivit homo...²

— А ўсё ж, — заключыў Санці, — ў першую чаргу нам трэба хлеба. Не кажы больш глупстваў ды яшчэ на лаціне.

Яны надоўга паглыбіліся ў пакутлівае маўчаньне. Санці Курао сядзеў ля століка, схіліўшы галаву і ўтаропіўшыся ў падлогу. Лука Пэлета, выпрастаны, як заўсёды ў жыцьці, насупіўшыся, уважліва разглядаў яго.

— Ну дык... твая сыньёра?

Курао падняў галаву і пэўны час глядзеў у вочы сябру.

— Тутака вось мая сыньёра! — ён урачыста зьняў з галавы капялюш, некалькі разоў пастукаў сябе па шырокім лбу, асьнетленаму лямпай:

— Бачыш? Алень! — крыкнуў ён, і тоўстыя бледныя вусны, выцягнуўшыся ў страшнай грымасе, адкрылі сьціснутыя зубы, жоўтыя ад доўгага галадаваньня.

Лука Пэлета глядзеў на яго, зьбіты з панталыку, няўпэўнена вынучаючы выраз твару Курао, каб зразумець — ці трэба съмяяцца, ці не.

— Алень! Алень! — паўтараў Санці і не пераставаў ківаць галавой ў пацьверджаньне гэтага. — І гэта ня я вытурыў яе, ведаеш! Яна сама сышла, сама. Я вось такі, — дадаў ён, ухапіўшыся абедзьвюма рукамі за шчаціньне, што парасло на шчаках, — але мая жонка прыгожая і вельмі паважаная сыньёра! Галота, дружа Пэлета. Ня будзь галоты, яна, магчыма, і не зрабіла б так. Яна ж у прынцыпе была нікчэмная. Папраўдзе для яе я быў толькі ўзорны муж: прыносіў ёй усё, што зарбляў... па-за пейкім грошам, каб зьвесьці канцы з канцамі. Але ж на самой справе мужык, якой бы сьвіньнёй ён ня быў, заўсёды варты ў тысячу разоў болей за любую жанчыну. Ты скажаш, што не, дружа Пэлета? Хаця, хто ведае? Магчыма, гэта й ня так. Цяжка сказаць. Галота, разумееш? Што робіцца з жалезьзем у вагні? Яно выкрыўляецца. Дык вось, і ты, муж, таксама даходзіш да таго, што кажаш сваёй жонцы: «Ты наставіла мне рогі? Здабыла на хлеб? Так? Ну дык і добра зарабіла! Дай жа кавалачак і мне!»

Ён падняўся і пачаў крочыць па пакоі, апусьціўшы галаву на грудзі і з рукамі за сьпінаю.

— А цяпер... што яна робіць? — нясьмела спытаў Лука.

Курао працягваў крочыць, нібыта не пачуў пытаньня.

— Ты ня ведаеш, дзе яна?

Курао спыніўся перад лямпай:

— Пайшла ў прастытуткі! — сказаў ён. — Ня будзем марнаваць дарма газу! Памыйся, калі лічыш гэта сапраўды неабходным. І пойдзем у горад. Ня хочаш павячэраць?

— Не.. — адказаў Лука. — Я павячэраў у Нэапалі дастаткова добра.

— Я табе ня веру.

— Слова гонару. Скажы ў двух словах, як я табе?

— Шкода цябе, дружа Пэлета!

— Не кажы! Табе здаецца, што я кепска выглядаю з твару?

— Не, яшчэ не здаецца, — гукнуў Санці.

— М-да, — пагадзіўся Лука, — на самой справе, мне вельмі пасуе есьці няшмат. Але можа я трошкі бледны сёньня, не?

— Ты бледны, таму што бедны! — выбухнуў Курао. — Давай, хадзем! Ты, пэўна, хацеў бы паглядзець на Калізэй у месяцовым сьвятле.

Лука з энтузіязмам прыняў прапанову, і яны рушылі моўчкі.

Перад парогам дому Пэлета прытрымаў за руку сябра, потым ляпнуў яму далоняй па сьпіне і сказаў, заплюшчыўшы вочы:

— Санці, мы не здамося! Паспадзявайся на мяне!

— Ды супакойся ты... — прабурчэў Курао. І абодва растварыліся ў цемры.

Пераклаў з італьянскай Валеры Буйвал

¹Колькі ўсяго зьмянілася з тае пары (лацінск.).

²Ня хлебам адзіным жыве чалавек (лацінск.).

ЛУІДЖЫ ПІРАНДЭЛА (1867-1936), італьянскі пісьменьнік і драматург. Аўтар раманаў «Адзін, ніводзін і сто тысячаў», «Нябожчык Мацій Паскаль», п'есаў «Шэсьць Пэрсанажаў у пошуках Аўтара», «Сёньня ўвечары імправізуем», «Знайсьціся», шматлікіх навэлаў.

Luigi Pirandello. Un'altra allodola. — La giara. Milano, 1992.

Нобэль жыў! Нобэль жывы! Нобэль будзе жыць!

(Наш адказ лордам Керзанам)

Ізноў хаваюць Нобэля. На маёй памяці яшчэ засталіся камэнтары «Правды» на ўзнагароджаньне Бродзкага Нобэлеўскай прэміяй па літаратуры — з патугамі давесьці, што вынаходніку дынаміту (Нобэлю) надышоў час адправіцца на звалку.

Лёгіка органа КПСС была простай: выбар швэдзкай Акадэміі —абібок Бродзкі — як ніхто іншы абсалютна не адпавядае стандартам літаратурнага генія. Гэта адназначна сьведчыць пра крызыс нобэлеўшчыны. Таму Нобэль — мярцьвяк. Няхай жыве Ленінская прэмія!

Сёлета ў нас новыя пахаваньні. У ролі плакальшчыкаў —правыя публіцісты, якія ня могуць дараваць Нобэлеўскаму камітэту ўзнагароджаньне левага італьянскага драматурга Дар'ё Фо. Вось і «НН» надрукавала ў мінулым нумары пад красамоўнай шапкай «Нобэлеўская прэмія памерла» спачуваньне ўсім, хто ведаў нябожчыка. Экспэрт па ўскрыцьці трупа Нобэля Сяргей Шупа ўпэўнены, што съмерць наступіла ад таго, што «насуперак усякаму глузду й здаровому сэнсу акадэмікі аддаюць прэмію малавядомаму італьянскаму клоўну» (не схацеўшы нават узгадаць ягонае прозьвішча).

Я ня стаўлю перад сабою задачу рэабілітаваць у рамках гэтага артыкула літаратурныя вартасьці п'есаў Дар'ё Фо. Няхай гэтым займаецца Алег Чывадзэ на старонках «Товарища». Але мне незразумелы нэгатыўны акцэнт тэрміну «малавядомы клоўн». Відаць, Чарлі Чаплін і Вудзі Ален —шырокамаштабныя клоўны, і таму зь іх іншы попыт.

Я магу ўпэўніць шаноўнага сп. Шупу, што нябожчык жывы. У яго нармальны пульс і ён цікавіцца жанчынамі. Толькі што ён засьцёб усіх літаратуразнаўцаў сьвету, якія заўсёды бачылі ў ім апошні прытулак «здаровага сэнсу і лёгікі». Ён чытае за ранішняй кавай апошнія нумары самых рэспэктабэльных сусьветных газэтаў, якія не на жарт заклапочаныя ягоным палітычным хуліганствам і атрымліваe ад гэтага сапраўднае постмадэрновае задавальненьне.

Уявіце сабе зараз паседжаньні швэдзкай Акадэміі апошніх гадоў.

Старшыня: Вось, як бы, давайце абярэм ляўрэата па літаратуры.

Акадэмік А (ціха): Можа гэты, Клаўс Хуга.

Акадэмік В: Які яшчэ Хуга?! Той, што зрабіў дзьве стылістычныя памылкі ў апошнім рамане? Вы ўяўляеце, што скажуць філёлягі!

Акадэмік С (яшчэ цішэй): А можа, літоўка Бэлша Візмавіца?

Акадэмік D: Вар'ят! Усе літаратуразнаўцы фінскай затокі чытаюць латышку Візму Бэлшавіцу.

Акадэмік Е: А што тады рабіць?..

Акадэмік F: Давайце гэтага, Івана Каровіна. Ён дысыдэнт, а супраць дэмакратыі ніхто не папрэ.

Старшыня: А ён часам ня гомік і ня нэгар?

Акадэмік G: Ды не, здаецца.

Старшыня: Ну тады галасуем. За. Супраць. Адзінагалосна.

Такога кшталту вакханалія нармальнасьці зрабіла б з Нобэлеўскага камітэту нейкі гіпадром, дзе на пісьменьнікаў ставілі як на рысакоў. Васіль Быкаў, згодна букмэкерскай канторы «Шупа і К°», таксама, дарэчы, удзельнічаў у апошнім забегу.

Позна ці рана, гэта было павінна абрыдзець любому, нават самаму нармальнаму. Калі б акадэмікаў прарвала гадоў зь пяць таму, яны, як піць даць, аддалі б усе грошы Нобэля аятоле Хамэйні за тое, што ён не дае спакойна спаць іншым нобэлеўскім ляўрэатам. Але цяпер на дварэ 1997 год і швэдзкіх акадэмікаў фатальна прарвала на левых.

Я кажу фатальна, бо швэдзкія акадэмікі, абраўшы Дар'ё Фо ляўрэатам літаратурнай прэміі, зрабілі вялікі ўнёсак у рэнэсанс левых рухаў. Уявіце: сёньня сымбалямі левага руху зьяўляецца паўстанцкі правадыр мэксыканскіх індзейцаў субкамандантэ Маркас і італьянскі камэдыянт Дар'ё Фо. Левыя канчаткова вярнулі сабе імідж гуманістычных авантурыстаў, ненармальных дадаістаў, інтэлектуальных шызікаў-рамантыкаў, непапраўных антырацыяналістаў.

Прыемны падарунак напярэдадні 80-ай гадавіны Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Што да Нобэля, то ён папросту ўзнагародзіў прэміяй самаго сябе.

Лёлік Ушкін

і яшчэ цэлы сьпіс разьюшаных падпісчыкаў «НН»

СТО ТВОРАЎ МАСТАЦТВА XX СТАГОДЗЬДЗЯ

Помнік Леніну. архітэктар Г.Лянгбард, скульптар М.Манізер, 1933 г., бронза, лябрадор, 7 м.

Помнік Леніну ў Менску Мацьвей Манізер

Яшчэ не пасьпеўшы апанаваць усю былую імпэрыю, у разгары грамадзянскае вайны, бальшавікі выдалі адзін са сваіх галоўных дэкрэтаў — пра зьнішчэньне помнікаў. 11 красавіка 1918 году Ленін падпісаў дэкрэт «Аб зьнішчэньні помнікаў, пабудаваных у гонар цароў і іхных служкаў, якія ня маюць мастацкай вартасьці, і распрацоўцы праектаў помнікаў Расейскае сацыялістычнае рэвалюцыі». Гэты красамоўны дакумэнт заклаў падваліны ўсёй чырвонай культурнай рэвалюцыі...

... На падставе бальшавіцкага дэкрэту ўсе помнікі часоў Расейскае імпэрыі ў Беларусі, за выключэньнем некалькіх вайсковых мэмарыялаў, былі зьнішчаныя на працягу двух гадоў. Хто мог быць экспэртам «мастацкай вартасьці» ў часе вайны? Выконваўся дух дэкрэту, а не ягоная фарысэйская літара. У адначасьсе, адпаведна з плянам манумэнтальнае прапаганды, у 1919 годзе быў распрацаваны плян узьвядзеньня новых помнікаў у гарадах эфэмэрнае Літоўска-Беларускае Рэспублікі. Ужо тут было прадугледжанае будаўніцтва помніка «самаму чалавечнаму чалавеку». Ліхаманкава па ўсёй Беларусі ставіліся помнікі змагарам за Савецкую ўладу. Гэтыя «агіткі» былі бутафорскія, з дрэва, гіпсу, альбо цэмэнту. Ленін сам вызначыў патрабаваньні да помнікаў свайму рэжыму: «Аб вечнасьці або працягласьці я пакуль што ня думаю. Важна, каб помнікі былі даступнымі для масаў, каб яны кідаліся ў вочы». Каб кідаліся...

... У 1917 г. у гарадзкім сквэры на Губэрнатарскім пляцы Менску быў зьнесены помнік Аляксандру II. Зараз жа на ягоным месцы быў пастаўлены кубістычны помнік рэвалюцыйнаму салдату Краснапольскаму. А ў 1919-м — помнік чырвонаармейцам. Абодва паводле праектаў скульптара-наватара Цэханоўскага. Польскія жаўнеры, калі занялі Менск, нядоўга валтузіліся з гэтымі манумэнтамі. Яны паразьбівалі іх прыкладамі стрэльбаў. Вайна з помнікамі і вайна помнікаў — асобная старонка ў гісторыі Беларусі. Часам можа падацца, што дзеля гэтых сьведчаньняў свае веры і вялася вайна паміж людзьмі...

Радзімаю першай скульптуры Леніна ў Беларусі стала Краснапольле. Сюды, да бацькоў, зь Пецярбургу прыехаў Аляксандар Грубэ, які стаў адным з заснавальнікаў новае школы беларускае скульптуры. У Краснапольлі, у 1922 годзе ён стварыў кампазыцыю «Ленін на трыбуне», створаную, бадай, на падставе асабістых уражаньняў. Гэткім чынам была запачаткаваная традыцыя «ленініяны» ў Беларусі. Менавіта ад Грубэ пайшоў вобраз «правадыра» на трыбуне, у гратэскавай дынаміцы, натуралістычны, але пазбаўлены эмоцыяў. У 1925 годзе Грубэ перавез сваю гліняную скульптуру ў Менск. У Менску зьявіўся свой Ленін. У тым жа годзе Грубэ было даручана выканаць вялікую статую Леніна перад менскім Камуністычным унівэрсытэтам.

У Беларусі былі спробы асэнсаваць вобраз Леніна і па-іншаму. У 1924 годзе скульптары Віцебскага мастацкага тэхнікуму стварылі помнік Леніну, які плянавалася паставіць на плошчы Свабоды ў Віцебску. Манумэнт ствараўся і пры дапамозе архітэктонаў: квадрата, кола, зоркі, усечанай піраміды з глёбусам. Гэтая архтэктурная сюіта павінна была ўлучаць таксама і рэльефы з маскаронамі мысьляроў, тэарэтыкамі камунізму... Віцебск на тое і Віцебск... На жаль, гэты манумэнт, які бачыўся аўтарам, як помнік той эпосе, ня быў зрэалізаваны. Стварэньне ленініяны пайшло сваім шляхам — шляхам кананізацыі стэрэатыпных натуралістычных шаблёнаў.

У 1929 годзе быў праведзены ўсесаюзны конкурс на праект Дому ўраду ў Менску. Упершыню бальшавікі паставілі задачу стварэньня новага, сацыялістычнага тыпу ўрадавай установы. Па сутнасьці, Менск стаў калыскаю савецкае архітэктуры. У конкурсе ўзялі ўдзел дзясяткі вядучых архітэктараў. Але перамог Лянгбард. Паводле ягонае далёкасяжнае задумы, Дом ураду ў Менску мусіў раскрывацца на найбуйнейшую ў Эўропе плошчу (па вайне гэтак і сталася). У 1930-м прыступілі да будаўніцтва. Ужо тады гэта быў найбуйнейшы ў Беларусі архітэктурны комплекс. Цэнтральны аб'ём дзевяціпавярховага гмаху паглыблены ад пляца на 50 мэтраў і флянкаваны бакавымі карпусамі, якія хвалістым імпэтным рытмам зьніжаюцца да пяці паверхаў. Паміж бакавымі карпусамі ўтвараецца двор —курданёр шырынёю 100 мэтраў. Першапачаткова Лянгбард плянаваў замкнуць яго галерэяй і, як чысты канструктывіст, паставіць пасярэдзіне сьціплую абстрактную стэлу. Але ў 1931 годзе, з ініцыятывы ўраду БССР быў праведзены яшчэ адзін усесаюзны конкурс, на гэты раз на помнік Леніну. Перамог... Лянгбард са сваім сябрам, скульптарам Манізерам.

Архітэктар Лянгбард, родам з усходняе Польшчы, які абагаўляў нямецкага дойліда Пітэра Бэрэнса, будаваў ня проста Дом ураду, і нават ня проста новыя дамы, а новыя вымярэньні новае эпохі. Як канструктывіст, ён ня мысьліў катэгорыямі фігуратыўнага мастацтва. Папросту скульптар Манізер быў яму добрым сябруком. І таму замест гранёнае стэлы паўстаў іншы архітэктурна-кампазыцыйны элемэнт — сямімэтровы манумэнт, які арганічна ўвайшоў у структуру ансамбля Дому ўраду. Каб ня Ленін, дык што-небудзь там мусіла стаяць, дзеля стварэньня большага эфэкту пэрспэктывы, для нагляднасьці кампазыцыйнага ядра.

Што да творчасьці Манізера, то гэтаму вялікаму скульптару было наканавана стаць увасабленьнем духу сацыялістычнага рэалізму. Калі яму было даручана паставіць помнік Леніну ў Менску, самы вялікі ў СССР, ён адчуў, што гэта — ягонае... Пакуль справа дайшла да ўсталяваньня калоса перад Домам ураду, Манізер уступіў у кампартыю. Адзін з найлепшых твораў сацрэалізму (можа таму, што адзін з найпершых) нес у сабе ўсе рысы клясычнага рэалізму старое Пецярбурскае акадэміі. Бяз штучнага патасу высакародства постаці, якая ўзіраецца ў калёны шчасьлівых рабоў — вось што імпанавала эпосе, якая надыходзіла ў 30-я гады. Філігранное выкананьне барэльефных гарэльефаў: «Кастрычніцкая рэвалюцыя», «Абарона Радзімы», «Індустрыялізацыя краіны», «Калектывізацыя сельскае гаспадаркі», несла ў сабе ўжо амаль рэлігійны зьмест. Як у старажытных саборах, паднятыя на недасяжную вышыню творы жывапісу, альбо пластыкі, гэтыя гарэльефы прызначаліся не для разгляду чалавечкам зьнізу. Яны прызначаліся для Яго, бронзавага стодзіва, якое, можа і праўда, «жывейшае за ўсіх жывых». Разгледзець пластыку на чорным лябрадоравым пастамэнце маглі таксама і жрацы культу, калі падымаліся да іх па трыбунах, падчас «сьвяшчэнных» датаў... Рупліва выкананыя майстрам старое школы, гэтыя рэльефы — прыклад дасканалага веданьня клясычнае кампазыцыі, анатоміі й пэрспэктывы. Ніякіх адступленьняў ад канону — даступная для разуменьня жрацоў стылістыка.

Адпрацаваўшы ў Менску, сябры Манізер зь Лянгбардам, паехалі далей, ставілі помнікі Чапаеву, Шаўчэнку, Касмадзям'янскай і шмат Ленінаў на неабсяжных прасторах шостае часткі сьвету.

Падчас ужо нямецкае акупацыі бронзавую статую і рэльефы пусьцілі на пераплаўку (цікава, колькі выйшла патронаў?). Але першае, што зрабілі сапраўдныя камуністы ў 1945 годзе —тэрмінова аднавілі манумэнт Леніну. Безь яго ім было няўтульна. Скульптуру і гарэльефы былі адлітыя па мадэлях, якія зьберагаліся ў майстэрні Манізера ў Маскве (якая абачлівасьць!). Бронзавая навюткая постаць спакойна ўзіралася на паруйнаваны, спалены Менск...

Калісьці на заліках па гісторыі ў менскіх ВНУ было такое пытаньне «на засыпку»: якая рука ў Леніна перад Домам ураду паднятая? І пакаленьне за пакаленьнем студэнтаў «завальвалася» на гэтым пытаньні. Сьведама ці не, настаўнікі ставілі сур'ёзны экспэрымэнт, назіраючы з году ў год растучую несур'ёзнасьць стаўленьня да гэтага пытаньня маладое генэрацыі. Бо помнік, нават калі да яго кладуць кветкі вясельныя картэжы, жыве роўна столькі, колькі захоўвае сілу магія ягонага культу. А мастацтва — гэта толькі спосаб спасьціжэньня сьвету, напрыклад, законаў кампазыцыі й пэрспэктывы.

Лёс гэтага помніка гады тры таму быў перадвырашаны, калі Беларусь паволі пачала была разьвітвацца з чужымі культамі й мітамі. Было прапанавана вярнуцца да першапачатковае задумы Лянгбарда: замкнуць курданёр галерэяй, а замест Леніна паставіць стэлу... Але не пасьпелі. Таму да сёньня ў Менску стаіць найстарэйшы ў сьвеце помнік «правадыру сусьветнага пралетарыяту». Як сотні маленькіх і вялікіх Ленінаў па ўсёй Беларусі.

Сяргей Харэўскі

Мацьвей Манізер (1891, Пецярбург – 1978, Масква) скульптар, пэдагог. Скончыў у 1914 г. матэматычны факультэт Пецярбурскага ўнівэрсытэту. У 1916 — Акадэмію мастацтваў. Ляўрэат Сталінскае прэміі. З 1947 — віцэ-прэзыдэнт АМ СССР. Аўтар 10 помнікаў Леніну і 5 — Сталіну. Заслужаны дзяяч мастацтваў БССР і УССР.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Сяргею З. зь Менску. Ня толькі вершы, але й іншыя творы, якія Вы хочаце прапанаваць рэдакцыі, перасылайце на наш адрас – на абанэнцкую скрынку.

М. з Гомеля. Тэкст завялікі і бязадрасны.
Я.Ш. з Глыбокага. Яна нам піша.
Л.С. зь Ліды. Ня варта абмяжоўваць свой сьвет тэлевізіяй і газэтамі, якія выклікаюць абурэньне.

"Наша Ніва" незалежная газэта

НАША НІВА

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

заснавальнік ..... Павал Жук
рэдактар ..... Сяргей Дубавец
выдавец ..... БГФ "Наша Ніва"
адказны сакратар ..... Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар ..... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ..... Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
дызайн і вёрстка ..... Лявон Раманчык
набор ..... Аляксандра Макавік
стыль і карэктура ..... Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле ..... Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі ..... Зьміцер Бартосік

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 213-43-52
E-mail: edit@niva.minsk.by

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая.

Наклад 2630. 8 палос фармат А2 нумар падпісаны ў друк 12:53, 02/11/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 6434. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты "Известия", д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12